Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
№ 13 (28629)
19 студзеня 2018 г.
ПЯТНІЦА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
+TV праграма



**Музейны пакой ратавальнікаў**
СТАР. 4



**Нас паглынае ўпакоўка...**
МС



**Валерыя Арланава — пра жыццё і прафесію**
СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі:**

*«У 2018 годзе будзе зламана тэндэнцыя мінулых гадоў, калі колькасць занятых у эканоміцы скарачалася. Паводле прагнозаў урада, яна павялічыцца, а ў дзяржсектары працягнецца працэс стварэння новых працоўных месцаў. І ў выніку такіх мер па стымуляванні дзелавой актыўнасці будзе ажыўленне ў іншых сектарах. Сёння ў нас у краіне можна працаваць па найме, можна займацца бізнесам, а можна проста працаваць на сябе, не з'яўляючыся прадпрымальнікам, быць самазанятым. Дарэчы, Міністэрства па падатках і зборах за два месяцы дзеяння ўказа па самазанятых грамадзянах канстатуе: іх колькасць значна вырасла. Гэта адбываецца ў тым ліку дзякуючы рэалізацыі пакета мер па паляпшэнні дзелавога клімату».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.01.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9933 | ▼ |
| Еўра | 2,4311 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0351 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0692 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Іардань на Вячы



Святар праваслаўнага храма Святога Ілы Прарока ў вёсцы Касынь Мінскага раёна іерэй Аляксей НАСЛЕДНІКАЎ не першы год прыязджае на вадасховішча Вяча, каб здзейсніць Вялікае асвячэнне вады ў гонар Святога Богаяўлення. Святары гавораць, што акунацца ў палонку на Вадохрышча зусім неабавязкова, але штогод асвячаюць такія месцы, дзе ў свята збіраюцца сотні людзей. Учора, напярэдадні вадохрышчанскага вечара, перад падрыхтаванай загадзя крыжападобнай палонкай айцец Аляксей апускаў крыж у сцюдзёную ваду і разам з матушкай Марынай чытаў малітву. А ўсё для таго, каб людзям, якія па-сапраўднаму вераць у цуд асвечанай вады, ствараць іардански — святочны — настрой.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Спецыяльны рэпартаж

## «Без Бога выправіцца немагчыма»

### Як жанчыны пасля калоній і выцвярэзнікаў знаходзяць прытулак на манастырскім падворку

**Света не ўяўляла сваё жыццё без алкаголю: залівала ў сябе гарэлку, не запіваючы і не закусваючы. А Вераніка ледзь не засталася на вуліцы: бацькі адмовіліся прымаць дачку, якая падсела на наркотыкі. На гэтым іх гісторыі маглі б і скончыцца, калі б не падворак пры Свята-Елісавецінскім манастыры. Тут знаходзяць прытулак жанчыны, якія апынуліся ў складаных сітуацыях. Манастыр забяспечвае іх жыллём, ежай і работай. Дае другі, трэці, чацвёрты шанц. Вераць у Бога тут пачынаюць, бадай, усе. Бо звярнуцца па дапамогу больш няма да каго.**

СТАР. 5



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**На агульнай малітве.**

■ Ведай нашых!

## РЫЗЫКА АПРАЎДАНА

### Экіпаж «МАЗ-СПОРТаўта» ўпершыню выйграў этап марафону «Дакар»

**Каманда Сяргея Вязовіча фінішавала з вынікам 5 гадзін 14 хвілін 10 секундаў. Другім да фінішу прыйшоў аргенцінскі экіпаж Федэрыка Вілагры на Iveco з вынікам 5 гадзін 15 хвілін 34 секунды. Ён жа выйшаў на першае месца ў агульным заліку грузавікоў. Трэцім стаў экіпаж Дзмітрыя Сотнікава (Расія) з каманды «КАМАЗ-Майстар».**



— На фінішы першага хуткаснага ўчастка даведаліся, што апярэджваем фаварытаў заезду на тры хвіліны, вырашылі дадаць у тэмпе і апошнія 20 км ехалі на ўсю моц. Рызыка стала апраўданая: беларусы ўпершыню ў сваёй гісторыі перамаглі на этапе гэтай гонкі, — расказаў Сяргей Вязовіч.

Беларускі экіпаж Вязовіча займае пасля 11 этапаў трэцяе месца ў агульным заліку ралі-рэйду.

Экіпаж Аляксандра Васілеўскага заняў 17-е месца на 11-м этапе — 9 гадзін 56 хвілін, каманда Аляксея Вішнеўскага завяршыла заезд на 18-м радку, выдаткаваўшы на спецучастку больш за 10 гадзін. Падчас гонкі беларусам давялося ліквідаваць праблемы з кампрэсарам і мяняць два колы.

Спецучастак наступнага 12-га этапу таксама абяцае быць няпростым. Яго працягласць складзе 523 км. Гоншчыкаў чакаюць камяністыя адрэзкі, на якіх лёгка пашкодзіць аўтамабіль. Пры гэтым лімітавая засяроджанасць спатрэбіцца не толькі ад пілотаў, але і ад штурманаў.

Нагадаем: беларускія гоншчыкі ўдзельнічаюць у ралі-рэйдзе «Дакар» сёмы раз.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Афіцыйна

# Грамадскае ядро краіны

**Сёння сваю работу пачаў III З'езд рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь». Яго дэлегатам і ўдзельнікам прывітанне накіраваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.**

«З усіх рэгіёнаў краіны ваш прадстаўнічы форум сабраў шчырых патрыётаў, людзей актыўнай жыццёвай пазіцыі, якіх аб'ядноўвае імкненне быць карыснымі грамадству і дзяржаве, — адзначыў Прэзідэнт. — Створаная па народнай ініцыятыве, «Белая Русь» стала па-сапраўднаму масавым рухам, адным са слупоў грамадзянскай супольнасці, ядром здаровых і канструктыўных сіл нашай краіны. Ваша цеснае ўзаемадзеянне з органамі ўлады і работа з рознымі слаямі насельніцтва дапамагаюць забяспечваць паспяховае правядзенне сацыяльна-эканамічнай палітыкі дзяржавы».

Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананасць, што і надалей аўтарытэт, роля гэтага аб'яднання няўхільна будуць узрастаць. Кіраўнік дзяржавы пажадаў дэлегатам і ўдзельнікам з'езда плённай працы і далейшых поспехаў на карысць роднай Беларусі.

# Такая прафесія — людзей ратаваць

**Сёння беларускія ратавальнікі адзначаюць сваё прафесійнае свята. Работнікаў і ветэранаў органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.**

«Ваша служба — справа моцных і мужных людзей, адданых сваёй справе, якія валодаюць высокай кваліфікацыяй і багатым вопытам, — адзначыў кіраўнік дзяржавы ў віншаванні. — Кожны ратавальнік з гонарам выконвае свой службовы абавязак і ў любую хвіліну гатовы прыйсці на дапамогу людзям, якія трапілі ў бяду, часам рызыкуючы ўласным жыццём».

Аляксандр Лукашэнка выказаў асаблівую ўдзячнасць усім ветэранам МНС, многія з якіх і сёння перадаюць свой бясцэнны вопыт маладым работнікам. Прэзідэнт упэўнены, што супрацоўнікі органаў па надзвычайных сітуацыях і надалей будуць сумленна служыць Айчыне, умацоўваючы яе бяспеку.

# Дыпламатычная аптымізацыя

## Прэзідэнт прыняў кіраўніка МЗС

**Цэнтральны апарат Міністэрства замежных спраў скарацілі прыкладна на трэць, замежныя ўстановы — на 15 %. Таксама Беларусь плануе закрыць генконсульствы ў Адэсе, Гданьску і Мілане. Пры гэтым больш увагі цяпер будуць надаваць рабоце ў тых краінах, якія прыносяць найбольшую аддачу. Учора тэмы аптымізацыі ў МЗС і развіцця знешнеэканамічнай дзейнасці, у тым ліку адносін з Еўрапейскім саюзам, абмяркоўваліся падчас сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з кіраўніком ведамства Уладзімірам Макеем.**

— Я думаю, што вы хацелі абмеркаваць са мной пытанні аптымізацыі МЗС, калі там ёсць нейкія недамоўленасці, нестыкоўкі, няўзгодненасці. Я гатовы да таго, каб мы канчаткова маглі прыняць рашэнні, калі ёсць пытанні, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Больш за ўсё мяне цікавяць праблемы знешнеэканамічнай дзейнасці. Я знаёмы з вынікамі, але мяркую, у вас ёсць больш дакладная інфармацыя.

Прэзідэнт таксама пацікавіўся перспектывамі ў плане дыверсіфікацыі знешняга гандлю і дзейнасці нашых пасольстваў.

Уладзімір Макей, у сваю чаргу, адзначыў, што ў развіцці знешнеэканамічнай дзейнасці па выніках 2017 годаназіраюцца станоўчыя тэндэнцыі.

— Адбыўся рост экспарту на 23%. Прычым на дзве трэці так склалася за кошт росту цэн, але на адну трэць — за кошт фізічнага росту экспарту. Таму ў цэлым гэта можна лічыць станоўчай тэндэнцыяй, — адзначыў міністр.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

## ДЫЯЛОГ З УЛАДАЙ

**Як паказвае вопыт, суботнія тэлефонныя лініі дапамагаюць аператыўна вырашыць праблемныя сітуацыі, якія ўзнікаюць у людзей. Упершыню такі дыялог адбыўся каля двух гадоў таму. За гэты час значна павысілася эфектыўнасць работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб.**

Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 20 студзеня ў Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах з 9.00 да 12.00, у гэтую суботу іх правядуць:

кіраўнік спраў БРЭСЦКАГА аблвыканкама Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ. Тэл. 8-016 221 31 21;

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8-021 222 22 22;

кіраўнік спраў ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8-023 233 12 37;

старшыня ГРОДЗЕНСКАГА абласнога савета дэпутатаў Ігар Георгіевіч ЖУК. Тэл. 8-015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Андрэй Міхайлавіч КУНЦЭВІЧ. Тэл. 8-022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8-017 500 41 60;

старшыня МІНСКАГА гарвыканкама Андрэй Віктаравіч ШОРАЦ. Тэл. 8-017 222 44 44.

# Навука — сярод кветак

## «Фестываль навукі — 2018» пройдзе ў Мінску ў верасні

**Маладзёжная ініцыятыва была падтрымана на Агульным сходзе Савета маладых вучоных НАН Беларусі. Плануецца, што «Фестываль навукі», у якім прымуць удзел школьнікі, студэнты, навуковыя супрацоўнікі, мінчане і госці сталіцы, пройдзе на базе Цэнтральнага батанічнага саду ў рамках святкавання Дня горада. На тэрыторыі саду разгорнуцца спецыяльныя зоны, дзе можна будзе праслухаць папулярныя лекцыі аб развіцці беларускай навукі, пазнаёміцца з апошнімі распрацоўкамі беларускіх вучоных, экспанатамі музея навукі, акунуцца ў атмасферу навуковых лабараторый.**

— Мы ўскладаем на моладзь вялікія надзеі, таму падтрымка маладых вучоных — прыярытэт у дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук, — падкрэсліў у сваім выступленні на пасяджэнні Агульнага сходу Савета маладых вучоных **старшыня Прэзідыума НАН Беларусі, акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ**. — Сёння мы гатовыя разглядаць усе маладзёжныя ідэі, ініцыятывы і прапановы.

Кіраўніцтва Акадэміі навук прапанавала моладзі актыўна ўключыцца ў рэалізацыю самых значных праектаў НАН Беларусі па прыярытэтных кірунках развіцця навукі, сярод якіх умацаванне асноў беларускай дзяржаўнасці, фарміраванне IT-краіны, распрацоўка айчыннага электрамабіля і назапашвальніка электраэнергіі, стварэнне новых кампазіцыйных матэрыялаў, нана- і біятэхналогіі, інавацыйныя тэхналогіі ў АПК, беспілотныя лятальныя апараты, новыя энергасістэмы ды іншыя.

Сёння ў арганізацыях НАН Беларусі працуюць больш за 2 тысячы 200 маладых навукоўцаў. Штогод шэрагі супрацоўнікаў Акадэміі навук папаўняюць 300—350 маладых даследчыкаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Знешняя палітыка

# У ГАНКОНГ — БЕЗ ВІЗ

**13 лютага ўступае ў сілу пагадненне паміж урадамі Беларусі і Ганконга, спецыяльнага адміністрацыйнага раёна Кітая, аб адмене візавых патрабаванняў. Пра гэта на брыфінгу паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі і лічбавай дыпламатыі — прэс-сакратар МЗС Дзмітрый МІРОНЧЫК. У адпаведнасці з дакументам беларусы і сталыя жыхары Ганконга атрымаюць правы свабодна ўязджаць, выязджаць і праязджаць транзітам на працягу не больш за 14 дзён.**

Акрамя гэтага, прэс-сакратар расказаў пра іншыя міжнародныя навіны. Так, на пачатку наступнага тыдня Беларусь наведае спецыяльны прадстаўнік Парламенцкай асамблеі АБСЕ па Усходняй Еўропе Кент Харстэд. Гэта яго першы візіт у нашу краіну на новай пасадзе. Падчас сустрэч, што маюць адбыцца, акцэнт будзе зроблены на абмеркаванні рэкамендацыі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ па пытаннях удасканалення выбарчага працэсу ў Беларусі. Запланаваны шэраг сустрэч, у тым ліку з міністрам замежных спраў Беларусі Уладзімірам Макеем, са старшынёй Цэнтрвыбаркама Лідзіяй Ярмошынай, кіраўніцтвам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Акрамя таго, у праграме візіту прадугледжана наведванне БелГПП, Парк высокіх тэхналогій і Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень».

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## БЕЛЫ ДОМ НАЗВАЎ КОШТ СЦЯНЫ НА МЯЖЫ З МЕКСІКАЙ

**Кіраўнік апарату Белага дома Джон Келі ў інтэрв'ю тэлеканалу Fox News заявіў, што будаўніцтва сцяны на мяжы з Мексікай абыдзецца прыкладна ў $20 млрд.**



Ён адзначыў, што прэзідэнт ЗША Дональд Трамп не адмаўляецца ад ідэі пабудовы сцяны і атрымання на гэта сродкаў ад Мексікі. Аднак, па словах Келі, грошы на сцяну могуць быць атрыманы не наўпрост ад мексіканскага ўрада. Зараз Трамп разглядае варыянт атрымання грошай праз NATA (пагадненне аб свабодным гандлі паміж ЗША, Канадай і Мексікай) або аплату віз.

## ТУРЦЫЯ ПРЫВЯЛА АРМІЮ Ў СТАН ПАВЫШАНАЙ БОЕГАТОЎНАСЦІ

**Генштаб Турцыі распарадзіўся прывесці войскі на мяжы з Сірыяй у стан павышанай баявой гатоўнасці, перадае Anadolu.**

Паведамляецца, што на мяжу з Сірыяй прыбыла бронетэхніка. Раней прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган заявіў, што турэцкая армія можа на працягу тыдня пачаць аперацыю на тэрыторыі сірыйскіх курдаў у рэгіёнах Манбідж і Афрын.

## 52 ЧАЛАВЕКІ ЗГАРЭЛІ Ў АЎТОБУСЕ Ў КАЗАХСТАНЕ

**52 чалавекі загінулі ў выніку ўзгарання аўтобуса ў Акцюбінскай вобласці на захадзе Казахстана, паведамляе Reuters са спасылкай на прадстаўніка Камітэта па надзвычайных сітуацыях МУС Руслана Іманкулава.**

Аўтобус загарэўся ў Іргізскім раёне на трасе Самара — Шымкент каля вёскі Калыбай. «У салоне знаходзіліся 55 пасажыраў і 2 вадзіцелі», — паведаміў Іманкулаў. Паводле яго слоў, пяцярым, у тым ліку двум вадзіцелям, удалося выбрацца з аўтобуса, ім аказана дапамога. «Папярэдне ўсе, хто загінуў, — грамадзяне Узбекістана. Вадзіцелі — грамадзяне Казахстана», — сказаў Іманкулаў. Паводле інфармацыі казахскіх выданняў, «Ікарус» накіроўваўся з Узбекістана ў Расію. Згодна з папярэдняй версіяй, у аўтобусе замкнула праводку, пасля чаго машына загарэлася.

## ПУЧДЭМОН ЗНОЎ УЗНАЧАЛІЦЬ УРАД КАТАЛОНІІ?



**Прыхільнікі незалежнасці Каталоніі атрымалі першую перамогу ў рэгіянальным парламенце — на пасаду спікера абраны прадстаўнік сепаратыстаў, кандыдат ад партыі «Левыя рэспубліканцы Каталоніі» Ражэ Торэ.**

У найбліжэйшыя дзесяць рабочых дзён дэпутаты правядуць кансультацыі па магчымай кандыдатуры старшыні Жэнералітата (мясцовага ўрада). Першыя дэбаты па гэтым пытанні павінны адбыцца да канца студзеня. «Пучдэмон (Карлес Пучдэмон — колішні прэзідэнт Жэнералітата. — **«Зв.»**) можа быць зноў абраны на пасаду кіраўніка аўтаноміі, але для гэтага яму неабходна асабіста прысутнічаць у парламенце», — заўважыў Euronews прафесар канстытуцыйнага права (Універсітэт Барселоны) Эдуард Ройг.

БПС-СБЕРБАНК

**Уважаемые Владельцы (физические лица) текущих (расчетных) счетов, в том числе с использованием банковской платежной карточки, благотворительных счетов (далее – Счет), открытых в ОАО «БПС-Сбербанк» (далее – Банк), по которым отсутствуют операции в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету (далее – неактивные счета)!**

Сообщаем Вам, что в соответствии со ст. 206 Банковского кодекса Республики Беларусь банк вправе прекратить обязательства по договору об открытии Счета при соблюдении и наступлении условий, предусмотренных указанной статьей, а также договором об открытии Счета.

Настоящим уведомляем Вас об отсутствии по Вашему Счету операций в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету, а также предупреждаем о прекращении обязательств Банка по соответствующим договорам по истечении шести месяцев, начиная с даты настоящего уведомления. Обязательства по договорам текущих (расчетных) счетов с использованием банковской платежной карточки будут прекращены Банком по истечении шести месяцев со дня прекращения срока действия соответствующей банковской платежной карточки.

Если в течение 6 месяцев, начиная с даты настоящего уведомления, Вы не возобновите движение денежных средств по неактивному счету, Банк прекратит обязательства по соответствующему договору и закроет его, перечислив неиспользованный остаток денежных средств на отдельный счет без начисления процентов, и по истечении срока, установленного законодательством Республики Беларусь, зачислит его в доход Банка.

При этом Банк обязуется возвратить по требованию Владельца неактивного счета остаток денежных средств, находившихся на данном счете на момент его закрытия.

Операции по неактивному счету можно совершить в любом подразделении Банка.

**Информацию о режиме работы подразделений можно получить по телефону:**
**148 – в стационарной сети;**
**5-148-148 – в мобильных сетях;**
**(+375 29/44) 5-148-148 – для международных звонков.**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673
ОАО «БПС-Сбербанк»

■ Датычыцца кожнага

# ПАЧНІ З МАЛОГА — ПАЧНІ З СЯБЕ

### Мінпрыроды заклікае ўсіх далучыцца да кампаніі па навядзенні парадку на зямлі

**У 2017 годзе ўсе органы дзяржаўнай улады выканалі свае абавязацельствы па пытаннях навядзення парадку на зямлі. Аднак падставы для самазаспакаення няма, а ёсць сур'ёзныя дэталёвыя планы, як зрабіць нашу зямлю яшчэ больш прыгожай. Менавіта пра гэта казаў падчас сустрэчы з журналістамі намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр КОРБУТ.**

Падводзячы вынікі мінулага года, намеснік міністра адзначыў, што быў выкананы значны аб'ём работы па навядзенні парадку на зямлі і добраўпарадкаванні тэрыторый населеных пунктаў: уладкаваны 1324 прыдамавыя тэрыторыі, уключаючы спартыўныя і дзіцячыя гульнявыя пляцоўкі. Адрамантавана 1978,8 тыс. кв. м вулічна-дарожнай сеткі, уладкавана 393,9 га газонаў.

У сельскай мясцовасці, як правіла, дагледжаныя домаўладанні, але і побач з імі нярэдка стаяць амаль што разбураныя фермы, якія псуюць агульнае добрае ўражанне. Летась установлены і адрамантаваны агароджы на 827 жывёлагадоўчых фермаў і комплексах, рэканструяваны 284 аб'екты захоўвання гною і брудных сцёкавых вод, заасфальтаваны тэрыторыі і пад'язныя шляхі да 104 жывёлагадоўчых фермаў і комплексаў. Таксама знесены 396 сельскагаспадарчых аб'ектаў, якія не эксплуатуюцца, рэкультывавана і ўключана ў гаспадарчы абарот 122 га зямель, якія вызваліліся ў выніку зносу гэтых аб'ектаў.

Аляксандр Корбут падкрэсліў, што ў адпаведнасці з палажэннямі Дэкрэта № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва», каб знесці аб'екты сельгаспрадпрыемстваў, якія не эксплуатуюцца, дастаткова дазволу органаў мясцовай улады, а будматэрыялы можна рэалізаваць насельніцтву, арганізацыям, выкарыстоўваць для гаспадарчых патрэб, у крайнім выпадку — пахаваць на месцы.

Мінпрыроды сумесна з органамі дзяржкіравання вядзе мэтанакіраваную работу па барацьбе з баршчэўнікам Сасноўскага. Каля трох тысяч га зямлі заражана гэтым небяспечным пустазеллем. Асабліва пакутуюць ад яго Віцебская і Мінская вобласці. Ужо распрацаваны план мерапрыемстваў па знішчэнні баршчэўніка на 2018 год, выдзелена фінансаванне. Па словах Аляксандра Корбута, расліна гэта вельмі жывучая, і простым скошваннем вывесці яе немагчыма. Найбольш эфектыўныя ў барацьбе з баршчэўнікам сучасныя экалагічна бяспечныя хімікаты. Але самае галоўнае, каб зямлі, вычышчаныя ад пустазелля, былі ўведзены ў сельгасабарот. Насенне баршчэўніка захоўваецца ў глебе 10 гадоў, і калі зямля пустуе, дык яно адразу і прарастае. Пад патранатам органаў мясцовай улады прыведзены ў парадак 7889 мемарыяльных комплексаў, месцаў баявой і воінскай славы і іншых памятных месцаў, 2331 могілка.

У мінулым годзе таксама былі добраўпарадкаваны тэрыторыі 904 садовых таварыстваў, уладкаваны і адрамантаваны 1736 існуючых месцаў і зон адпачынку на водных аб'ектах, 190 — на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях, створаны і ўладкаваны 15 новых месцаў і зон адпачынку на водных аб'ектах і 16 — на ААПТ. Наведзены парадак у лясах, уздоўж аўтамабільных дарог і чыгунак. Цяпер неабходна, каб дачнікі і людзі, якія адпачываюць на прыродзе, падтрымлівалі чысціню. І тут важна не толькі самім сабраць смецце і данесці яго да кантэйнера, але і дэманстраваць негатыўнае стаўленне да тых, хто на гарадской вуліцы, у лесе ці на беразе ракі паводзіць сябе па-варварску.

Аляксандр Корбут адзначыў, што за апошнія гады нашы гарады «сталі больш-менш зялёныя», таму адзін з кірункаў кампаніі па добраўпарадкаванні — азеляненне гарадоў. Ён заклікаў усіх далучыцца да кампаніі па зялёным добраўпарадкаванні.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.** *yanovskaya@zviazda.by*

■ Добрая справа

# ПРА КАТОЎ І ЛЮДЗЕЙ

**Як вядома, адны прадстаўнікі чалавецтва агітуюць і заклікаюць рабіць гэты свет лепшым, а другія здзяйсняюць нешта канкрэтнае ў азначаным кірунку. Вось адзін прадпрымальнік у Брэсцкім раёне, які валодае піларамай, рашыў дапамагчы бяздомным сабакам, якіх у прыгараднай вёсцы нямала. І стаў выдаваць дыхтоўныя будкі ў падарунак таму, хто забірае дадому чатырохногага сябра.**



А ў Кобрыне актывісты адной з арганізацый па абароне жывёл вырабілі і ўстанавілі ў горадзе каціныя дамы. Добрую справу назвалі праектам «Цёплыя домікі для бяздомных катоў». Невялікія будынкі зрабілі з еўравагонкі, кожная сцяна складаецца з двух драўляных слаёў, якія перагароджвае пенапласт. Падлогу заслалі саломай. Такім чынам памяшканне для вусатых кватарантаў атрымалася даволі цёплае.

Як успамінаюць валанцёры, спачатку было нямала скептыкаў на шляху да новай справы. Некаторыя казалі, што прыгожыя дамкі папсуюць, пакрадуць, а катоў адтуль павыганяюць. Але гараджане паставіліся з разуменнем да патрэб братоў нашых меншых. І наадварот, сталі прыносіць корм. Тым больш што іх аб гэтым ласкава папрасілі праз таблічкі, якія прымацавалі да кожнага з пяці домікаў.

На сваёй старонцы ў сетках валанцёры паведамілі, што наступнай зімой плануюць устанавіць яшчэ больш зімовых кватэр для катоў, а таксама размясцілі словы ўдзячнасці за разуменне і падтрымку старшыні Кобрынскага райвыканкама Аляксандру Зазулю і дырэктару ЖКГ Сяргею Яльцу.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Здарэнне

# КІРОЎЦА АДАБРАЎ У МІНАКА ТЭЛЕФОН

### За тое, што той здымаў яго п'яную язду

**У сталіцы да праваахоўнікаў звярнуўся мінчанін з заявай, што невядомы мужчына адкрыта з выкарыстаннем гвалту скраў у яго мабільны тэлефон iPhone 5S.**

Пацярпелы расказаў, што ў двары дома па вуліцы Слабодскай убачыў аўтамабіль Пежо, кіроўца якога паводзіў сябе неадэкватна — хаатычна рухаўся па праезнай частцы, заязджаў на бардзюры і тратуар. Мяркуючы, што ён знаходзіцца ў стане алкагольнага ап'янення, мінак стаў здымаць дзеянні кіроўцы на тэлефон, пры гэтым пераконваючы маладога чалавека заглушыць рухавік і пакінуць салон машыны. Аднак апошняму гэта не спадабалася, і ён накінуўся на грамадзяніна з кулакамі. Падчас барацьбы ў мужчыны з кішэні выпаў тэлефон. Кіроўца падхапіў яго і знік у невядомым напрамку, пакінуўшы незачыненым аўтамабіль.

Па гарачых слядах уладальнік машыны быў затрыманы. Ён расказаў, што ў той дзень прыехаў у госці да сяброўкі, аднак дзяўчына адмовілася сустракацца з ім. Расстроены малады чалавек купіў дзве двухлітровыя бутэлькі піва і выпіў іх у салоне аўто. Пасля чаго стаў ездзіць па вуліцы, пакуль у яго не ўзнік канфлікт з мужчынам, які здымаў яго на камеру.

Па інфармацыі Маскоўскага РУУС г. Мінска, затрыманы 1989 г.н., не працуе, раней прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за хуліганства, а ў 2016 годзе быў пазбаўлены вадзіцельскіх правоў. У крыві кіроўцы выяўлены 2,6 праміле алкаголю. Заведзена крымінальная справа за грабеж, мужчыну пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да чатырох гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Факт

# Замест пантона — па-ранейшаму катар

**У Жыткавіцкім раёне ратавальнікі на катары працягваюць перавозку людзей з аднаго берага на іншы.**

Як паведамілі ў МНС, на берагах ракі абсталяваны пункты абагрэву людзей: з боку Турава ратавальнікамі ўстаноўлена палатка, а на процілеглым беразе — металічны вагончык, а таксама адпаведныя паказальнікі размяшчэння пунктаў абагравання.

У перыяд часу з 8 гадзін 16 студзеня да 6 гадзін 17 студзеня работнікамі МНС на катары перавезена 776 чалавек, з іх 55 дзяцей, і 530 кілаграмаў грузу. Такое становішча захоўваецца да змянення сітуацыі. Адпаведнымі службамі ўстаноўлены інфармацыйныя знакі, арганізавана абсталяванне і ўстаноўка часовых пунктаў прыпынку для пасажырскага транспарту, для насельніцтва арганізаваны рух маршрутных аўтобусаў у абодвух напрамках. Насельніцтва найбліжэйшых раёнаў апавяшчаюць аб часовым спыненні работы пантоннай пераправы праз FM-перахоп і смс-абвесткі. Паромныя пераправы каля Петрыкава і вёскі Снядзін Петрыкаўскага раёна па-ранейшаму часова не функцыянуюць па той жа прычыне, што і пантонная пераправа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Надвор'е

# СНЕГУ ВЫПАДЗЕ ЎДОСТАЛЬ...

### На выхадныя будзем з невялікімі маразамі

**На гэтым тыдні ў Беларусь прыйшла сапраўдная зіма, і хоць мароз аслабеў, але выпаў снег і з'явілася снежнае покрыва. Чарговая сістэма атмасферных франтоў, якія змяшчаюцца з Заходняй Еўропы, дадасць яшчэ снегу, а ў далейшым і памацнеюць маразы, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Фота БЕЛТА.

Сёння ўдзень чакаецца слабамарознае з ападкамі надвор'е. Раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі прагназуюцца снег, мокры снег, месцамі слабы галалёд. У асобных раёнах завіруха, па паўднёвым захадзе краіны — парывісты вецер. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла. Непасрэдна ў выхадныя чакаюцца невялікія маразы, цалкам прыдатныя для зімовага актыўнага адпачынку. У суботу ўначы і раніцай пад уплывам франтальных падзелаў на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе снег, днём кароткачасовы снег чакаецца ў асноўным у паўночна-ўсходніх і паўднёва-заходніх раёнах. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да мінус 7 градусаў, удзень будзе ад нуля да мінус 5 градусаў. У нядзелю ў асобных раёнах краіны пройдзе кароткачасовы снег, на дарогах захаваецца галалёдзіца. Уначы будзе 3—9 марозу, удзень чакаецца ад мінус 1 да мінус 6 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня з ростам атмасфернага ціску прагназуецца марознае, але камфортнае надвор'е. У асобных раёнах, пераважна па ўсходзе краіны, пройдзе кароткачасовы снег, на дарогах месцамі захаваецца галалёдзіца.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Ну і ну!

# Сужыцель з гранатай

**У Баранавічах за палову тыдня адбылося ўжо другое рэзананснае здарэнне, калі давялося эвакуіраваць людзей і перакрываць рух транспарту.**

Гэтым разам парушальнікам спакою стаў 37-гадовы гараджанін, які прыйшоў да кватэры былой сужыцелькі з прадметам, падобным да гранаты, і стаў пагражаць, патрабуючы выпіўку. Пакуль жанчына выклікала міліцыю, яе былы ўцёк, а падазроны прадмет паклаў пад дзверы. Але кабета не разгубілася і... выкінула гранату праз акно. Прыбыўшыя міліцыянеры вывелі жыльцоў дома на вуліцу. Рух па вуліцы Бадака, на якой адбыўся інцыдэнт, перакрылі. Сапёры праверылі падазроны прадмет. Ён аказаўся гранатай, але вучэбнай. Хулігана затрымалі ў суседнім доме. Вядзецца праверка.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Будзь у курсе

# Самалётам у Растоў-на-Доне

**27 красавіка авіякампанія «Белавія» выканае першы рэйс па маршруце Мінск — Растоў-на Доне — Мінск.**

— Палёты ў Растоў-на-Доне будуць ажыццяўляцца на рэгулярнай аснове чатыры разы на тыдзень з вылетам з Мінска ў 23.10 па панядзелках, серадах, пятніцах і суботах і прыбыццём у Растоў-на-Доне на наступны дзень у 1.25. Зваротны рэйс плануецца ажыццяўляць з вылетам у 4.00 па аўторках, чацвяргах, суботах і нядзелях з прылётам у аэрапорт «Мінск» у 6.20. Час указаны мясцовы, — паведаміла спецыяліст па сувязях з грамадскасцю авіякампаніі «Белавія» Вольга Шчуко.

Палёты плануецца ажыццяўляць на камфартабельным авіялайнеры Embraer 175 пасажыраўмяшчальнасцю 76 месцаў. Час у дарозе складзе каля 2 гадзін 20 хвілін. Кошт авіябілетаў пры куплі на сайце belavia.by у адзін бок складзе ад 106 еўра, уключаючы таксы і зборы, і ад 199 еўра — тудыназад. Білеты ўжо даступныя ў продажы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Ёсць пытанне

# «МЕСЯЦЫ» ДЛЯ СТАЛІЦЫ


ЖК «Вясёлкавы» ў Дзяржынску.

## Ці ёсць будучыня ў гарадоў-спадарожнікаў?

**Гісторыя мінскіх гарадоў-спадарожнікаў чымсьці нагадвае сітуацыю з Плутонам, які то губляе, то ізноў набывае статус планеты. Так і тут: пастаянна вядуцца размовы пра тое, якім гарадам можна прысвоіць гэта «званне» і ці трэба гэта рабіць наогул.**

### «20 хвілін да цэнтра»

Аб праектах аптымізацыі колькасці жыхароў сталіцы ўпершыню загаварылі дзесяць гадоў таму. Прычым было вырашана адразу замахнуцца на шырокі маштаб. Выконваць функцыю спадарожнікаў сталіцы павінны былі дзевяць гарадоў: Дзяржынск, Жодзіна, Заслаўе, Лагойск, Рудзенск, Смалявічы, Стоўбцы, Узда і Фаніпаль. Як відаць са спіса, усе гарады вельмі розныя: сярод іх ёсць буйныя прамысловыя, так і зусім невялікія, больш прыдатныя для адпачынку або турызму.

Такі роскід адбыўся з-за таго, што доўга не маглі вызначыцца, што ўкладаецца ў само паняцце. Бо звычайна гарады-спадарожнікі ўтвараюцца натуральным шляхам непадалёк ад новых вялізных прадпрыемстваў. А вось спачатку забудаваць горад, а пасля падумаць, якую ж вытворчасць можна размясціць побач, — гэта, мякка кажучы, нетрывіяльна. Таму шмат хто пачаў успрымаць спадарожнікі як «спальнікі» — гэтакія раёны для начлегу на адлегласці ад працы, але з больш прымальнымі цэнамі на жыллё. Што ж, версія была больш набліжана да рэальнасці. Але ўзнікла яшчэ адно пытанне — транспартныя зносіны.

Як толькі гаворка заходзіць пра гэта, у кампаніі абавязкова знаходзіцца чалавек, які кажа: «Так, я па Мінску паўтары гадзіны на працу дабіраюся, а тут 20 хвілін да цэнтра — цьфу!» Вось толькі не бярэцца ў разлік, што працоўнае месца размяшчаецца ў будынку чыгуначнага вакзала ў рэдкіх выпадках, ды і гарадскія аўтобусы дакладна ходзяць часцей, чым прыгарадная электрычкі. А гэта калі чыгункі ў бок «спадарожніка» няма (як, напрыклад, у бок Лагойска або Узды)?

Тым не менш пакуль у статусе меркаваных спадарожнікаў працягваюць знаходзіцца шэсць гарадоў: са спіса канчаткова зніклі Жодзіна, Узда і Стоўбцы. Некалькі месяцаў таму кіраўнік Мінгарвыканкама Андрэй Шорац заявіў, што сталіца будзе падтрымліваць развіццё толькі Рудзенска і часткова Смалявічаў, астатнімі гарадамі распараджаецца Мінаблвыканкам. Тым самым губляецца сама ідэя спадарожніка як неад'емнай часткі горада. Прычына «застою» банальная: адсутнасць дастатковага фінансавання. За будаўніцтвам жылля ідзе інфраструктура, а ў жыхароў сталіцы, гатовых пераехаць у «спадарожнік», патрабаванні да яе па звычцы больш высокія, чым у рэгіёнах. Таму што пад гэтым паняццем маецца на ўвазе не толькі наяўнасць паліклінік і школ у крокавай даступнасці, але і, пажадана, салонаў прыгажосці, трэнажорных залаў і кінатэатраў — прычым яшчэ і каб быў выбар. Таму пакуль гісторый са шчаслівым канцом, у якіх фігуравала бы змена прапіскі са статуснай сталічнай на абласную, не так шмат.


Інтэр'ер кватэр у ЖК «Зялёныя прысады»

### Вам у «Вясёлку» ці ў «Зялёныя прысады»?

І ўсё ж такі яны ёсць. Чым жа могуць прыцягнуць мінчан, якія звыкліся са сталічнай мітуснёй, невялікія гарадкі? Не хочацца чарговы раз жартаваць пра тое, што кватэрнае пытанне сапсавала не толькі масквічоў, але цытата напрошваецца сама сабой. Калі ў той жа маладой сям'і няма дзядулі, што пакінуў у спадчыну жылплошчу ці мех грошай, магчымасць абзавесціся сваёй кватэрай у Мінску можа з'явіцца вельмі няхутка. А вось калі аддаць перавагу гарадам-спадарожнікам, магчымасць пасяліцца ва ўласным жыллі з'явіцца задоўга да таго, як дзеці скончаць школу. Але нават унутры самога спіса існуе даволі істотная разбежка кошту за квадратны метр жылля. Логіка простая: чым бліжэй да межаў Мінска, тым даражэйшая «месца пад сонцам».

Возьмем, напрыклад, Дзяржынск: каля 40 кіламетраў ад метро Малінаўка, новы раён з аптымістычнай назвай «Вясёлкавы». Хоць цяпер, у літаральным сэнсе сёння, тут можна купіць аднапакаёвую кватэру за 26,7 тысячы долараў. Калі вы думаеце, што падвох у метражы, то памыляецеся: з камфортам можна будзе размясціцца на 41 квадратным метры. Трохпакаёўка абыдзецца ў 46,7 тысячы долараў — якраз сярэдняя цана за аднапакаёвую кватэру ў Мінску.

Перасоўваемся ў бок сталіцы па той жа Брэсцкай трасе і трапляем у Фаніпаль. «Сланечнік», «Чаромха», «Зялёныя прысады» — здаецца, менавіта тут знаходзіцца рай для батаніка. Праўда, для досыць забяспечанага батаніка. Усяго нейкія 16 кіламетраў адлегласці паміж двума гарадамі істотна ўплываюць на кошт квадратнага метра жылля. Напрыклад, у ЖК «Зялёныя прысады» аднапакаёвая кватэра з ледзь большай плошчай абыдзецца ўжо амаль у 35 тысяч долараў. Можна зласвіць варыянты і танней, але тады не атрымаецца аддаць грошы і «уехаць на наступным тыдні». Трэба пацярпець, праўда, чакане можа акупіцца з лішкам эканоміяй часу на рамонт. Забудоўшчык прапануе свой варыянт аздаблення з дасылкамі да скандынаўскага стылю, які быў модны на працягу некалькіх апошніх гадоў, але ўжо пачынае губляць папулярнасць. Пафарбаваныя ў белы колер сцены, светлая мэбля, украпванне яркіх дэталяў — менавіта ў такой абстаноўцы пашчасціць жыць сям'і, якая вырашыцца на пераезд. Варта аддаць належнае распрацоўшчыкам праекта: інтэр'ер, можа, і не выглядае занадта арыгінальным або суперсучасным, але яго сапраўды можна назваць гарманічным і досыць стыльным. Хацелася б сказаць, што за акном — выдатны від на зялёныя насаджэнні, як лагічна здаецца з назвы, але, на жаль, вакол толькі бетон і агароджы іншых жыллёвых комплексаў.

Тая ж сітуацыя з цэнамі на нерухомасць датычыцца і іншых гарадоў-спадарожнікаў. Калі да межаў сталіцы, сабраўшы ўсе сілы, можна дайсці пешшу, не чакайце коштаў, якія прымусяць вас застыць у радасным здзіўленні.

### Будаўніцтва на апераджэнне

Што датычыцца не новай жылой забудовы, а саміх гарадоў у цэлым, то пакуль — будзем аб'ектыўныя — сталічны глянец яны не набылі. Тыповыя правінцыяльныя гарадкі, дзе галоўная плошча традыцыйна носіць імя Леніна, маленькія крамкі пакуль не выціснулі гандлёвыя гіганты, і складваецца выразнае адчуванне, што час тут цячэ больш павольна. Затое мясцовыя жыхары, напрыклад, не марнуюць штодня свае нервы ў пробках. Некаторыя сцвярджаюць, што тут лепшая экалогія, але з гэтым меркаваннем можна спрачацца доўга і ўпарта. Тым больш калі ў перспектыве прадпрыемствы пачнуць выносіць за межы сталіцы. Затое тут сапраўды спакайней — тое, што трэба пасля напружаных працы.

І ўсё ж у цэлым для тых, хто стаміўся бадзяцца па здымных кватэрах, любыя аргументы губляюць сваю значнасць перад магчымасцю нарэшце патрымаць у руках ключы ад уласнага жылля. Дарэчы, для таго каб стымуляваць мінчан ісці на такі сур'ёзны крок, Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, як заявіў кіраўнік ведамства Анатоль Чорны, прапануе дазволіць чаргавікам будаваць кватэры ў Смалявічах па заяўным прынцыпе згодна з Указам № 240 «Аб дзяржпадтрымцы грамадзян пры будаўніцтве (рэканструкцыі) жылых памяшканняў». Галоўная «фішка» праекта ў тым, што год пастаноўкі на ўлік маючых патрэбу ў жыллі значэння не мае: напісаць заяву і атрымаць крэдыт на выгадных умовах змогуць любыя грамадзяне з тых, хто мае патрэбу. Цяпер ідэя праходзіць стадыю ўзгаднення ў розных дзяржаўных органах.

Генпланы гарадоў-спадарожнікаў былі зацверджаны ў 2015 годзе. І тэмпы будаўніцтва жылля ўжо апярэджваюць закладзеныя ў іх. Так, летась замест запланаваных 10 тысяч квадратных метраў жылля было пабудавана 80 тысяч. А як зоркі запальваюць, калі гэта каму-небудзь трэба, так і з жыллём: пакуль ёсць попыт, ёсць і сэнс.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ З нагоды

# НА 70 ГАДОЎ НАЗАД,

## або Як бабруйскія ратавальнікі адраджалі пасляваенную гісторыю

**Знамянальна, што напярэдадні прафесійнага свята бабруйскія ратавальнікі аднавілі кавалачак сваёй гісторыі — пакой начальніка пажарнай часці 1945—1955 гадоў. Амаль восем месяцаў спатрэбілася тутэйшым актывістам, каб знайсці рэчы таго перыяду і стварыць атмасферу пасляваенных дзён.**

Важнай справай займаліся ўсе, але ініцыятарамі былі супрацоўнікі Бабруйскага гаррайаддзела па НС — старшы інспектар групы прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Дзмітрый Сказаў і яго нязменны памочнік — спецыяліст гэтай жа групы Уладзімір Бутко. Пра гэтых заўзятых актывістаў «Звязда» аднойчы ўжо пісала. Яны шмат чаго робяць для папулярызацыі прафесіі ратавальніка і сур'ёзна працуюць над адраджэннем гісторыі сваёй службы. Гэтым разам яны з лёгкай рукі начальніка Бабруйскага гаррайаддзела па НС палкоўніка ўнутранай службы Андрэя Бабіна і пры садзейнічанні начальніка пажарнай аварыйна-ратавальнай часці № 1 Бабруйска Дзмітрыя Гаўронскага стварылі ўнікальны пакой.



Дзмітрый СКАЗАЎ: гэты пераходны сцяг — гонар усіх бабруйскіх ратавальнікаў.

Гісторыя бабруйскай ратавальнай службы сапраўды вельмі цікавая і насычаная. У Бабруйску, напрыклад, існавала самая моцная спартыўная каманда па пажарна-прыкладным спорце, якая ў сярэдзіне мінулага стагоддзя так часта станавілася чэмпіёнам, што атрымала на пажыццёвае валоданне пераходны сцяг. Не кожная служба можа пахваліцца і тым, што мае свой гістарычны будынак. А ў бабруйчан ён ёсць, прычым дарэвалюцыйны. З 2003 года на другім паверсе будынка ратавальнікі стварылі сваю карцінную галерэю. А ўчора побач з ёй адкрыўся музейны пакой начальніка пажарнай часці 1945—1955 гадоў — наглядная дэманстрацыя таго, як пасля вайны адраджалася ў Бабруйску пажарная служба. Мэбля, адзенне на манекенах, іншыя рэчы — усё таго перыяду.

— Экспанаты шукалі па ўсёй акрузе, пыталіся ў нашых ветэранаў, якія працавалі ў тыя часы, — расказвае Уладзімір Бутко. — Аляксандр Булацкі аддаў сваё баявое адзенне. Аляксей Фёдаравіч Гайшун прынёс шынель, кашулю і нават плашч, у якім пажары тушыў. Такія плашчы ў 50-я гады мелі толькі начальнікі. На пажарах іх гэта адрозніваюць ад звычайных байцоў. Мікалай Герасімовіч падарыў кірзавыя боты і ўнікальныя сёння пажарныя крагі — спецыяльныя рукавіцы для пажаратушэння.

Ратавальнікі наогул падышлі да справы грунтоўна. Знайшлі ў бабруйскіх архівах газеты тых гадоў, сфатаграфавалі найбольш цікавыя артыкулы і зрабілі фотакалаж на шпалерах. У гэтым ім дапамаглі супрацоўнікі гарадской друкарні. Перад манекенам за сталом (які, дарэчы, мае свайго прататыпа) ляжаць копіі рэальных дакументаў. З іх нават вядома, каму якую прэмію давалі, хто выязджаў дапамагаць сена касіць.

У пакоі выстаўлена каля 40 экспанатаў. Узнагароды, дакументы, фота, некалькі гадзіннікаў, прадметы быту, адзенне. Вельмі дапамагла ратавальнікам бабруйчанка Марына Крычко. Яе дзед працаваў кіроўцам у пажарнай службе і нават быў на вайне. Калі Марына даведалася, якая патрэбна дапамога, падняла на ногі ўсю радню, тэлефанавала да сваякоў у Маладзечна. У выніку перадала шынель, боты, ляпу, прымус, наручны гадзіннік, небяспечную брытву і нават спецыяльнае тачыла для яе і шмат іншых экспанатаў, у тым ліку вельмі каштоўную рэч — спартыўны кубак 40-х гадоў, які быў уручаны пажарнай часці Бабруйска, дзе працаваў яе дзед.

На адкрыцці выставы і музейнага пакоя прысутнічалі прадстаўнікі выканаўчай улады горада на чале з мэрам Аляксандрам Студневым і кіраўніцтва ратавальнай службы Бабруйска.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*


Музейны пакой зрабілі за восем месяцаў.

Фота Дзмітрыя СКАЗАВА.

# «Без Бога выправіцца немагчыма»



Матушка Варвара гутарыць з сёстрамі.

## РАЗВОДЗЯЦЬ КОЗ І ВЫРОШЧВАЮЦЬ ВЕШАНКІ

Жаночы падворак арганізавалі ў 2011 годзе на месцы былой ваеннай часці непадалёк ад вёскі Нялідавічы (Мінскі раён). Частку



Новы, пакуль недабудаваны, храм.

пабудоў манастыр выкупіў, частку — атрымаў пазней у бясплатнае карыстанне. Тут жа стаяла царква, але за некалькі дзён да афармлення зямлі яна згарэла. Кажуць, хтосьці з жыхароў бліжніх вёсак падпаліў — не хацелі, каб у ваколіцах сяліліся жанчыны, у якіх раней былі праблемы з алкаголем і законам. Палічылі, што не стане храма — не будзе і падворка. Зрэшты, лёс распарадзіўся інакш. Цяпер тут узводзіцца новая царква.

— Не паверыце: пакуль не пачалі будаваць яе, не маглі скончыць рамонт жылля. Усё нешта не складвалася, — дзеліцца матушка Варвара (Атрасевіч).

Яна галоўная на гэтым падворку. Былы бухгалтар, манашка лёгка ўпраўляецца з адміністрацыйнымі абавязкамі. А клопатаў хапае. Тут ёсць свая гаспадарка, дзе трымаюць курэй, трусоў, коз. На падмурку салдацкай лазні стаіць зімняя цяпліца: у ёй садзяць памідоры, перцы і зеляніну. А ў былых бамбасховішчах з кастрычніка па красавік вырошчваюць вешанкі. У гэтым годзе, праўда, не сталі. Выкарыстоўваюць цяпер гэтыя памяшканні як склад для вербаў — іх да Вербнай нядзелі нарыхтоўваюць пад 50 тысяч.

Спачатку на падворку жыло чатыры «труднiцы». Сёння іх 28. Гэта былыя зняволеныя, жанчыны з алкагольнай ці наркатычнай залежнасцю, псіхічнымі захворваннямі, сіроты, якія пазбавілі сацыяльнага жылля. «Вядома, іх прыводзіць не мэта служыць Богу. Прыходзяць, бо больш няма куды, — усё разумее матушка Варвара. — Некаторыя нават працаваць не прывыклі. За пачак цыгарэт градкі капалі, каб быў хоць які стымул».

Манашка ўспамінае, як міліцыя іх адгаворвала браць былую зняволеную.

— Пераконвалі нас: «Вы ведаеце, па якім артыкуле яна сядзела?» Тая жанчына, Марына, правяла ў калоніі 25 гадоў за забойства на глебе рэўнасці. Пабыла на падворку чатыры месяцы і паехала дадому. Зноў яе затрымалі. Як выходзіць з калоніі — прыязджае да нас. Цяпер вось сядзіць за разбой.

Сёстры — так тут называюць усіх жанчын — жывуць у інтэрнаце ці ў доміку па тры чалавекі ў пакоі. Харчуюцца ў агульнай трапезнай. Некаторыя засяляюцца разам з дзецьмі. Органы апекі не супраць: ужо пераканаліся, што мамы тут не п'юць, а малыя пад наглядам. Пакуль жанчыны працуюць, дашкольнікі — у дзіцячым садку ў вёсцы Вішнёўка.

Колькі знаходзіцца на падворку, сястра вызначае сама. Можна пажыць тры месяцы, можна — паўгода. Пасля гэтага тэрміну яе чакае гутарка з манашкамі і духоўнікам, дзе спрабуюць зразумець, ці змянілася жанчына і ці працягваць ёй «прапіску». На падворку можна застацца назаўсёды, але тады жанчына мусіць быць актыўнай і дапамагаць манашкам.

Няўжо мяняюцца? «Праблема ў тым, што іншыя не могуць у гэта паверыць. Думаюць, што чалавек хітрue. А яго падтрымаць трэба, каб ён бачыў, што яго намаганні ацанілі», — упэўнена матушка Варвара.

## У ПРАВІЛАХ — НЕ ПІЦЬ І НАСІЦЬ ДАЎГУЮ СПАДНІЦУ

Пакуль мы хвалюемся пра курс долара і цэны ў крамах, за агароджай падворка ідзе іншае, размеранае жыццё. Раніцай і ўвечары жанчыны збіраюцца на малітву. У абед чытаюць акафіст — зварот з просьбамі да пэўнага святога. Астатні час днём праводзяць за работай: прыбіраюцца ў манастыры, працуюць у керамічнай і швейнай майстэрнях. У апошняй вырабляюць рызы для святароў і сціплае адзенне для прыхаджанак.

— Жанчыны працуюць толькі пры манастыры. Вопыт паказвае, што ў іншых месцах у іх не атрымліваецца. То кантакту з наймальнікам няма, то зрываюцца, — дзеліцца матушка Варвара.

З восені, як толькі прыбяруць агароды, сёстры пачынаюць рыхтавацца да калядак. Развучваюць песні, з якімі пасля Раства пойдуць віншаваць жыхароў ваколіц. Сёлета аб'ехалі з калядкамі вёскі Касынь, Нялідавічы, Лускава, Вішнёўка, Паперня. «Бабулі былі ў захапленні! Людзі нас ужо самі запрашаюць», — кажа манашка.

Па аўторках на падворак прыязджае бацюшка і служыць літургію. Маліцца нікога не прымушаюць, але... Тут успамінаюць гісторыю, якую інакш як неверагоднай не назавеш. Падчас Вялікага посту сёстры вырашылі кругласутачна чытаць Псалтыр — кожная па гадзіне. Адмовіліся толькі тры жанчыны. Праз час менавіта ў іх абвастрыліся псіхічныя захворванні...

Правіл на падворку няшмат. Сумленна працаваць, не піць, не курыць на тэрыторыі, сціпла апранацца — насіць доўгую спадніцу і хустку. Апошняе засвоіў нават вартавы сабака: брэша на мінакоў у штанах.

**«Жанчыны працуюць толькі пры манастыры. Вопыт паказвае, што ў іншых месцах у іх не атрымліваецца. То кантакту з наймальнікам няма, то зрываюцца».**

Да такога распарадку гатовы не ўсе. Неяк на падворак прывезлі бяздомную жанчыну — падабралі на вакзале. Тая пераначавала, а раніцай сабрала рэчы і з'ехала. Тых, хто не хоча прымаць правілы, просяць пакінуць падворак. На вуліцу не выганяюць — стараюцца хоць неяк уладкаваць. Знаходзяць жанчынам работу ў калгасе, просяць выдзяліць ім жыллё.

## «ПАКУЛЬ СЯДЗЕЛА Ў КАЛОНІІ, МАЛЫШКУ ЎДАЧАРЫЛІ»

П'ём гарбату ў доміку манашак. У гасцёўні на паліцах стаяць абразы, у калідоры на сцяне вісіць дыван з выявай Хрыста. Нават магнікі на халадзільніку — са святых мясцоў.

Насупраць за сталом сядзіць Ала. Жанчына прыйшла сюды шэсць гадоў таму — з-за праблем з алкаголем. Спрабавала змагацца з залежнасцю сама, але, кажа, без Бога гэта немагчыма. Засялялася на падворак з фінгалам і без дакументаў. Глядзіш на гэту ўсмешлівую жанчыну і не верыш, што тое жыццё, якое было «да», таксама яе.



Жанчына гатуе вячэру на ўсіх.

У Алы засталося трое дзяцей. Малодшаму сыну 15, старэйшай дачцэ — 24. Бачыцца з імі, але не навязваецца. «Цяпер ужо няма сэнсу — у іх сваё жыццё. Пра дзяцей паклапаціліся свёкар са свякроўю. Я не бачу, што патрэбен мой удзел у іх выхаванні. А яны шчаслівыя, што са мной усё ў парадку».

Ала — адзіная, хто не сыходзіў з падворку ні разу. Парывалася некалькі разоў выйсці замуж, але ад неабдуманых шлюбаў яе ўтрымалі. «Вельмі люблю падворак — гэта мой дом, — папраўляе хустку жанчына. — Хацела б пайсці ў манашкі, але баюся, што тады давядзецца пакінуць гэта месца».

— Глядзіце, Гена ідзе! — заўважаюць сёстры мужчынскую фігуру ў акне. — Гэта да цябе Света, дакладна.

Света спяшаецца на двор. Вяртаецца праз пару хвілін — з усмешкай на твары і гадзіннікам у руках. «Памірыліся. Падарунак мне зрабіў».

На падворку Света апынулася, бо не было выбару. А калі быў, жанчына зрабіла яго на карысць алкаголю.

— Я працавала юрыстам. Потым памерла мама (яна перанесла інсульт), і нешта пайшло не так... У мяне бацька алкаголік. Колькі памятаю яго, заўсёды піў. Вось і ў мяне пачаліся запоі — перастала нават на знешнасць увагу звяртаць.



Вераніка нясе вазы і кубкі, вырабленыя ў керамічнай майстэрні манастыра.

Калі ў Светы першы раз забралі маленькую дачку, адумалася. Уладкавалася на работу ў санаторый, змагла вярнуць дзіця. Праўда, ненадоўга. «Кожны раз думала: чарку вып'ю, расслаблюся — і ўсё. А насамрэч забываешся на ўсе свае абяцанні. Мне ўжо нават кампанія не патрэбна была».

Трывогу забілі ў садку. Дачку зноў забралі, а Свету адправілі на лячэнне ў Навінкі — на тры тыдні. Тады яна і пазнаёмілася з Генам, «труднікам» пры манастыры. Пасля выпіскі з бальніцы жанчына піць не перастала. Аднойчы ёй не хапіла «дабаўкі». Света ведала, што ў суседа ёсць дома пяць літраў спірту. Выкрала. А праз тры дні за ёй прыйшла міліцыя. Далі хатнюю «хімію». Прытрымлівацца рэжыму жанчына не хацела. Каб пасадзілі за краты, дастаткова было трох парушэнняў, — у Светы іх было 40. На год і два месяцы яе адправілі ў папраўчую калонію ў Гомель.

Першы раз на падворак жанчына прыехала ў снежні 2016 года. Але доўга прабыць не змагла. Наступны раз вярнулася ў ліпені мінулага года: Гена ўгаварыў. Света, праўда, супраціўлялася. Спецыяльна напілася — думала, такую яе дакладна не возьмуць. Але на наступны дзень «перакананая атэістка» сама пазваніла і папрасілася.

— Тут вольнага часу амаль няма — гэта добра. А то калі мне было сумна, шукала, чым сябе заняць і зноў думала пра алкаголь, — прызнаецца.

Адзіная дэталь не сышлася ў Свецiным пазле: пакуль жанчына сядзела, яе малышку ўдачарылі. Хто, не ведае. «А што цяпер?» — задаецца пытаннем.

— Маліцца, — падказвае матушка Варвара.

## «СКАЗАЛА: КАЛІ НЕ ДАПАМОЖАЦЕ, ПАМРУ»

Маладая мама Вераніка жыве на падворку разам з дачкой — пяцігадовай Міланай. Задавальваецца невялікім заробкам у керамічнай майстэрні, хоць некалі шыкавала — працавала круп'е ў казіно. Усё сапсавалі наркотыкі.

— З'явілася дзіця, а я не спынілася, — успамінае. — Муж таксама ўжываў. Усё хацела ад яго сысці, але куды? З бацькамі ў мяне дрэнныя адносіны, не знаходзім паразумення. Яны былі гатовы прыняць унучку, але не мяне: «Ідзі ўладкоўвай сваё жыццё сама». Я звярнулася ў манастыр — на службы даўно хадзіла. Сказала: калі не дапаможаце, памру.

Прывыкаць да іншага жыцця было цяжка.

— Я больш не магла купляць дарагія тэлефоны, адзенне. «Каб я пайшла мыць агульны ўнітаз? Ды ні за што!» — думала раней. Трэба было пераламаць сябе.

Былы муж часам наведвае дачку. «Ён крычыць аб любві, а на справе...» — толькі ўздыхае Вераніка. На падворку яна правяла чатыры гады. Вясной плануе сыходзіць. «Усе кажуць, што рана, але, мне здаецца, самы час. Буду здымаць кватэру. Пакуль застануся ў майстэрні працаваць, а там паглядзім... Увогуле, у горы паехала б жыць».

...Матушка Варвара ўпэўнена: калі чалавек прыняў і прызнаў сваю праблему, першы крок да выпраўлення зроблены. Са шчырымі і адкрытымі жанчынамі працаваць лягчэй. Але ж манашкі не могуць быць заўсёды побач. Як складваецца лёс тых, хто ўрэшце вырашае пакінуць падворак? Матушка не хавае: па-рознаму. І дае толькі адну параду:

— Калі чалавек працягвае жыць з храмам, усё атрымліваецца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**
*Мінскі раён.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Пространсинвест» по ОСГО ВТС РБ серии ВВ номера 2463190, 2463191, 2463192, 2463193, 2463194, 2463195, 2463196, 2463197, 2463198, 2463199, 2463200, 2463201, 2463202, 2463203, 2463204, 2463205 **считать недействительными**.

## Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды земельного участка

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды, размер начальной цены и задатка |
|---|
| Лот № 1. Право заключения договора аренды сроком на 5 лет земельного участка с кадастровым № 224450100001001691 площадью 0,0071 га по адресу: Витебская обл., Сенненский р-н, г. Сенно, вблизи улиц Назаренко и Азгура для строительства объекта «Установка торгового павильона для продажи продовольственных товаров в г. Сенно, вблизи улиц Назаренко и Азгура» (для размещения объектов розничной торговли). Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: отсутствуют. **Нач. цена**: 148,44 руб. **Задаток:** 14,84 руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона**: 19.02.2018 в 11.00. по адресу: Витебская обл., г. Сенно, ул. К. Маркса, 2 в Сенненском районном исполнительном комитете. **Срок внесения задатков и приема документов:** с 19.01.2018 с 8.30 по 16.02.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в рабочие дни с 8.30 до 17.30 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY87AKBB36003260080070000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04002. Получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Сенненский районный бюджет). **Условия аукциона:** заключить с Сенненским райисполкомом договор аренды зем. участка и осуществить в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды, но не позднее 3 месяцев с момента утверждения протокола о результатах аукциона, гос. регистрацию зем. участка, прав на зем. участок; получить в уст. порядке архитектурно-планировочное задание и тех. условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства (реконструкции), разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательных работ, разработку строительного проекта на строительство (реконструкцию) объекта в указанный законодательством срок; приступить к строительству (реконструкции) объекта в течение 6 месяцев со дня утверждения в уст. порядке проектной документации на строительство такого объекта; завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией |

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. **Условия аукциона:** в течение 10 рабочих дней после утверждения в уст. порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды зем. участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в уст. порядке), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием зем. участка и изменением зем. участка в результате такого формирования, в том числе с гос. регистрацией в отношении этого участка. Инженерные коммуникации и сооружения на зем. участке отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. **Для участия в аукционе** граждане, индивидуальные предприниматели и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

**ОАО «Минский лакокрасочный завод» извещает о проведении 29 января 2018 года в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Бирюзова, 4 внеочередного собрания акционеров**

**Повестка дня:**
1. Реорганизация производства.
Регистрация участников с 12.00 до 13.45.
При себе иметь документы, подтверждающие личность и полномочия.
Справки по телефонам: 204 79 01, 207 67 96.

УНП 100645846

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| **Извещение о проведении аукциона** | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29 |
| **Предмет аукциона** | |
| **Склад, общ. пл. 4131 кв. м инв. номер 200/С-49769. Адрес: Витебская обл., г. Витебск, ул. Базовая, д. 8. Начальная цена с НДС 20 % – 1 098 066,07 бел. руб.** | |
| **Сведения о земельном участке:** кадастровый номер 240100000002000197, площадь 1,0954 га принадлежит Продавцу на праве постоянного пользования, целевое назначение – обслуживания складских помещений. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель: охранная зона магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений, код 7, площадь 0,3915 га; охранная зона линий электропередачи, код 6, площадь 0,0157 га | |
| **Обременения:** Предмет аукциона обременен договорами аренды | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок заключения договора купли-продажи: 30** рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета аукциона:** победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества. Срок оплаты устанавливается в договоре купли-продажи | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by. Передача имущества победителю аукциона, заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 рабочих дней с момента внесения оплаты в размере 100 % стоимости недвижимого имущества. Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке. Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также регистрацией возникновения (перехода) соответствующего права на земельный участок несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **21.02.2018** в 14.30 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **19.02.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17 280-36-37; +375 29 183-69-71.<br>Email: auction@cpo.by |

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Гроднорайагросервис», расположенного по адресу: Гродненская область, Гродненский район, Обуховский с/с, д. Котра 13 февраля 2018 года

| Вид аукциона открытый | Лот № 1* | Лот № 2 |
|---|---|---|
| Предмет аукциона | Комплекс зданий, сооружений и оборудования, включающий 8 капитальных строений (диспетчерская, автозаправочная, здание СТО на 100 автомобилей, мастерская, здание трансформаторной подстанции, проходная, столярный цех, склад), канализационную (фекальную) сеть, канализационную (ливневую) сеть, электрическую сеть 0,4 кВ, асфальтобетонное покрытие, зеленые насаждения, ограждения | Комплекс зданий, сооружений и оборудования, включающий 3 капитальных строения (административное здание, кафе-бар, здание гостиницы), канализационную (фекальную) сеть, канализационную (ливневую) сеть, асфальтобетонное покрытие, ограждения |
| Начальная цена продажи | **973 843,89 рублей** (с учетом НДС 20%) | **233 145,46 рублей** (с учетом НДС 20%) |
| Кадастровые номера земельных участков и размеры | 422086003101000005 площадью 6,8678 га | 422086003101000107 площадью 0,2674 га и 422086003101000108 площадью 0,5114 га |
| Месторасположение земельных участков | Гродненская область, Гродненский район, Обуховский с/с, д. Котра | |
| Продавец | Открытое акционерное общество «Гроднорайагросервис», г. Гродно, ул. Понемуньская, 27, тел. 8(0152)755568 | |
| Имущественное право земельных участков | Право постоянного пользования | |
| Сумма задатка | 97 384,39 рублей | 23 314,55 рублей |
| Организатор аукциона | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел.: 720537, 720546 | |
| Дата проведения аукциона | 13 февраля 2018 года | |
| Время проведения аукциона | 12.00 | |
| Место проведения аукциона | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал | |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403 | |
| Дата и время начала приема документов | 22 января 2018 года 8.00 | |
| Дата и время окончания приема документов | 7 февраля 2018 года 17.00 | |

*имущество обременено договором аренды

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

## Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении 20 февраля 2018 г. аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества в рамках 226-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды объекта (руб.) | Целевое использование имущества | Сумма задатка (руб.) | Характеристика имущества и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Минская дистанция гражданских сооружений,** тел.: +375 (17) 225-66-22, +375 (17) 225-22-25 | | | | | | | |
| *1* | г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 16 | 70,9 | 2,5 | 269,42 | Под организацию розничной торговли продовольственной и непродовольственной группой товаров (кроме товаров, бывших в употреблении и товаров ритуального назначения) | 26,90 | Помещение в здании вокзала станции Минск-Южный. Примечание: после заключения договора аренды необходимо застраховать имущество. Заключить договор на электроснабжение. (1*) |
| | *1* Год постройки – 1961. Материал стен – кирпич; крыша – мягкая рулонная; полы – плитка; отопление – радиаторы металлические; водопровод – стальные трубы; канализация – чугунные трубы; электроснабжение – скрытая проводка* | | | | | | |

**Договор аренды заключается сроком на пять лет, если иное не указано в настоящем извещении.**

**Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.**

Аукцион состоится **20 февраля 2018 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Возможность **осмотра Имущества**, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, **обеспечивает арендодатель**.

**Организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнять у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), а также размер коммунальных платежей.**

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства.

Участвовать в аукционе могут юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе:**

- уплачивает задаток (юридические лица и индивидуальные предприниматели оплату производят **платежным поручением**!) по соответствующему предмету торгов (назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 226 от 20.02.2018 по предмету аукциона №______**), перечисляемый на расчетный счет № BY34BPSB30121049710199330000 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, государственное предприятие «МГЦН» (сумма задатка по каждому предмету торгов указана в соответствующей графе таблицы). **Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов;**

– подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов (бланк заявления можно получить у организатора аукциона):

***юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:***

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:***

легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копии **платежного поручения** либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***индивидуальный предприниматель:***

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***физическое лицо*** – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

– заключает с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения:

физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность;

представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** и консультации по вопросам участия в аукционе **осуществляются с 22 января 2018 г. по 14 февраля 2018 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.**

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.**

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

*При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

**Порядок определения победителя аукциона:**

– торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

– аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 100 (сто) базовых величин на дату проведения аукциона.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить **на текущий (расчетный) счет арендодателя** сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. **Информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона**.

***Важно!*** *Договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом). Заключение договора аренды, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.*

**Договоры аренды имущества должны быть заключены в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.**

**Телефоны для справок: отдел аукционов** + 375 (17) 327 40 22, **отдел аренды** + 375 (17) 327 41 70, 327 47 29, 328 36 57, **бухгалтерия** + 375 (17) 328 36 58. **Интернет: www.mgcn.by**




## СУСТРЭЧА Ў «ВЯРХАХ»

Розныя часы — розныя гульні: сённяшніх дзяцей хлебам не кармі — дай пасядзець у інтэрнэце! Іх, згадзіцеся, з хаты не выгнаць! А некалі ж было не загнаць: і малыя, і падрослыя на ўсю моц «партызанілі», хаваліся ў лесе, хадзілі адтуль у разведку, ладзілі розныя «дыверсіі», раскладвалі вогнішчы...

Мой пляменнік, напрыклад, разам з «атрадам» «партызаніў» непадалёк ад дома ў алешніку. Дзеці там выкапалі зямлянку, змайстравалі будан — стварылі, карацей, сапраўдную «базу». З бабулінай кухні і пакрысе на яе «пераязджалі» кубкі, каструлі, патэльня... На градах пастаянна радзелі радкі з цыбуляй, а з кубельца знікала сала. Адным словам, хлопчыкі, як умелі і маглі, з самаробнай зброяй у руках білі ўяўных ворагаў, гатавалі харчы, бавілі час. А падраслі і ўсё гэта кінулі...

З дзяцінства не выходзіў хіба Сцяпан, ён па-ранейшаму рабіў нейкія буданы. Спачатку — то ў ляску, то ў лузе, а потым яго пацягнула вышэй, і чарговую хованку ён зрабіў на высокай ліпе, што расла каля клуба. «Ну, ты, як буслік», — прызнаў нехта з вяскоўцаў і тым самым падарыў Сцяпану мянушку.

А тут у час навальніцы прапала электрычнасць. Каб аднавіць яе, прыехала брыгада спецыялістаў, і адзін з іх ужо сабраўся лезці на слуп.

— Не спалохай там Бусліка, — папярэдзіў нехта з мясцовых, бо да ліпы са Сцёпкавым «гняздом» было рукою падаць.

Аднак электрык толькі адмахнуўся: маўляў, кіньце дурное, густое ж дрэва, буслы ў такіх не паселяцца... Крылы шырокія... Ім прастор патрэбен.

Карацей, зашпіліў ён страхавачны пояс, начапіў на ногі спецыяльныя кошкі, палез на слуп. Уладкаваўся як мага ямчэй ды засяродзіўся на справе, як раптам... што гэта? Наўпрост перад ім рассунуліся галіны, з густой лістоты паказалася галава, данеслася запытальнае:

— Ты гняздо сабе хочаш зрабіць? Тады пералазь на дрэва.

Ад неспадзеўкі ў электрыка перахапіла дух, на галаве «падскочыла» каска, рукі-ногі здранцвелі... Каб не той страховачны пояс, каменем паляцеў бы ўніз.

І галоўнае — папярэджвалі ж: «Не спалохай Бусліка...».

Ці ўсё ж «Не спалохайся»?

Не прыслухаўся. А трэба было, бо не дарэмна ж кажуць: «Хто папярэджаны, той узброены».

**Мікалай Юруць,**
*г. Ляхавічы.*

## «МАЛАДОСЦЬ — БУЙНОСЦЬ...»,

### або Як я быў «крытыкам»

Некалі даўно, праз шэсць гадоў пасля заканчэння вайны, меў я вялікае шчасце — стаў студэнтам адзінага на той час Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

У гэтым храме навукі, відаць, заўжды панавала ўзнёсла-дзелавая атмасфера, многія пісалі вершы, апавяданні... Я таксама нешта рыфмаваў. У нас, пачаткоўцаў, быў тады свой паэтычны гуртог: мы збіраліся разам, спрачаліся, абмяркоўвалі творы, пробы пяра.

...На тое, чарговае, пасяджэнне з'явіўся, помню, усмешлівы чарнявы хлопец, прадставіўся: «Рыгор Барадулін, родам з Ушаччыны». І пры гэтым перадаў кіраўніку нашай творчай суполкі, вядомаму пісьменніку Алесю Якімовічу, вучнёўскі сшытак: трэба разумець, з вершамі?.. Але сам у той вечар іх не чытаў — слухаў іншых.

Калі «спеўка» скончылася, Алесь Якімовіч працягнуў мне барадулінскі сшытак, сказаў: «Вазьмі, уважліва прачытай. На наступнай сустрэчы выкажаш свае заўвагі».

Узяў я той сшытак, акуратна, па вертыкалі, склаў папалам, засунуў ва ўнутраную кішэнь пінжака. Назаўтра выбраў вольную гадзіну, пачаў чытаць. Добрыя вершы! Але ж мне даручана не хваліць іх, а выказаць заўвагі...

І так я іх круціў, і гэтак, але хібаў не бачыў — ніякіх.

І вось мы збіраемся зноў. Мне даюць слова. Хвалююся і творы таго хлопца з Ушаччыны шчыра хвалю. Потым — нешта раю.

Барадулін слухае — досыць уважліва, з уласцівай яму хітрынкай: «Давай, давай, маўляў, дарагі мой крытык!».

...Пазней, жывучы ў адным інтэрнаце на вуліцы Свярдлова, мы з ім сустракаліся амаль штодня.

Помню, як аднойчы Рыгор падышоў, сказаў: «Паслухай мой новы верш». І пачаў чытаць: «Як захлынуўся ад радасці жаўранак, славячы сонца вясновага дня, як на куп'і па балотных выжарынах мякка хрумсціць пад нагою сушняк... Тры гады я не чуў...»

Зачараваны мелодыяй верша, які пазней зойме належнае месца ў зборніках класіка, я зноў і горача яго пахваліў.

...У пазнейшыя гады, пасля вучобы, мне, на жаль, не выпадала сустракацца са славутым паэтам.

Цяпер чытаю, перачытваю ягоныя творы ды міжволі ўспамінаю, як выступаў «крытыкам».

**Віктар Несцяровіч,**
*г. Лагойск.*

## ВЫНІКІ ПАДВЕДЗЕНЫЯ, КОНКУРС ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Цягам года падрыхтаваць да друку амаль паўтары сотні «вясёлых і праўдзівых гісторый» было, здаецца, прасцей, чым вылучыць з іх найлепшыя... *«Я сумленна падышоў да справы, на сайце газеты некалькі дзён «пракручваў» «Калейдаскоп», перачытваў творы. І што ў выніку? Ды нічога,* — піша **спадар Іван Гаральчук з Мінска,** — *падабаецца ўсё, кожная гісторыя — па-свойму. Таму ўсім аўтарам зычу натхнення ды творчых поспехаў, а газеце, апроч іншага, — цярпення. Дзякуй за «Провад»! І, калі ласка, не абрывайце яго. Народ, паверце, будзе заставацца на сувязі».*

Чаму? Таму што рубрыка (адказы з іншых канвертаў) цікавая і вельмі павучальная, бо яна дазваляе «ўспомніць перажытае», «на людзей паглядзець і сябе паказаць», «усміхнуцца, а то і ад душы пасмяяцца», нешта з прачытанага «перадаць» далей. *«Найлепшыя гісторыі — гэта тыя, што запомніліся, тыя, якія хочацца чытаць і перачытваць, расказваць іншым, нават са сцэны»,* — прызнае старшыня вялікага чытацкага журы **спадарыня Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны.** І, наколькі ведаем, досвед такі ў аўтаркі быў: ад рогату, расказвалі, ледзь шыбы ў клубе не вынесла...

*«Газету з «Провадам» я заўсёды чакаю, шукаю ўжо знаёмыя прозвішчы,* — піша **спадарыня Клімовіч са Стоўбцаўшчыны.** — *Летась выйшла шмат цікавых гісторый, выбраць найлепшыя вельмі складана, але ж калі трэба...»*

Шчыры дзякуй усім чытачам, якія адгукнуліся на просьбу газеты — зрабілі выбар. Такім чынам, дзясяткі суб'ектыўных меркаванняў тут, у рэдакцыі, сышліся — хочацца верыць — у адно аб'ектыўнае і...

Найлепшымі гісторыямі, надрукаванымі ў 2017 годзе, прызнаны: «Два сакрэты прараба» («Звязда» ад 26.05), «Цяжка быць дыпламатам. Нават народным» (18.08), «Жонку слухай, а свой розум май» (21.04) **спадара Івана Гаральчука з Мінска**; «Маня вылечыць» (24.11), «Англійскі кампот» (20.10) і «Кароткі курс гісторыі...» (19.05) **спадарыні Соф'і Кусянковай з Рагачоўшчыны**; «Пасля базару» (28.07), «А не шкодзь!» (2.09), «Вада жывая і мёртвая» (8.07) **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска;** «Зялёная школа» (11.02) **спадарыні Кацярыны Будзіловіч са Скідзеля.**

Апроч гэтых аўтараў, у дзясятку найлепшых (па меркаванні і вялікага чытацкага, і маленькага рэдакцыйнага журы пад старшынствам першага намесніка галоўнага рэдактара Наталлі Карпенкі) увайшлі **спадарыні Валянціна Паліканіна з Мінска** (яе «Любоў зямная» («Звязда» ад 10.11) адзначана спецыяльным прызам журы), **Раіса Васільева з Гомеля, Алена Несцяронак з Докшыцаў, спадары Анатоль Пальнскі з Беразіно, Сяргей Гурскі з Баранавічаў, Яўген Звярынскі з Мінска.**

На адрас першых пяці ў найбліжэйшы час будуць накіраваны адмысловыя звяздоўскія падарункі. Іншым жа (кожнаму, хто пісаў) — ужо сёння — словы найшчырэйшай удзячнасці за інтэлектуальную, скажам так, падтрымку газеты, за сапраўднае задавальненне, з якім чытаецца абсалютная большасць твораў, за канчатковае перакананне, што крыніцы народнага гумару і сапраўды невычарпальныя!

**А таму конкурс на лепшую гісторыю з жыцця чытачоў «Звязды» працягваецца, рэдакцыйнае журы працуе, чытацкае, спадзяёмся, таксама? Дарэчы, спадарыня Кусянкова, прапануе «афіцыйна» ўключыць у яго самых актыўных падпісчыкаў і аўтараў.**

Як вам гэта ідэя? Вы «пажурыць» не супраць? Тады далучайцеся.

І пішыце.

**Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў

# НАТАТКІ НЕФЕМІНІСТКІ



## У любой барацьбе — нават за правы жанчын — павінна быць нейкая мяжа

АПОШНІЯ некалькі месяцаў у сусветнай багемнай тусоўцы новая мода — на скандалы з сексуальнымі дамаганнямі. Спачатку збэсцілі беднага вядомага галівудскага прадзюсара, прыпомніўшы яму правіны маладосці: маўляў, не мінаў сваімі не заўсёды прыстойнымі заляцаннямі ніводнай сімпатычнай актрысы. Небарака, якому ўжо за семдзесят, цяпер нават у кавярні спакойна пасядзець не можа, бо абураныя барацьбіткі за правы жанчын пагражаюць яму фізічнай расправай і нават спрабуюць пагрозы ажыццявіць. Пасля з'явіліся ну зусім ужо нягеглыя абвінавачванні ўкраінскай гімнасткі на адрас нашага спартсмена. Нягеглыя, бо мінула з таго часу, калі «ўсё было», амаль трыццаць гадоў, «гвалтаўнік» і «ахвяра» ўжо ў тым узросце, калі іх равеснікі ўнукаў няньчаць. Карацей, у любога нармальнага чалавека складаецца ўражанне, што кабетка, узгадваючы маладосць і спартыўную славу, якія абедзве незваротна мінулі, рашыла «на хвалі» зрабіць сабе піяр. Праўда, сама хутка дадумалася (ці добрыя людзі падказалі), што піяру не атрымаецца, і стала публічна выказваць шкадаванне: маўляў, дарэмна я гэту справу з дна нафталінавага куфра дастала.

Далей — болей: зусім нядаўна на ўручэнні прэстыжнай прэміі тыя ж самыя галівудскія этуалі ў знак пратэсту супраць усё тых жа сексуальных дамаганняў (а можа, у знак жалобы па няспраўджаных спадзяваннях, якія гэтыя дамаганні давалі?) з'явіліся ў чорных сукенках. Не думаю, што гэтыя паказальныя ўборы абышліся ім танней, але сусветная прагрэсіўная супольнасць зноў заварушылася, усяляк падтрымліваючы гэткі арыгінальны творчы спосаб барацьбы за жаночыя правы. «Рукі прэч, вочы ўбок і рот на замок ад жанчыны!» — прыкладна такім лозунгам павінен кіравацца сучасны мужчына, калі не хоча непрыемнасцяў на сваю галаву і на іншыя значныя часткі цела.

З чаго б я так уз'елася на супляменніц жаночага роду, спытаеце. Хай яны там за кардонам робяць што хочуць, бо чаго лепшага чакаць, калі мужчына «выходзіць замуж» за мужчыну, а ў падручніках знаёмства з сусветам для самых малодшых школьнікаў тлумачыцца, што гэта нармальна, што бацькі — гэта не тата і мама, а «радзіцель» нумар адзін і нумар два (з сяброўкай у Германіі нядаўна над гэтым падручнікам гаравалі, не ведаючы, як патлумачыць гэтыя разумныя выкладкі васьмігадовай дзяўчынцы, якую з цяжкасцю, але выхоўваюць у спрадвечных хрысціянскіх традыцыях). Мы ж да гэтага, дзякуй богу, не дайшлі (за непаліткарэктнасць тут ні ў кога прабачэння прасіць не буду).

Але ўся бяда наша ў тым, што, стараючыся ні ў чым не адставаць ад цывілізаванага свету, мы, не ўлічваючы таго, што рэаліі, у тым ліку і ва ўспрыманні каштоўнасцяў ці наадварот, у нас адрозныя ад іншых (што, уласна, і робіць нас асобным народам), нясёмся на злом галавы нават туды, дзе нас з аб'ектыўных і суб'ектыўных меркаванняў і быць не павінна. Нічога, акрамя прыкрасці і сораму, з гэтага не атрымліваецца. Але ж як не паспрабаваць? І калі не лічацца ў нашым грамадстве заляцанні да супрацьлеглага полу злачынствам, а ўвесь цывілізаваны свет аж стогне, абмяркоўваючы чарговы сексуальны скандал, значыць, гэты скандал трэба прыдумаць.

УБАЧЫЎШЫ ў сецівe гучны загаловак кшталту «Прафесар БДУ выстройваў студэнтак ля дошкі па памеры грудзей», думала, што прачытаю нейкае выкрыццё пра сапраўды беспрынцыпнага нахабнага выкладчыка. Аказалася, аўтарка гэтай «сенсацыі» — калега, мы вучыліся на адным факультэце, а «сексуальнага маньяка» яна зрабіла з нашага NN, абсалютна бяскрыўднага чалавека, які часам дазваляў сабе саленаватыя жарты на адрас пяцікурсніц (абяцаў, напрыклад, залік аўтаматам усім замужнім ці звяртаў увагу на занадта адкрытыя часткі гардэробу). Успрымалі мы ўсё гэта абсалютна адэкватна, ніхто не крыўдзіўся, у рэшце рэшт усе без асаблівых праблем атрымлівалі той залік — і замужнія, і незамужнія, і нават асобы мужчынскага полу. Таму першай рэакцыяй на той злосны опус, які растыражавалі некаторыя парталы, было непаразуменне і збянтэжанасць. Яны змяніліся горыччу і сорамам (і за тую, што напісала, і за саму сябе, што кінулася гэта чытаць). Потым надышоў час думаць (думаем мы, на жаль, нярэдка ў самую апошнюю чаргу). Думаць сапраўды ёсць аб чым.

І справа не толькі ў тым, што NN стары хворы чалавек, якому сумніўная слава, якая абрынулася на яго з інтэрнэту, здароўя наўрад ці дабавіць. І нават, зыходзячы з гэтага, не ў этыцы — няважна якой — журналісцкай або проста чалавечай. Справа ў тым, як мы да ўсяго гэтага ставімся. Бо, калі перціся стрымгалоў за новымі прыдуманымі не намі каштоўнасцямі і трэндамі, можна страціць адчуванне здаровага сэнсу і пачуццё гумару (а ці не яны стрымліваюць нас на вельмі тонкай мяжы нармальнасці і абсурду, пра што ўжо нядаўна пісалася). Заўжды мужчыны заляцаліся да жанчын — і словам, і дзеяннямі. Заўжды адносіны супрацьлеглых палоў былі прадметам жартаў, не заўсёды прыстойных. І гэта было — дый сёння павінна быць — нармальна. (Я не кажу пра фізічны гвалт — на гэта ў нас ёсць Крымінальны кодэкс.) На гэтым пабудавана значная частка нашага фальклору. Нават сёння на вясковых вяселлях можна такога наслухацца... Атрымліваецца, каб адпавядаць сучасным тэндэнцыям, маладая павінна дэманстратыўна пакінуць святочную бяседу і падаць на гасцей, якія сыпалі салёнымі жартамі, у суд?..

ТУТ яшчэ вось якая небяспека існуе. Большасць нашых мужчын (даруйце, дарагія суайчыннікі, але як ёсць, так ёсць) самі па сабе не вельмі галантныя кавалеры і палкія залётнікі. Калі ж яшчэ жанчыны пачнуць абурацца на заляцанні і пагражаць публічнай ганьбай і судом — ад іх і таго малога, што маем сёння, не дачакаемся: каму захочацца непрыемнасцяў. Можа атрымацца яшчэ горш — пачнуць нашыя мужыкі глядзець у іншы бок, адкуль небяспекі няма, — на сабе падобных. А што — таксама надзвычай модны трэнд. І дэмаграфічнае пытанне паўстане тады рубам не толькі для карэнных заходніх еўрапейцаў, дзе фемінізм ужо даўно пераможна крочыць (праўда, невядома, куды).

З адваротным бокам жаночай барацьбы за раўнапраўе мне «пашчасціла» сутыкнуцца ў міжнародным лагеры на археалагічных раскопках. Неяк давялося цягнуць з раскопу цяжкое вядро з вільготным жвірам. Амерыканскі прафесар — здаровы мужык — стаяў наверсе і з раўнадушнай цікавасцю, бы за шчыраваннямі мураша, назіраў за маімі высілкамі і нават не крануўся з месца, каб дапамагчы. Мне іхні перакладчык пасля патлумачыў: прафесар не тое што нявыхаваны, ён і рад быў дапамагчы. Але думаў, што яго дапамогу я (як ці не кожная яго суайчынніца) расцаню як сексуальныя дамаганні і ў чужой яму краіне ён займее шмат непрыемнасцяў. Таму ён нікому не будзе падаваць рукі, падсоўваць крэсла, адчыняць дзверы, падносіць цяжкія рэчы.

Менавіта тады я зразумела, наколькі я далёкая ад ідэй фемінізму.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Цёлка. План. Драма. Водгук. Унітаз. Грыва. Абед. Вораг. Каляндар. Ржа. Чаравікі. Сук. Амін. Страла. **Па вертыкалі:** Людзі. Атава. Апад. Рагу. Мозг. Бульдазерыст. Грыб. Клад. Рамо. Вера. Выява. Радзіма. Гарбіна. Качка. Рыс. Вар. Кіп.

Склаў **Юрый ФАЛІНСКІ**, *г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.16 | 17.26 | 8.10 |
| Віцебск — | 9.11 | 17.09 | 7.58 |
| Магілёў — | 9.06 | 17.16 | 8.10 |
| Гомель — | 8.55 | 17.19 | 8.24 |
| Гродна — | 9.30 | 17.42 | 8.12 |
| Брэст — | 9.23 | 17.49 | 8.26 |

## Месяц

*Маладзік 17 студзеня. Месяц у сузор'і Рыб.*

## Імяніны

*Пр.* ВАДОХРЫШЧА (Багаяўленне — Хрышчэнне Гасподняе). *К.* Браніслава, Генрыха, Марты, Сары, Юзафа.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# ЗАЎТРА




# Даты Падзеі Людзі

## 19 СТУДЗЕНЯ




**1249** год — па звестках легендарнай часткі беларуска-літоўскіх летапісаў, князь Міндоўг разграміў каля горада Крутагор'е войскі татарскага князя Койдана і з таго часу Крутагор'е стала называцца Койданавым (з 1932 года — Дзяржынск).

**1939** год — нарадзілася (в. Шпакоўшчына Смалявіцкага раёна) Таццяна Рыгораўна Мархель, беларуская актрыса. Народная артыстка Беларусі. Скончыла Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. З 1963 года — у Гродзенскім, з 1967-га — у Магілёўскім абласных драматычных тэатрах, з 1970 года — у Беларускім тэатры імя Я. Коласа. З 1987-га — у Тэатры-студыі кінаакцёра, з 1994-га — у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі. Характарная актрыса. Створаныя Т. Мархель вобразы вылучаюцца лірызмам, дакладнасцю псіхалагічнага малюнка, пранікненнем у сутнасць нацыянальнага характару, мілагучнай мовай.




**1863** год — нарадзіўся Аляксандр Серафімовіч, рускі пісьменнік. Аўтар аповесці «Пяскі», раманаў «Горад у стэпе», «Жалезны паток». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1949 годзе.

**1900** год — нарадзіўся Міхаіл Ісакоўскі, рускі савецкі паэт, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы. Аўтар паэтычных зборнікаў «Правінцыя», «Наказ сыну» і многіх іншых. Многія вершы паэта сталі сапраўды народнымі песнямі — «Кацюша», «Ворагі спалілі родную хату», «Развітанне», «Агеньчык», «Зноў зацiхла ўсё да світання» і інш. Ісакоўскі добра ведаў беларускую мову. Пераклаў на рускую мову творы Я. Купалы, Я. Коласа, А. Куляшова, паэму «Тарас на Парнасе». Шэраг вершаў прысвяціў Беларусі. Двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1973 годзе.

**1903** год — аб'яўлена аб правядзенні першай веласігонкі «Тур дэ Франс» — аднаго з самых прэстыжных і папулярных спаборніцтваў нашых дзён.



**1955** год — прэзідэнт ЗША Дуайт Эйзенхаўэр правёў першую ў свеце тэлевізійную прэс-канферэнцыю. Хоць амерыканскія прэзідэнты адказвалі на пытанні журналістаў на прэс-канферэнцыях з 1913 года, першапачаткова падобныя мерапрыемствы былі «не для друку». Яны сталі адкрытыя для тэлебачання з 19 студзеня 1955 года, калі першую падобную прэс-канферэнцыю правёў у Белым доме прэзідэнт Дуайт Эйзенхаўэр. Менавіта ў гэты дзень ён упершыню дазволіў паказаць па тэлебачанні ў выпусках навін запісаную на плёнку прэс-канферэнцыю.

# УСМІХНЕМСЯ

Хітры ўрач пераканаў Анфісу Чэхаву, што флюараграфія робіцца менавіта на тэлефон.

**На прэзентацыі дзве сяброўкі:**

**— Зіна, а што гэта з тваім робіцца? Твар увесь чырвоны, вочы павылазілі...**

**— Ды зноў я, напэўна, з гальштукам перамудрыла...**

Адлічаны студэнт кожны дзень піша свайму дэкану з войска, што ён трапіў у спецназ і яго там вучаць забіваць.

**Дыялогі ў сеціве.**

**Размова ў адной анлайн-гульні:**

**— Вы не сказалі нам, што знаходзіцеся ў чорным спісе клана «Шэрыя Ваўкі». Чаму вас туды занеслі?**

**— Я главе клана матэматыку спісаць не даў.**

Навіны з Адэсы.

Роза Маркаўна вырашыла пераехаць да свайго зяцяпалкоўніка. Але па дарозе яе прызвалі ў армію...




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.



http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by



Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 302.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 18 студзеня 2018 года.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
19 студзеня 2018 г. № 3 (436)



стар. 2

Магчымасці інтэграцыі ў сістэме АПК



стар. 13

Тратуарная плітка... з адходаў



стар. 16

Заварваць! Нельга пакінуць

ТЭМА ТЫДНЯ

# НАС ПАГЛЫНАЕ ЎПАКОЎКА,

## або Пяць «але», якія перашкаджаюць кругавароту адходаў



**ГАРБАТА ў трох упакоўках, малако ў пластыкавай бутэльцы, сыр у плёнцы — скажыце, калі вы апошні раз прыходзілі з крамы без смецця? Упакоўка так паглынула нас, што мы кладзём у асобны пакет нават бананы і сыркі. А ці шмат людзей задумваюцца, куды потым трапляюць усе гэтыя адходы? Лічбы гавораць, што не. Уявіце, летась было сабрана 600 тыс. тон другаснай сыравіны, а гэта толькі 16 % ад агульнай колькасці смецця. Астатнія 3 млн тон проста адправіліся на палігон.**
**Але ёсць і добрая навіна: з кожным годам працэнт збору другаснай сыравіны расце, хоць і не вельмі хутка. Для параўнання: у 2012 годзе ён складаў 10 %. Што перашкаджае беларусам правільна сартаваць смецце і як вырашаюцца гэтыя праблемы, даведаўся карэспандэнт «Мясцовага самакіравання».**

Раздзельны збор і перапрацоўка адходаў — параўнальна новыя паняцці для нашай краіны. Яшчэ некалькі гадоў таму ўсё смецце згружалася ў адзін бак. Сёння ж беларусы паступова вучацца сартаваць усё, што ёсць у сметніцы, па чатырох кантэйнерах. Здаецца, няма нічога складанага ў тым, каб выкінуць пластык у жоўты кантэйнер, шкло — у сіні, паперу — у зялёны, а змешанае смецце — у шэры. Пасля чаго перапрацоўшчыкам застаецца забраць пэўны від адходаў, а вытворцам — зрабіць новыя рэчы з другаснай сыравіны. Аднак ёсць шмат «але», якія перашкаджаюць гэтаму кругавароту адходаў.

стар. 4

ПАЧАТАК ШЛЯХУ

# РАЗАМ МОЖНА БОЛЬШ

## Дэпутаты Магілёўскай вобласці пра тое, як працуе абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў

**Нядаўна ў Краснапольскім Цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі з'явіўся вельмі неабходны для выхаванцаў трэнажор «Міні-стэпер». Здавалася, нічога асаблівага — звычайнае прыстасаванне з педалькамі, якія дапамагаюць імітаваць звычайны крок. Але ён вельмі неабходны для дзяцей, у якіх праблемы з каардынацыяй руху. Прыстасаванне дае магчымасць змагацца з хваробай...**

### За кошт узносаў

Сертыфікат на суму 220 рублёў для набыцця трэнажора быў падораны падчас правядзення рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці» **старшынёй Краснапольскага райсавета дэпутатаў Анжалікай ГОМАН** ад імя Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Дырэктар Цэнтра Надзея Піванава вельмі ўдзячна гэтай арганізацыі за тое, што яна дала магчымасць палепшыць матэрыяльна-тэхнічную базу ўстановы. Такія трэнажоры неабходны хворым дзецям як паветра, але ў бюджэце грошай на ўсё не хапае.

Дарэчы, клопат народных абраннікаў напрыканцы мінулага года адчуў на сабе шэраг дзіцячых установ сістэм сацыяльнага абслугоўвання, адукацыі, аховы здароўя Магілёўшчыны.

За апошнія гады ў краіне шмат чаго зроблена, каб павысіць ролю органаў мясцовага кіравання ў вырашэнні надзённых пытанняў насельніцтва. Асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў — якраз адна з такіх формаў. Новая структура закліканая аб'яднаць народных абраннікаў усіх узроўняў, пачынаючы ад сельскага і заканчваючы абласным, у адзіную аўтарытэтную арганізацыю. У Магілёве яна была створана ў 2015 годзе, мясцовыя дэпутаты сталі ў гэтай справе другімі пасля гродзенскіх. Сёння ў рэспубліцы існуе толькі дзве такія асацыяцыі, хоць планавалася стварыць іх у кожнай вобласці, ініцыятарам у Магілёве стаў Анатоль Ісачанка, былы старшыня абласнога Савета дэпутатаў, цяпер — губернатар Мінскай вобласці.
Некаторыя сумняваліся ў жыццядзольнасці гэтага ўтварэння, але ж, нягледзячы на ўсё, яно існуе і нават мацнее.

стар. 15



Сертыфікат для абласнога кадэцкага вучылішча.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# ДАЛЁКІ, БЛІЗКІ НАМ ВОСТРАЎ

*Савет Рэспублікі наведала пасол Ісландыі*

**Перспектывы рэалізацыі сумесных адукацыйных праграм абмяркоўвалі ў Савеце Рэспублікі на сустрэчы старшыні верхняй палаты парламента Міхаіла МЯСНІКОВІЧА з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Ісландыі ў Расіі і Беларусі па сумяшчальніцтве Сігрыдур Берглінд АСГЕЙРСДОЦІР.**



На сустрэчы разглядаліся пытанні гандлёва-эканамічнага і міжпарламенцкага супрацоўніцтва дзвюх краін. Асаблівую ўвагу бакі надалі перспектывам пашырэння партнёрства ў сферы турызму, магчымасцям рэалізацыі сумесных адукацыйных праграм. У якасці перспектыўных напрамкаў узаемадзеяння пазначаны ІТ-тэхналогіі, гідраэнергетыка, экалогія.

Міхаіл Мясніковіч адзначыў важнае значэнне парламенцкага супрацоўніцтва для ўмацавання двухбаковых сувязяў і агучыў парламенцкай дэлегацыі Ісландыі запрашэнне наведаць з візітам Беларусь. У сваю чаргу пасол падзякавала за цёплы прыём і выказала ўпэўненасць у далейшым пашырэнні супрацоўніцтва Беларусі і Ісландыі.

# ЗАЙМЕЦЬ СВАЮ ВНУ

*З такой просьбай да Мар'яны Шчоткінай звярнуліся бабруйчане*

**Мар'яна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, правяла асабісты прыём грамадзян у Бабруйску. Падчас прыёму было зададзена шмат пытанняў як прыватнага, так і грамадскага значэння. Яны датычыліся працаўладкавання, назначэння пенсій, рамонту жылля і нават унясення змяненняў у заканадаўства. Таксама на прыёме мясцовыя жыхары прапанавалі адкрыць у Бабруйску вышэйшую навучальную ўстанову — па падтрымку ад выбаршчыкаў Бабруйскага раёна да віцэ-спікера верхняй палаты парламента звярнуўся дэпутат мясцовага райсавета Дзяніс Прышчэпа.**

Паводле яго слоў, пасля закрыцця ў 2017 годзе ў Бабруйску філіяла Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта (працаваў у горадзе 20 гадоў) жыхары раёна неаднаразова звярталіся да яго з просьбай аб стварэнні ў горадзе вышэйшай навучальнай установы або рэанімацыі філіяла БДЭУ. «На думку мясцовых жыхароў, такі буйны прамысловы і культурны цэнтр, як Бабруйск, павінен мець свой сучасны адукацыйны цэнтр, дзе моладзь магла б атрымліваць годную адукацыю. Гэта прыпыніла б адток таленавітых, адораных дзяцей з горада і раёна, да таго ж не ўсе бацькі здольныя сёння аплаціць вучобу і ўтрыманне дзяцей у іншым горадзе, а тым больш у Мінску», — выказаў меркаванне выбаршчыкаў Дзяніс Прышчэпа.

На думку Мар'яны Шчоткінай, закрыццё ў Бабруйску філіяла БДЭУ яшчэ не значыць, што бабруйчане пазбавіліся магчымасці атрымліваць адукацыю ў вышэйшых навучальных установах. «Не зусім правільна ўзнімаць пытанне, калі яно ўжо вырашана, прычым вырашана абгрунтавана, — заўважыла сенатар. — 95 % студэнтаў філіяла выказаліся за тое, каб вучыцца ў сталіцы, і туды пераехалі, дзе і ўзровень выкладання ў Бабруйску пакідаў жадаць лепшага».

Вядома, у горадзе шмат горадаўтваральных прадпрыемстваў рэспубліканскага значэння, якім патрэбныя высокакваліфікаваныя спецыялісты, і іх можна было б рыхтаваць на месцы. «Таму мы дамовіліся, што мясцовыя ўлады збяруць зацікаўленых, выпрацуюць прапановы, якім чынам яны гэта бачаць. Перш за ўсё, у горадзе павінен быць моцны прафесарска-выкладчыцкі склад, таму трэба стварыць умовы і яго прыцягнуць, каб гэтыя людзі жылі і працавалі ў Бабруйску. Таксама трэба вызначыцца, у якім кірунку працаваць, каб забяспечыць патрэбнасці горада ў спецыялістах», — лічыць Мар'яна Шчоткіна.

# РЫХТУЕМСЯ ДА ВЫБАРАЎ

*У Магілёўскім абласным Савеце дэпутатаў адбылася нарада*

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ правёў нараду ў Магілёўскім абласным Савеце дэпутатаў. Яе галоўнай тэмай стала пытанне правядзення выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў 28-га склікання, якія пройдуць ва ўсіх абласцях Беларусі 18 лютага. У Магілёўскай вобласці ўтворана 2556 выбарчых акруг.**

Таксама Уладзімір Панцюхоў наведаў Тэхналагічны парк «Магілёў» з мэтай падрыхтоўкі пасяджэння секцыі «Лічбавая эканоміка: супрацоўніцтва рэгіёнаў, стан і перспектывы», якое адбудзецца ў межах V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, што зладзяць напрыканцы верасня гэтага года.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

НАПЯРЭДАДНІ

# КАЛІ ЁСЦЬ ШТО ПАКАЗАЦЬ

**Пачалася афіцыйная падрыхтоўка да адной з ключавых падзей у жыцці Саюзнай дзяржавы**

**Пяты, юбілейны, Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі сёлета адбудзецца ў Магілёве. Чаму менавіта Магілёў? Па словах Міхаіла МЯСНІКОВІЧА, старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, гэта была ініцыятыва саміх магілёўчан, бо ім ёсць што паказаць. Акрамя таго, Магілёўская вобласць мяжуе са Смаленскай і Бранскай расійскімі абласцямі, супрацоўнічае з 24 рэгіёнамі Расіі. Удзельная вага экспарту гэтага рэгіёна ў Расію ў 2016-м склала 73 %!**

V Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які пройдзе 26—28 верасня, закране не толькі абласны цэнтр, але і ўсю вобласць. Гасцей прымуць, напрыклад, Горкі і Шклоў. Плануецца правесці цэлую серыю мерапрыемстваў, у якіх возьмуць удзел рэгіёны не толькі на ўзроўні абласцей, але і раёнаў, гарадоў.

**На палях Форуму таксама будзе працаваць Савет дзелавога супрацоўніцтва, у якім возьмуць удзел кіраўнікі ці прадстаўнікі ключавых прадпрыемстваў, што маюць зацікаўленасць у паглыбленні эканамічнага ўзаемадзеяння з Расіяй у сферах прамысловай, сельскагаспадарчай кааперацыі, рэалізацыі адукацыйных праектаў.**

Да таго ж пройдзе серыя маладзёжных, спартыўных, культурных мерапрыемстваў.

Плануецца, што гаспадарчыя суб'екты і рэгіёны заключаць на форуме новыя камерцыйныя кантракты і пагадненні. Падчас мінулых форумаў удзельнікі падпісвалі кантракты ў сярэднім на $250—300 мільёнаў. Чакаецца, што сёлета лічба вырасце да $400 мільёнаў.

Спікер верхняй палаты парламента таксама лічыць, што парламенцкае вымярэнне адыгрывае значную ролю ва ўніфікацыі і гарманізацыі заканадаўства нашых краін. І перш за ўсё гэта датычыцца прыняцця новых нарматыўных прававых актаў. Па-новаму павінны загучаць пытанні стварэння роўных умоў для суб'ектаў гаспадарання, забеспячэння роўных правоў грамадзян. Мяркуецца, што будуць агучаны прапановы, якія могуць быць разгледжаны як дапаўненні і змяненні ў дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы.

Па словах парламентарыя, важна, каб ідэі не толькі ляглі на паперу, але і былі ўзгоднены са структурамі Расіі. У гэтай справе спатрэбяцца дапамога і ўдзел Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы. Да гэтай работы і рэалізацыі пэўных праектаў мэтазгодна было б прыцягнуць і Еўразійскую эканамічную камісію, лічыць Міхаіл Мясніковіч.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# БЕЛАРУСЬ — РАСІЯ. АДЗІНАЯ АГРАРНАЯ ПАЛІТЫКА

**Беларуска-расійскае супрацоўніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі мае даўнія карані і вялікія перспектывы. За некалькі мінулых гадоў у рамках Саюзнай дзяржавы прынята нямала сумесных праграм. Напрыклад, усім вядомы праект па стварэнні трансгенных жывёл. Разам з тым магчымасці інтэграцыі ў сістэме АПК выкарыстоўваюцца далёка не цалкам.**



Пра гэта гаварылася на нарадзе ў рамках падрыхтоўкі да V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, якая прайшла пад кіраўніцтвам **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра ПАПКОВА.** У ёй прынялі ўдзел старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір Гусакоў, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід Заяц, старшыня канцэрна «Беллегпрам» Мікалай Яфімчык, кіраўнікі навукова-практычных цэнтраў НАН Беларусі.

На думку Аляксандра Папкова, першачарговая задача супрацоўніцтва Беларусі і Расіі на гэтым этапе — фарміраванне адзінай аграрнай палітыкі Саюзнай дзяржавы, якая мае на ўвазе: стварэнне агульнага рынку, гарантаванне харчовай бяспекі, арганізацыю міждзяржаўных кааперацыйна-інтэграцыйных структур у АПК, у тым ліку сумеснага кластара (холдынга) па вытворчасці і перапрацоўцы лёну-даўгунцу.

Аналіз вынікаў правядзення форумаў рэгіёнаў Беларусі і Расіі мінулых гадоў паказвае станоўчую дынаміку росту міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. На першых трох форумах заключана 62 пагадненні аб супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі, на чацвёртым — ужо 77.

**Разам з тым удзельнікі нарады адзначылі, што ў практычнай рэалізацыі сумесных міждзяржаўных праектаў існуюць некаторыя праблемы. Калі паміж акадэміямі навук Беларусі і Расіі ёсць поўнае паразуменне, то на ўзроўні міністэрстваў сельскай гаспадаркі з расійскага боку часам прысутнічае нежаданне рабіць канкрэтныя крокі па рэалізацыі падпісаных пагадненняў.**

А менавіта сельскагаспадарчая галіна мае найбольшыя перспектывы ў развіцці ўзаемавыгаднага расійска-беларускага супрацоўніцтва. Спецыялісты і навукоўцы сцвярджаюць, што будучыня — за буйнымі інтэграванымі структурамі па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў харчавання. Аб'яднаўшы намаганні, расійскія і беларускія аграры могуць перамагчы любую канкурэнцыю на сусветных рынках. Але для гэтага неабходны практычныя крокі.

З мэтай атрымання выніковасці дасягнутых пагадненняў у рамках Саюзнай дзяржавы і прыняцця канкрэтных крокаў па стварэнні адзінай аграрнай палітыкі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні прапанаваў арганізаваць сумесныя калегіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Расійскай акадэміі навук, а таксама Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь і Міністэрства сельскай гаспадаркі Расійскай Федэрацыі.

Плануецца, што ў рамках V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі Пастаяннай камісіяй Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні будзе падрыхтавана пасяджэнне секцыі на тэму «Аграрная палітыка Саюзнай дзяржавы: вопыт, праблемы, перспектывы». На базе Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках з удзелам навукова-практычных цэнтраў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі будуць абмяркоўвацца не толькі праблемы стварэння сумесных вытворчасцяў, але і ў цэлым перспектывы развіцця сельскіх тэрыторый. Вучоныя Беларусі і Расіі, а таксама спецыялісты аграрнага профілю азнаёмяцца з найлепшым вопытам сельскагаспадарчай вытворчасці на аснове генетычных і біятэхналагічных інавацый. Немалую цікавасць удзельнікаў і гасцей форуму павінна выклікаць і праблематыка, звязаная з развіццём лічбавай эканомікі ў сістэме аграпрамысловага комплексу.

Перспектывы ў саюзнай інтэграцыі ёсць: у цяперашні момант прамыя гандлёва-эканамічныя адносіны беларускіх рэгіёнаў падтрымліваюцца з 80 рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі, у тым ліку больш чым з 60 — на падставе заключаных пагадненняў аб доўгатэрміновым супрацоўніцтве.

**Наталля БІТЭЛЬ.**

# АРЫЕНТАЦЫЯ — НА ПРАМЫСЛОВЫ ВЫНІК

## Міхаіл МЯСНІКОВІЧ аб развіцці бізнесу, навукі і ЖКГ

**Калі завяршаецца год, прынята падводзіць вынікі — палітычныя, эканамічныя, навуковыя. Аб значных падзеях 2017-га і важных задачах на бягучы год у інтэрв'ю БЕЛТА расказаў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.**

**— Міхаіл Уладзіміравіч, 2017 год для Беларусі без перабольшання можна назваць прарыўным. Прэзідэнт падпісаў адразу два найважнейшыя дакументы: дэкрэт аб развіцці прадпрымальніцтва і дэкрэт аб лічбавай эканоміцы. Якія задачы ў сувязі з гэтым стаяць перад парламентарыямі шостага склікання на чацвёртую сесію ў частцы мадэрнізацыі заканадаўства?**

— Паляпшэнне ўмоў для вядзення бізнесу прадугледжана Дэкрэтам № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва» і шэрагам іншых нарматыўных прававых актаў. Парламент чакае сур'ёзная праца па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у законы Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі, а таксама іншымі дакументамі і даручэннямі кіраўніка дзяржавы. У першую чаргу гэта кодэксы Рэспублікі Беларусь. Таксама трэба будзе прыняць Кодэкс аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці. Карэкціроўцы падлягаюць і некаторыя іншыя законы. У цэлым жа для рэалізацыі даручэнняў, якія ўтрымліваюцца ў названых дэкрэтах, і даручэнняў Прэзідэнта Беларусі, змяненняў і дапаўненняў патрабуюць каля трох дзясяткаў заканадаўчых актаў.

> Эфект ад падпісаных дэкрэтаў будзе важкі і, самае галоўнае, адчувальны для нашай эканомікі, у цэлым для кожнага беларуса.

З падпісаннем Дэкрэта «Аб развіцці лічбавай эканомікі» Беларусь становіцца ў IT-сферы свайго роду аналагам Сінгапура, які адыгрывае вялікую ролю ў глабальных фінансах. Ствараюцца беспрэцэдэнтныя ўмовы для развіцця IT-індустрыі, прыцягнення ў нашу краіну найбуйнейшых міжнародных карпарацый. Мы разлічваем на фарміраванне трывалага даверу нашых патэнцыйных партнёраў, значны рост іх цікавасці да работы ў Беларусі.


Фота БЕЛТА.

Упэўнены, што эфект ад падпісаных дэкрэтаў будзе важкі і, самае галоўнае, адчувальны для нашай эканомікі, у цэлым для кожнага беларуса. Бо пашырэнне спектру і аб'ёмаў работ у IT-сферы — гэта дадатковая валютная выручка, новыя высокаінтэлектуальныя працоўныя месцы з высокай дабаўленай вартасцю, развіццё сферы паслуг з нізкай матэрыяла- і энергаёмістасцю.

Лічбавізацыя накіравана на ўсе сферы нашай дзейнасці: прамысловасць, банкаўскі сектар, медыцыну, адукацыю, навуку і іншыя. Цяпер усё часцей кажуць аб ужыванні тэхналогіі «блокчэйн». Не выключана, што ў сярэднетэрміновай перспектыве яе можна будзе выкарыстоўваць і ў заканадаўстве. На першым этапе — для аўтаматычнага аналізу заканадаўчай базы і выключэння дубліравання асобных нормаў, а ў далейшым — для таго, каб аўтаматызаваць і сам працэс выканання законаў. Такія падыходы сёння актыўна абмяркоўваюць не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах, напрыклад у Расіі. Гаворка ідзе аб выкананні нормаў заканадаўства без умяшання чалавека, аўтаматычна — з дапамогай спецыфічных смарт- і іншых «разумных» кантрактаў. Усё гэта значна спросціць работу з законамі, зробіць гэты працэс адкрытым і празрыстым. Пры гэтым мінімізуюцца чалавечы фактар, злоўжыванні і г. д. Пакуль гэта яшчэ ідэі, над якімі неабходна сур'ёзна працаваць і не ўпадаць у ілюзію, што ўсё ўжо вырашана і заўтра будзе «светлая будучыня». Тут неабходна велізарная мэтанакіраваная і шмат у чым невядомая работа.

**— У Беларусі на II з'ездзе вучоных абмяркоўвалася стратэгія развіцця навукі і тэхналогій да 2040 года. Як вы ацэньваеце магчымасці павышэння ролі беларускай навукі для эканомікі і грамадства з улікам таго, што раней кіравалі Нацыянальнай акадэміяй навук?**

— Я глыбока перакананы ў тым, што беларускія навукоўцы здольныя генерыраваць прарыўныя праекты з адчувальным эканамічным эфектам. Для гэтага Беларусь валодае неабходным кадравым патэнцыялам. У нас паспяхова развіваюцца ўласныя навуковыя школы на чале з вопытнымі, таленавітымі кіраўнікамі, праца якіх захапляе і маладых даследчыкаў. Распрацоўцы перспектыўных праектаў спрыяе і абноўленая структура Нацыянальнай акадэміі навук, у якой былі створаны і ўжо адбыліся сучасныя навукова-практычныя цэнтры і кластары, якія аб'ядналі навуку і вытворчасць.

Сёння важна сканцэнтраваць намаганні на разумнай пастаноўцы канкрэтных навуковых задач невялікага ліку прыярытэтаў, дзе ёсць навуковы патэнцыял, адпаведныя напрацоўкі і вопытныя вытворчасці. Мне ўяўляюцца такімі нана- і біятэхналогіі, хімічныя, касмічныя тэхналогіі і іншыя. Неабходны сур'ёзны маніторынг таго, што робіць у згаданых сферах калегі ў замежных краінах, трэба ўмела адаптаваць і пераймаць усё найлепшае, што зроблена замежнікамі. Распрацоўка і вытворчасць — важная справа, але галоўнае — эфектыўныя продажы. Свет сёння нічым ужо асабліва не здзівіш, але нішы ёсць, і трэба замацоўвацца на гэтых рынках за кошт навізны, якасці і выгадных цэн.

Галоўным у працы кожнага навукоўца павінна быць арыентацыя на вынік навуковы, прамысловы. Гэтага патрабуе ад акадэмічнай, галіновай і ўніверсітэцкай навукі наш Прэзідэнт Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. Гэта правільны падыход.

Задача парламентарыяў — садзейнічаць фарміраванню нарматыўнай прававой базы, якая комплексна рэгулюе адносіны, што ўзнікаюць пры ажыццяўленні навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці. Гэтыя пытанні цесна ўзаемазвязаны з развіццём адукацыі, умацаваннем яе ўзаемадзеяння з вытворчасцю.

На парадку дня — далейшая праца па ўдасканаленні механізмаў фінансавання навуковых праектаў, больш актыўнага выкарыстання магчымасцяў рэспубліканскага і мясцовых інавацыйных фондаў, уваходжанне ў буйныя транснацыянальныя навуковыя праекты і іншае.

Падчас грамадскага абмеркавання праекта стратэгіі развіцця навукі і тэхналогій Беларусі да 2040 года і на II З'ездзе вучоных было агучана шмат смелых і цікавых ідэй па ўдасканаленні навуковай сферы, павышэнні прэстыжу вучонага ў грамадстве. Усе гэтыя прапановы сабраны і абагульнены міжведамаснай рабочай групай, кіраўніком якой я быў прызначаны. Многія ідэі цяпер прапрацоўваюцца.

**— Закрываючы трэцюю сесію, вы арыентавалі сенатараў на ўсебаковую дапамогу звычайным людзям. Традыцыйна пытанні па рабоце жыллёва-камунальнай гаспадаркі — у ліку самых частых і набалелых. Якое ваша бачанне іх вырашэння?**

— Сапраўды, у большасці галін жыллёва-камунальнай гаспадаркі захоўваецца шэраг праблемных пытанняў, і вырашаюцца яны павольна. Менавіта гэтая тэма была прадметам сур'ёзнага разгляду на рэспубліканскім семінары, які прайшоў у кастрычніку 2017 года пад кіраўніцтвам Прэзідэнта краіны. Падрыхтаваны шэраг праектаў прававых актаў, якія накіраваны на ўдасканаленне работы галіны, у тым ліку распрацоўваецца новая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса.

На сумесным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі і Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі прыняты шэраг канкрэтных рашэнняў па ўдасканаленні прававых, арганізацыйных і эканамічных асноў развіцця і дзейнасці жыллёва-камунальнай гаспадаркі, якія мы перадалі ўраду.

Вывучэнне пытанняў ЖКГ у Савеце Рэспублікі выявіла цэлы шэраг і іншых задач, якія патрабуюць вырашэння. Гэта ў першую чаргу водная гаспадарка і капітальны рамонт жылога фонду. Тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі, безумоўна, справа важная, але па іх ёсць рашэнні кіраўніка дзяржавы. Што датычыцца воднай гаспадаркі, то, лічу, што прэсная вада — гэта наш велізарны нацыянальны здабытак. Як і лясныя рэсурсы, і калійныя солі. Ёй трэба ўдзяляць больш увагі. У апошнія гады па гэтых праблемах сур'ёзных навуковых даследаванняў не вядзецца, няма адзінай сістэмы кіравання. Праз гэта шмат у чым пачасціліся факты нерацыянальнага водакарыстання, забруджвання ваданосных гарызонтаў, прымітыўнага воднага рэгулявання. Не варта ў адрыве ад гэтых пытанняў разглядаць меліярацыю і гідраэнергетыку. Яшчэ нядаўна, каб зрабіць свідравіну на ваду, трэба было прадставіць сур'ёзныя абгрунтаванні, заключэнне спецыялістаў, атрымаць неабходныя дазволы. Чаму? Не толькі таму, што змяншаюцца запасы. Галоўнае — каб забруджванне не патрапіла ў падземныя крыніцы.

Дзяржрэгуляванне, вядзенне і маніторынг балансаў водных рэсурсаў, навукова-тэхнічную водную палітыку мэтазгодна праводзіць з адзінага рэспубліканскага цэнтра. На маю думку, у Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя павінен быць такі навукова-практычны цэнтр воднай гаспадаркі.

> Свет сёння нічым ужо асабліва не здзівіш, але нішы ёсць, і трэба замацоўвацца на гэтых рынках за кошт навізны, якасці і выгадных цэн.

Капітальны рамонт жыллёвага фонду — найважнейшая дзяржаўная задача. Пакуль сітуацыя некрытычная, таму што жыллё адносна новае. Але што будзе заўтра? Прэзідэнт краіны на семінары па пытаннях ЖКГ выразна паставіў задачу па замене і рамонце ліфтаў. Такой жа ўвагі патрабуюць інжынерныя сістэмы і апорныя канструкцыі жылых дамоў. Пабяліць, пафарбаваць — у нас праблемы няма. А вось сур'ёзнымі інжынернымі справамі Мінжылкамгасу трэба займацца больш прадметна. Прапановы па капітальным рамонце жылля Саветам Рэспублікі ва ўрад накіраваны.

ПАСЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ «МС»

# СПАЧАТКУ ПРАГРАМА, ПОТЫМ ДАРОГА

**У № 43 «Мясцовага самакіравання» выйшаў артыкул «Тры кіламетры шэсцьсот метраў». У ім гаварылася, што дарога, якая злучае вёску Гарадзечна Пружанскага раёна з трасай Пружаны—Брэст, можа паслужыць своеасаблівым імпульсам для развіцця ўказанай вёскі. Вядома, у тым выпадку, калі трохкіламетровы ўчастак дарогі будзе заасфальтаваны.**

За гэта даўно змагаюцца і мясцовая ўлада, і грамадскасць населенага пункта. Вёска мае адносна новыя жылыя кварталы, тут узведзены сучасны жывёлагадоўчы комплекс, на тэрыторыі маюцца розныя сацыяльныя і вытворчыя аб'екты. Акрамя таго, Гарадзечна ганарыцца сваёй багатай гісторыяй. Толькі вось развіццю прыватнай ініцыятывы, на думку мясцовых жыхароў, і нават замацаванню маладых спецыялістаў зусім не спрыяе тутэйшая дарога. Куды толькі не звярталіся вяскоўцы са сваёй праблемай! З усімі прэтэндэнтамі на дэпутацкія месцы яны пачынаюць сустрэчу менавіта з дарожнага пытання.

Але час ідзе, нічога, на жаль, не мяняецца. Нядаўна, калі праблема стану мясцовых дарог чарговы раз была абазначана на самым высокім узроўні, у гарадзечанцаў зноў з'явілася надзея...

*Рэдакцыя атрымала адказ з камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Брэстаблдарбуд». «Гравійны ўчастак указанай аўтамабільнай дарогі працягласцю 3,395 км ад аўтамабільнай дарогі Р-85 Слонім—Высокае да вёскі Гарадзечна Пружанскага раёна знаходзіцца на абслугоўванні Пружанскага ДРБУ № 140. Па меры неабходнасці з улікам умоў надвор'я названым ДРБУ праводзіцца яго рамонтнае прафіляванне, — гаворыцца ў пісьмовым адказе* ***генеральнага дырэктара Сяргея ДЗЯМКО.*** *— У цяперашні час рэалізуецца Дзяржаўная праграма па развіцці і ўтрыманні аўтамабільных дарог у Рэспубліцы Беларусь на 2017—2020 гады (далей — праграма), зацверджаная Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 18.09.2017 года № 699. У зацверджаным варыянце праграмы аўтамабільная дарога Н-543, пра ўчастак якой ідзе гаворка, адсутнічае.*

*Карэкціроўка аб'ектаў праграмы ўваходзіць у кампетэнцыю Міністэрства транспарту і камунікацый з унясеннем адпаведных змен ва ўказаную пастанову Савета Міністраў.*

*У выпадку ўключэння аб'екта аўтамабільная дарога Н-543 Гарадзечна—Харкі—Жабін у праграму 2018—2020 гадоў КУП «Брэстаблдарбуд» выканае ўвесь неабходны комплекс запланаваных дарожных работ».*

# НАС ПАГЛЫНАЕ ЎПАКОЎКА...



## Усё яшчэ нізкая дасведчанасць насельніцтва

Ужо, мабыць, не засталося выдання, якое б не пісала пра важнасць сартавання смецця. Пра гэта гавораць па тэлебачанні і радыё. А два гады таму дзяржаўнай установай «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» быў запушчаны праект «Мэта-99». І сёння ўсім вядомыя яноты распавядаюць беларусам, навошта сартаваць смецце і як правільна гэта рабіць.

— У нашай краіне больш за 100 ліній сарціроўкі, з іх 37 уведзены ў эксплуатацыю пры фінансавай падтрымцы «Аператара другасных матэрыяльных рэсурсаў», — расказвае **галоўны спецыяліст па інфармацыйнай рабоце ўстановы Ніна КУЛЬБЕДА.** — Таксама ў нас функцыянуюць 13 перапрацоўшчыкаў паперы і кардону, 8 — шкла, 9 — зношаных шын і каля 100 — пластмас. Кожны з перапрацоўшчыкаў спецыялізуецца на пэўным тыпе сыравіны (асабліва гэта датычыцца пластыка). Таму яны супрацоўнічаюць з лініямі сарціроўкі — пастаўшчыкамі неабходных другасных рэсурсаў.

Атрымліваецца, перапрацоўваць сыравіну ёсць каму, праблема ў іншым. Шмат беларусаў да гэтага часу не разумеюць, навошта ім сартаваць смецце? Маўляў, навошта я буду выконваць чужую працу?

Установа «Цэнтр экалагічных рашэнняў» правяла даследаванне пад назвай «Развіццё экалагічнай дружалюбнасці ў Беларусі ў 1990—2015 гадах». Яго вынікі сведчаць аб тым, што толькі 29 % апытаных беларусаў сартуюць адходы, 49 % кожны раз бяруць новы поліэтыленавы пакет у краме, 22 % аддаюць перавагу аднаразовым таварам. Адсюль выцякае і наступная праблема.

## Адсутнасць матывацыі

Здаецца, большая частка нашых грамадзян думае, што сартаваць смецце за іх павінен нехта іншы. У той час як у многіх еўрапейскіх краінах людзі яшчэ і плацяць за збор другаснай сыравіны. Мабыць, у Беларусі трэба ісці гэтым жа шляхам? Пакуль такія меры не прадугледжаны, але матываваць нашых людзей плануецца.

— Асноўныя шляхі развіцця сістэмы абыходжання з другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі (ДМР) на найбліжэйшыя гады вызначаны ў Нацыянальнай стратэгіі па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі ў Беларусі на перыяд да 2035 года. Яна прадугледжвае не толькі паляпшэнне якасці збору адходаў, але і пошук іх альтэрнатыўнага прымянення. Так, плануецца ўкараніць залогавую сістэму збору бутэлек з-пад напояў і тэхналогіі кампаставання арганікі, а таксама выкарыстоўваць энергетычны патэнцыял адходаў, гэта значыць атрымліваць з іх паліва, — падзялілася **начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Вольга САЗОНАВА.**

## Недахоп кантэйнераў і неналаджаны збор

Самае страшнае для чалавека, які старанна сартуе адходы, убачыць, як іх... згружаюць у адзін бак. Ці застанецца пасля такога жаданне працягваць сартаванне? Але змешваць адходы з рознакаляровых бакаў — не парушэнне.

> Сёння схадзіць у краму і не прынесці адтуль смецце — амаль немагчыма. Нават калі свядома захочаш узяць нешта без пакета, табе «клапатліва» дадуць яго на касе.

— На жаль, такое практыкуецца ў Мінску і аргументуецца зніжэннем выдаткаў на транспарціроўку. Мы спадзяёмся, што хутка гэты пункт будзе перагледжаны, — падкрэсліла Ніна Кульбеда. — У абласных і раённых цэнтрах, дарэчы, такой праблемы няма.

**Дырэктар магілёўскага ўнітарнага прадпрыемства «РэПлас-М» Дзяніс КАТОЛІКАЎ** лічыць: наша сістэма збору другаснай сыравіны толькі адпужвае людзей ад сартавання смецця.

— На мой погляд, выкідваць усё, што падобна на пластык, у жоўты кантэйнер, згружаць смецце з трох бакаў у адну машыну, а затым сартаваць яго — гэта няправільна, —



сказаў спецыяліст. — Па-першае, калі чалавек бачыць, што ў кантэйнеры для пластыку толькі бутэлькі, пытанняў не ўзнікае. Але калі там поўна іншага смецця, то туды аўтаматычна выкідваецца ўсё агулам. Па-другое, людзі перастаюць сартаваць смецце, калі бачаць, што потым усё грузіцца ў адну машыну. Бо не ўсе ведаюць пра лініі сарціроўкі. І па-трэцяе, такі працэс, безумоўна, псуе якасць сыравіны. Выхад: трэба прывучаць людзей якасна сартаваць смецце. Пажадана — з самага дзяцінства.

Сапраўды, у Мінску (дзе смецце згружаюць у адзін бак) летась быў самы нізкі працэнт збору пластыку сярод абласных цэнтраў.

— У сталіцы здаюць на перапрацоўку ўсяго толькі 15—20 % ПЭТ-бутэлек, у той час як у Магілёве, Брэсце і іншых гарадах — да 70 %, — падкрэсліў Дзяніс Католікаў. — Колькі ў месяц збіраюць з усёй краіны, столькі ж у месяц у Мінску закопваецца ў зямлю. Зразумела, беларускім прадпрыемствам сыравіны не хапае.

Аднак ёсць яшчэ праблема — часта смецце і хочацца сартаваць, але няма куды. Да дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» нярэдка паступаюць скаргі на адсутнасць кантэйнераў для паасобнага збору смецця ці няправільнае іх ужыванне. Спецыялісты ўстановы не ўтойваюць: сапраўды, кантэйнераў не хапае. Каб забяспечыць усе двары па Беларусі, іх патрэбна ў два разы больш. Павялічыць колькасць кантэйнераў плануецца ў наступным годзе.

— Не трэба забываць і пра пункты прыёму, якія ёсць у кожным горадзе. Як паказвае статыстыка, людзі здаюць туды, напрыклад, макулатуру часцей, чым выкідваюць у кантэйнеры. Таксама паперу збіраюць у школах, на прадпрыемствах, — адзначыла Ніна Кульбеда.

## «Хітрая» ўпакоўка

На УП «Экарэс» са змешаных адходаў, сабраных з трох кантэйнераў, уручную дастаюць паперу, кардон, празрыстыя і рознакаляровыя пластыкавыя бутэлькі (ПЭТ), бутэлькі ад мыйных сродкаў і касметыкі, белыя бутэлькі ад малака, упакоўкі Tetra Pak, поліэтыленавыя пакеты, алюмініевыя банкі, плёнку і шкло. Астатняе смецце вывозяць на палігон.

— Цяпер ужываецца вельмі шмат самых розных відаў упакоўкі. Часта нават спецыялісту цяжка вызначыць, з якога матэрыялу яна зроблена. Менавіта таму мы раім выкідваць усе адходы і вырабы, якія візуальна складаюцца з пластыку, у жоўты кантэйнер, — расказала Ніна Кульбеда.

Дзейнічаць па такім жа прынцыпе раяць і ў Цэнтры экалагічных рашэнняў, супрацоўнікі якога распрацавалі «Зялёную карту» (на ёй адзначаны пункты прыёму адходаў), а таксама спецыяльныя брашуры «Як правільна сартаваць смецце». Аднак варта разумець, што не ўсе «можна», прапісаныя ў брашуры, стапрацэнтна трапяць на перапрацоўку. Так, напрыклад, маркіроўка «PP» або «5» у трохвугольніку можа быць як на бутэльцы ад малака, так і на абгортцы ад шакаладнага батончыка.

— Упакоўка ад макаронаў, шакаладак наўрад ці трапіць на перапрацоўку, паколькі яе вельмі складана распазнаць на сартавальнай лініі. Спецыяльна глядзець маркіроўку на канвеернай стужцы ніхто не будзе, — адзначыла **супрацоўнік Цэнтра экалагічных рашэнняў Наталля БЛЫШЧЫК.** — Але цяпер у Гродне пачалі збіраць такую ўпакоўку і вырабляць з яе тратуарную плітку, таму ёсць сэнс выкідваць яе ў жоўты кантэйнер.

## Адсутнасць альтэрнатывы

На жаль, сёння схадзіць у краму і не прынесці адтуль смецце — амаль немагчыма. Нават калі свядома захочаш узяць нешта без пакета, табе «клапатліва» дадуць яго на касе. Адзінае выйсце — часцей купляць прадукты на рынках, куды можна прынесці сваю тару, таксама старацца не пакупаць лішняга — сартаваць адходы ў прылаўка крамы.

— Перапрацоўка ў большай ступені змагаецца з наступствамі празмернага спажывання, — лічыць **Марыя СУМА, супрацоўнік Цэнтра экалагічных рашэнняў, кіраўнік праекта «Зялёная карта».** — Па сутнасці, перапрацоўшчыкі спрабуюць ліквідаваць праблемы, якія ўзніклі праз адсутнасць выбару больш экалагічнага варыянту паслугі або тавару. Але калі ўдумліва ставіцца да таго, што набывае кожны з нас, хутчэй за ўсё, перапрацоўваць прыйшлося б значна менш.

**Кацярына ЦІТОВА.**

## Што нам з гэтым рабіць?

Зразумела, сартаваць смецце. І не спадзявацца, што за нас гэта зробіць нехта іншы. Вядома, сёння ў краіне робіцца ўсё магчымае для таго, каб як мага менш адходаў трапіла на звалкі. Але зрабіць Беларусь краінай, свабоднай ад смецця, мы можам толькі ўсе разам. Таму не ігнаруйце рознакаляровыя кантэйнеры. А калі іх у вас няма, не хваліцеся — адходы паперы, кардону, пластмасы, шкла можна аднесці ў прыёмна-нарыхтоўчыя пункты, іх адрасы шукайце на сайтах (http://www.target99.by, http://greenmap.by). У сельскай мясцовасці людзі могуць звяртацца ў арганізацыі ЖКГ — як правіла, на іх базе ёсць прыёмныя пункты.



*Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».*


**Управляющий объявляет о проведении торгов по продаже имущества ОАО «Ветковская хлопкопрядильная фабрика». Торги проводятся в форме открытого аукциона. Торги состоятся 20 февраля 2018 года в 11.00 по адресу: Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 38**

| № лота | Наименование объекта, краткая характеристика объекта (лота) | Начальная цена продажи, руб. (цена с учетом НДС) | Задаток, руб. | Шаг аукциона, % | Затраты на подготовку документации |
|---|---|---|---|---|---|
| лот № 127 | Кран-балка ручная подвесная, инв. № 707 | 633,60 | 63,36 | 5 | **96,60** |
| лот № 128 | FIBROTEST электрический, инв. № 2020 | 91 594,80 | 9 159,48 | 5 | **96,62** |
| лот № 129 | Измерительный прибор для верхних валиков, инв. № 52 | 11 005,20 | 1 100,52 | 5 | **96,60** |
| лот № 130 | Регулятор воздуха, инв. № 5404 | 14,40 | 1,44 | 5 | **96,60** |
| лот № 131 | Регулятор воздуха, инв. № 5405 | 14,40 | 1,44 | 5 | **96,60** |
| лот № 132 | Установка компрессорная, инв. №4052 | 12 669,60 | 1 266,96 | 5 | **96,61** |
| лот № 133 | Микроскоп биологический МБА ТУ РБ, инв. № 89 | 1 068,00 | 106,80 | 5 | **96,60** |
| лот № 134 | Ручной прибор для определения содер. влаги, инв. № 2022 | 618,00 | 61,80 | 5 | **96,60** |
| лот № 135 | Тахометр часовой ТЧ10-Р, инв. № 90 | 312,00 | 31,20 | 5 | **96,60** |
| лот № 136 | Горизонтально-фрезерный станок, инв. № 883 | 384,00 | 38,40 | 5 | **96,60** |
| лот № 137 | Весы ВАР-200, инв. № 895 Б | 462,00 | 46,20 | 5 | **96,60** |

Имущество расположено по адресу: Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 38.

Со всей информацией по проведению аукциона можно ознакомиться на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве: **https://bankrot.gov.by/ManagerSection/ManagerMessages.aspx**

С дополнительной информацией о торгах можно ознакомиться по адресу: Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 38, тел.: 8 (02330) 2-11-06, 2-12-03. Выходные дни: суббота, воскресенье

# Валерыя АРЛАНАВА: «Часам быць дрэннай дзяўчынкай нашмат цікавей, чым ідэальнай»



**Валерыя — адна з самых запатрабаваных беларускіх актрыс. Прадстаўніцу тэатра-студыі кінаакцёра ў свае карціны запрашаюць не толькі беларускія рэжысёры. Актыўна яна здымаецца і ў расійскіх фільмах і серыялах. Аб тонкасцях акцёрскага майстэрства, узаемадзеянні з рэжысёрамі, сярод якіх і знакаміты Аляксандр Яфрэмаў, які дарэчы, з'яўляецца мужам актрысы, аб прафесійным поспеху і простым шчасці мы пагутарылі з Валерыяй.**

***— Вы вярнуліся з Масквы, дзе прадстаўлялі спектакль «Пігмаліён»...***

— Так, ігралі яго ў Культурным цэнтры пасольства Беларусі, нас цёпла прымалі. Як падмеціў рэжысёр-дакументаліст Сяргей Кацьер, «Пігмаліён» для тэатра-студыі кінаакцёра ў нейкай ступені візітоўка, як «Паўлінка» для купалаўцаў. Насамрэч мы не збалаваныя гастролямі, я, дарэчы, упершыню выступала ў Маскве. У «Пігмаліёне» іграю амаль 17 гадоў. І, вядома, псіхалагічна складана выходзіць на сцэну з пачуццём навізны, калі спектакль ідзе некалькі разоў у месяц на працягу амаль двух дзесяцігоддзяў.

***— З вашых роляў у тэатры якая вам бліжэй?***

— Усе свае ролі я не проста так іграю. І кожнай магу ганарыцца, бо ў іх укладзена па-максімуме: прыдумана мной ці ўзята з жыцця, падгледжана, падслухана. Яны жывыя, складаюцца з многіх рэчаў, каштоўныя для мяне. Напрыклад, у спектаклі «Вельмі простая гісторыя» я іграю Свінню, але гэта ж не значыць, што ў жыцці я свіння. Я ж іграю не знешнюю абалонку, а ўнутраную сутнасць. І я лічу, што маёй існасці блізкая гэта роля.

***— Ёсць ролі, дзеля якіх прыходзілася пераадольваць, ламаць сябе?***

— У кіно такое бывае. Гэта не я, а мяне бяруць на ролю, і прыходзіцца іграць. Я стараюся неяк выйсці са становішча, прыдумаць нешта цікавае, каб гэта стала маім. Сутнасць акцёрскай прафесіі — прысвоіць, зрабіць сваім. Тая ж Эліза ў «Пігмаліёне» — мая Эліза. Іншая актрыса сыграе — гэта будзе яе Эліза. З гадамі я па-іншаму працаваць стала. Ёсць такі выраз: «Чым далей ад мастака, тым вышэй твор мастацтва». Не абавязкова сябе эксплуатаваць увесь час . У нашых акцёраў часам роля — гэта вынік нялёгкага асабістага жыцця. У Галівудзе найчасцей проста ствараюць вобраз, іграюць характар. Гэта ж таксама вялікае майстэрства.

***— Што па-вашаму самае складанае ў акцёрскай прафесіі?***

— У тэатры, як я ўжо казала, мне няпроста захоўваць пачуццё навізны, іграючы спектаклі гадамі. І яшчэ ёсць невялікая складанасць, дакладней, асаблівасць нашай прафесіі — намацаць характар, адчуць, хто гэты персанаж. Бывае, рэпеціруеш-рэпеціруеш, а ён не нараджаецца і ўсё. Вось зараз мы здалі прэм'еры спектакль «Ваўкі і авечкі», я вельмі люблю сваю ролю — Глафіры. Але літаральна на апошнім спектаклі зразумела, што нарэшце з'яўляецца яна, мая Глафіра. Да гэтага я іграла нешта з убачанага, падслуханага, прыдуманага, зробленага з рэжысёрам. А тут раптам адчуваю, што яна пачынае мной кіраваць. І гэта ўжо яна, Глафіра, пачынае хадзіць па сцэне.

**«Напэўна, адчуванне таго, што я магу жыць і без дасягненняў, і ёсць маё самае вялікае дасягненне на сёння».**

У кіно асабіста для мяне самая вялікая складанасць — гэта ранні пад'ём і напружаны графік работы. Прачнуцца а чацвёртай раніцы, у шэсць быць на пляцоўцы свежанькай, і да ночы працаваць — з дзесяццю зменамі касцюма, грыма, прычоскі, на холадзе, без выгод. Доўгі час «захоўваць стан» — плакаць ці смяяцца, і чакаць, пакуль паклічуць у кадр. Літаральна на днях дазнялі фільм «Фламінга». Роля камедыйная, нават трагікамедыйная, мне падабаецца, нарадзілася для мяне лёгка. Я іграю дырэктарку клуба, жанчыну, пакінутую чарговым кавалерам. Калі мне зрабілі прычоску, макіяж, я зразумела, што чымсьці падобная да Маргарэт Тэтчэр. Нават папрасіла мастака карціны зрабіць мне яе партрэт і паставіць у кабінет. Некаторыя, праўда, думалі, што гэта партрэт маёй мамы... На здымках было фізічна няпроста: здымалі на холадзе. Уявіце, як выглядае актрыса, апранутая ў некалькі слаёў адзення ды яшчэ абвешаная гукавым абсталяваннем. Пры гэтым у кадры выглядаць трэба стройнай і вытанчанай.

***— Вернемся да тэатра... Як настройваеце сябе перад спектаклем?***

— Я вяду закрытае, ціхае жыццё. Не хаджу ў рэстараны, на тусоўкі — нікуды. Усё маё жыццё — назапашванне энергіі і падрыхтоўка да таго, каб выйсці на сцэну. Спецыяльна не рыхтуюся, ніколі ў жыцці не паўтараю тэкст перад спектаклем, нават калі не іграла ў ім паўгода. Проста трэба крыху адзіноты, надзець касцюм, паглядзець на сябе...

***— Пасля спектакля лёгка прыходзіце ў сябе?***

— Так. Я адразу эмацыянальна выключаюся. Але фізічна на наступны дзень складана, раніцай устаць надзвычай цяжка... На сцэну акцёр выходзіць адкрыты, таму ў яго трапляе ўсё — і добрае, і дрэннае. Чужая энергетыка вымотвае. Людзі ж усе розныя.

***— Настолькі адчувальная энергетыка залы?***

— Канешне. Кожнага гледача! На цябе глядзяць тры гадзіны, цябе ацэньваюць, разам з табой перажываюць, думаюць. Мне здаецца, я нават ведаю, хто што думае. Вось сядзіць 250 гледачоў, і я адчуваю, што нехта адзін нядобра на мяне глядзіць. Першапачаткова чалавек настроены негатыўна, гатовы толькі крытыкаваць. Навошта тады прыйшоў у тэатр?

***— Чытаеце водгукі на спектаклі, каментарыі?***

— Раней чытала, расстройвалася, калі штосьці не так. Імкнулася ўцягнуць кожнага гледача ў зале. Цяпер больш так не раблю. Глядач сам уцягнецца, калі ён на гэта здольны. Выходзіш на сцэну і адразу адчуваеш: цяжкая зала ці лёгкая. Бывае, што спачатку не твой глядач, а падчас спектакля так уцягваецца, што робіцца тваім. А ўвогуле ў нас людзі малайцы, ходзяць у тэатр.

***— Якім павінен быць ідэальны рэжысёр?***

— Я праціўнік усяго ідэальнага. Сама не імкнуся быць ідэальнай. І рэжысёр не павінен такім быць. Гэта ж заўсёды асоба, прычым з моцным характарам. Ён павінен за ўсё адказваць, усё чуць і бачыць, усім кіраваць і карэктаваць. З кожным чалавекам размаўляць на яго мове. Саша (знакаміты рэжысёр і муж актрысы Аляксандр Яфрэмаў. — **Аўт.**) блізкі да ідэальнага, хоць мне не хочацца ўжываць гэта слова. Ён вялікі прафесіянал, валодае ўсімі тонкасцямі майстэрства, умее кантактаваць з акцёрамі.

***— Вам лёгка працаваць з мужам на здымачнай пляцоўцы?***

— Няпроста. Бо ў мяне таксама характар. Праўда, на апошняй карціне ён сказаў, што са мной стала значна лягчэй. Так, я змянілася, але спрачацца не перастала. І Саша часам прызнае: ты мела рацыю. Цяпер часцей я ўсё ж стараюся выконваць задачу рэжысёра моўчкі. Раней была жорсткім перфекцыяністам, мяне немагчыма было спыніць у справе ўдасканалення, я бачыла, што можна зрабіць лепш, потым яшчэ лепш.... Зараз змагаюся з гэтым. Мне з Сашам цікава: я прыдумваю штосьці, ён ухваляе, падказвае, такая вось узаемная творчасць. Праўда, з іншымі рэжысёрамі прасцей: паканфліктуеш, потым прыйдзеш дадому, прыціснешся да пляча мужа, і ўсё добра. А калі падчас здымак з Сашам паканфліктуеш, гэта цягнецца і далей. На пляцоўцы за яго перажываю, бачу, як яму няпроста, тады і мне цяжка.

***— Ці шмат залежыць ад партнёра ў фільме, на сцэне? Вы часта працуеце разам з акцёрам Паўлам Харланчуком...***

— Так, я чалавек, залежны ад партнёра. Гэта, напэўна, не вельмі добра. Паша — адзін з маіх любімых партнёраў, мы добра спрацаваліся. Ён таксама кажа, што са мной лёгка. З ім не трэба дадаткова дамаўляцца, што мы будзем рабіць на сцэне. Нават імкнёмся не размаўляць да спектакля, каб упершыню сустрэцца там. І пачынаецца своеасаблівае ўзаемадзеянне: я штосьці змяняю ў сваёй ролі, і ён таксама. І ў гэтым няма напружання. Гэта шчасце мець такога партнёра. Іх шмат, тая ж Ларыса Маршалава ў ролі мадэмуазэль Куку ў «Безыменнай зорцы». Мне вельмі камфортна з ёй іграць. Калі глядзім адна адной у вочы, мы разумеем, пра што гаворым гледачу. Але для гэтага трэба штосьці, што вас аб'ядноўвае, нейкі агульны сакрэт, перажыванне. Ёсць акцёры, у якіх я вучуся чамусьці. Вось паглядзела фільм «Любіць — не любіць» з Святланай Ходчанкавай. Захапляюся вялікай ступенню яе ўнутранай свабоды. Мне гэтага часам не стае.

***— У вашай фільмаграфіі каля сотні фільмаў, а таксама дзясяткі роляў у тэатры. Лічыце кар'еру ўдалай?***

— Мне грэх скардзіцца. Я апошнім часам запатрабаваная актрыса. Мяне пазнаюць, часта падыходзяць на вуліцы, я чую ў свой адрас добрыя словы. Але, як кажуць, заспакоіць акцёра можа толькі абсалютны поспех. Канешне, яго ў мяне няма. Магчыма, трэба кудысьці паехаць, мець удалую кар'еру там, — тады цябе прызнаюць дома. Але ў жыцці ж усё адносна: можна нічога не мець і быць цалкам шчаслівым. А можна мець шмат і быць незадаволеным. Я шчаслівая тым, што нарэшце знайшла той стан, калі можна проста жыць і адчуваць ад гэтага асалоду. Я не магла яго зразумець доўгія гады. Напэўна, адчуванне таго, што я магу жыць і без дасягненняў, і ёсць маё самае вялікае дасягненне на сёння.

**«Ёсць невялікая складанасць, дакладней, асаблівасць нашай прафесіі — намацаць характар, адчуць, хто гэты персанаж. Бывае, рэпеціруеш-рэпеціруеш, а ён не нараджаецца і ўсё».**

***— Бачна, што вы шмат працуеце над сабой...***

— Не без гэтага. Калісьці я імкнулася ўдасканальваць сябе, дасягаць нейкіх ідэалаў, ламаць сябе. Зараз я знаёмлюся з сабой, мне вельмі падабаецца мой ценявы бок, падабаецца быць рознай, жывой. Не толькі добрай дзяўчынкай, а дзесьці і дрэннай. І, як ні дзіўна, калі я пазнаёмілася са сваім Ценем, мне сталі прапаноўваць ролі адмоўных персанажаў — шмат. І ў мяне пачало атрымлівацца іх ствараць. Гэта нашмат цікавей, чым быць ідэальнай.

***— У кіно вы стварылі і нямала вобразаў жанчын з трагічным лёсам...***

— Столькі, што цяпер арганізм проста адштурхоўвае гэта, не хочацца іх рабіць. Але рэжысёры бачаць, што ў мяне гэта ёсць — трагізм у вачах. І выкарыстоўваюць. Мне надакучыла плакаць. Зараз імкнуся да гумару, шукаю, як павярнуць па-іншаму, каб не плакаць. Вось «Фламінга», здавалася б, камедыя камедыяй, але ўсё роўна кажуць, што гераіню шкада. Цікава іграць такую сумесь.

***— Нягледзячы на гэта, у нядаўняй карціне Вячаслава Нікіфарава «Тум-Пабі-Дум» вы зноў сыгралі жанчыну з драматычным лёсам, якая страціла дзіця...***

— Калі пачытала сцэнарый і зразумела, чаго ад мяне хоча рэжысёр, адчула, што прыйдзецца пакінуць сваю зону камфорту, забыць адчуванне шчасця, якога, між іншым, я дасягала вялікай працай. На пробах зразумела, што не хачу ўцягвацца, але адчула, што ўжо ўцягнулася. Было вельмі няпроста жыць некалькі месяцаў у гэтым стане, і ён не адпускаў мяне яшчэ працяглы час пасля здымак. Я нават на адпачынак з'ездзіла і там не змагла расслабіцца. Але не шкадую, што сыграла такую ролю. У нейкай ступені гэта мяне вярнула ў прафесію. Чым больш пачынаеш адчуваць шчасце, тым менш жадаеш займацца акцёрствам: не хочацца ўвасабляць чужыя няшчасці. Адчуваеш, што табе так добра, што хутка ты ўжо і не актрыса. А потым нешта здараецца — і ты зноў у прафесіі.

**Алена КРАВЕЦ.**
*kravets@zviazda.by*



У спектаклі «Ваўкі і авечкі».

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** На гэтым тыдні не варта чакаць якіх-небудзь сур'ёзных перамен. Амбіцыі будуць спрыяць паляпшэнню фінансавага становішча і замацаванню поспехаў у прафесійнай дзейнасці. Магчымы, аднак, непрадбачаныя цяжкасці, для пераадолення якіх давядзецца прыкласці пэўныя намаганні. Самы час рэалізоўваць свае задумы, а не гаварыць пра іх. Наогул менш расказвайце пра сябе, свае планы і намеры.



**СКАРПІЁН.** Найбольш спрыяльная рэалізацыя планаў можа чакаць у прафесійнай і службовай сферах. Вас усе будуць любіць, паважаць і слухаць. Вашы веды будуць запатрабаваныя, гумар дарэчны. Магчыма нават павышэнне па службе. Вызваляйцеся ад дакучлівых ідэй і страхаў. Не бярыце на сябе вялікі аб'ём працы, рэальна разлічвайце сілы. Зараз ідзе гарманічны перыяд, скарыстайцеся гэтым, каб больш адпачываць і займацца асабістым жыццём.



**СТРАЛЕЦ.** Паспрабуйце вырашаць пасільныя задачы, не перанапружвайцеся. Ёсць імавернасць, што патрабаванні да вашай працы могуць быць завышаныя і вы сутыкняцеся з несправядлівасцю ў адносінах да сябе з боку начальства. Аднак неўзабаве ўсё ўстане на свае месцы. У пятніцу непажадана прымаць паспешлівыя рашэнні па пераходзе на іншую працу ці яшчэ якіх кар'ерных зменах. Тыдзень спрыяльны для ўстанаўлення сяброўскіх кантактаў і завязвання карысных знаёмстваў.



**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні, падобна, цэнтр сусвету будзе знаходзіцца дзесьці ў непасрэднай блізкасці. Будзеце прыцягваць да сябе ўвагу і нават захопленыя погляды. Вы гатовыя адкрыць для сябе нешта новае і выгаднае ў дзелавым партнёрстве, атрымаць дапамогу і вызваленне ад мінулых даўгоў, як фінансавых, так і кармічных. Ганіце прэч няўпэўненасць і сумненне, бо надышоў ваш час, калі вы можаце многае паспець увасобіць у жыццё.



**ВАДАЛІЎ.** Гэты тыдзень, асабліва яго першая палова, можа прынесці бясконцыя клопаты, як на працы, так і дома. Не раз будзеце гатовыя раззлавацца, і толькі ўласцівая вам стрыманасць не дазволіць гэтага зрабіць. І цярпенне прынясе плён. Ужо пачынаючы з чацвярга новыя праекты атрымаюць дадатковы штуршок і вы яшчэ на адзін крок наблізіцеся да сваёй мэты. Няма ліха без дабра, і, што б ні адбывалася, усё — да лепшага. Паездкі і камандзіроўкі дазволяць палепшыць дабрабыт. У выхадныя добра было б пабыць у адзіноце або сярод самых блізкіх сяброў.



**РЫБЫ.** Сцеражыцеся паспешлівых рашэнняў. На гэтым тыдні рызыкуеце стаць ахвярай нядобрасумленнага партнёра па бізнесе ці вас аблічыць прадавец у краме. Будзьце ўважлівыя. У аўторак лепш устрымацца ад буйных пачынанняў, хоць дзень у цэлым будзе станоўчы. На чацвер пажадана не планаваць сустрэчы, ні важныя, ні тым больш непатрэбныя. У пятніцу дапамогуць такія якасці, як рашучасць і актыўнасць. У выхадныя патрэбныя новыя ўражанні, пажадана куды-небудзь з'ездзіць.

## Чацвер, 25 студзеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.00** «Зона Х» (16+).
**9.10, 22.10 Серыял «След» (16+).**
**10.50, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Капітанша» (16+).**
**13.10** «Дзіцячы доктар».
**13.45** «Дзень у вялікім горадзе».
**14.45, 15.25 Серыял «Райскае месца» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**23.45** «Сфера інтарэсаў».
**0.40** «Дзень спорту».

### Беларусь 2

**7.00** «Тэлераніца» (12+).
**9.00, 19.10** «Тэлебарометр».
**9.05, 17.05 Серыял «Жанчыны ў чорным» (16+).**
**9.55, 17.55 Серыял «Каварныя пакаёўкі» (16+).**
**10.50, 22.05 «Сляпая». Драма (16+).**
**11.55, 21.15** «Тата зможа?» (16+).
**12.40** «Свет навыварат» (16+).
**13.25, 19.15** «Амерыканскі жаніх» (16+).
**14.20** «На нажах» (16+).
**15.25, 23.05 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме» (16+).**
**16.15, 23.55** «Нічога сабе ньюз» (12+).
**16.20, 0.00** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**18.45** «Калі мы дома». Скетчкам (16+).
**20.15** «Паненка-сялянка» (16+).
**22.00** «Спортлато 6 з 49», «КЕНО».

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 20.10** «Беларуская кухня». Кулага беларуская.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15** «Гэты дзень».
**8.25, 18.15 «Строгавы». Маст. фільм (12+).**
**9.40** «Уладзімір Высоцкі. Беларускі след». Дак. фільм.
**10.05** «СССР — музыка пад забаронай». Уладзімір Высоцкі.
**10.40, 16.10 «Вертыкаль». Маст. фільм (12+).**
**12.20** «Беларуская кухня». Рыбны квас.
**12.45** «Беларусь як песня». Ганна Радзько.
**13.15** «Славянскі базар у Віцебску — 1995».
**14.05, 22.15** «Хроніка Мінскага гета». «За гонар і свабоду» (12+).
**14.55, 21.05 «Лёс рэзідэнта». Маст. фільм. «Заходні шлейф» (12+).**
**17.25** «Песні мінулага стагоддзя». Уладзімір Высоцкі і яго песні.
**19.30** «Сучаснае мастацтва Беларусі». Дынастыя мастакоў Бархатковых.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.10** «Святло далёкай зоркі». Памяці актрысы, рэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Любові Мазалеўскай.

### Беларусь 5

**8.00** Хакей. КХЛ. «Спартак» (Масква) — «Дынама» (Рыга).
**10.00** Легенды спорту. Беларускія гісторыі.
**10.30, 15.20** Спорт-мікс.
**10.40** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Другі этап.
**12.15** Слэм-данк.
**12.45** Агнявы рубеж.
**13.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Брайтан» — «Чэлсі».
**15.50** Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Масстарт. Мужчыны.
**16.20** Хакей для ўсіх.
**16.55** Гульні «навырост».
**17.25** Легенды спорту. Беларускія гісторыі.
**17.55** Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
**18.30** Авертайм.
**19.00, 22.00** Спорт-цэнтр.
**19.10** Авертайм. КХЛ.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Слован» (Браціслава). (У перапынках — Авертайм. КХЛ.)
**22.10** Змешаныя адзінаборствы. UFC.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Тэорыя змовы» (16+).
**10.00** «Жыць здорава!» (12+).
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.20, 13.10, 19.00** «Няхай гаворыць» (16+).
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20** «Адваротны адлік». «Магія гуку, ці Аб чым звоніць звон» (12+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Сакратарка» (16+).**
**23.00 Серыял «Павук» (16+).**
**0.50** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 17.35** «Далёкія сваякі» (16+).
**8.50, 21.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40, 20.15** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30, 17.55 «Прапаршчык Шматко, або Ё-маё!» Серыял (16+).**
**13.05 «Следакі». Серыял (16+).**
**13.50, 23.25 «NEXT-2». Серыял (16+).**
**15.30** «Праца навыварат» (16+).
**16.50** «Мінск і мінчане».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**23.05** «Аўтапанарама» (12+).
**1.00 «Салдаты-11». Серыял (16+).**

### МІР

**6.00** «Здабытак рэспублік. Васьмідзясятыя». Кухня (12+).
**6.30** «Добрай раніцы, свет!» (16+).
**7.35** «Любімыя акцёры» (12+).
**8.05 Серыял «АСА» (16+).**
**9.05, 13.15, 19.20 Серыял «Метад Лаўровай» (16+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны.
**14.05** «Справы сямейныя» (16+).
**15.00, 3.10** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15. 17.10, 18.05 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**23.15 Маст. фільм «Курортны туман» (16+).**
**1.05 Маст. фільм «Шукаю цябе» (16+).**
**4.05 Серыял «Спрут» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40, 22.30, 23.10 Серыял «Скліфасоўскі». (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу .
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.40 Серыял «Сямейны дэтэктыў». (12+).**
**22.10** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**0.30** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.50, 8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.40, 23.05** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Дарожны патруль». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Адвакат». (16+).**
**16.35, 19.40 Серыял «Інспектар Купер». (16+).**
**21.15 Серыял «Апошні артыкул журналіста». (16+).**
**23.25** «Вынікі дня».
**23.55 Серыял «Патруль». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.45, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.25, 23.10 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.15 Серыял «Чатыры танкісты і сабака» (12+).**
**9.10** Дак. фільм «Маскоўская аблога» (18+).
**10.00** М/с «Зорныя войны» (0+).
**10.25** Дак. серыял «Фантасты-прадказальнікі». Жуль Верн (12+).
**11.15 Камедыя «Блакітная кроў» (16+).**
**12.45 Серыял «Палюбоўнікі пустыні» (16+).**
**14.15 Меладрама «Старое ружжо» (16+).**
**16.00** Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
**16.05** «Мультпарад».
**16.30** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**17.00** Дзецям пра зверанят (12+).
**17.20 Серыял «Горад прышэльцаў» (16+).**
**18.50 Серыял «Ключы ад бездані» (16+).**
**19.35** «Фэшн is my прафэшн».
**19.50 Серыял «Выратаваць боса» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**21.15 Драма «Закаханыя» (16+).**

### ВТБ

**6.00, 12.45** Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
**6.20, 15.20** Серыял «Варonіны». (12+).
**7.40, 4.20** М/ф «Дуда і Дада». (0+)
**8.00, 4.35** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.20, 4.55** М/ф «Маша і Мядзведзь». (6+)
**8.40, 3.30** «Ералаш». (6+)
**9.40, 19.00** Серыял «Маладзёжка. Дарослае жыццё». (12+).
**10.45** Баявік «Час расплаты». (12+).
**13.00, 20.00** Серыял «Лондангpад». (16+).
**14.10** Серыял «Паласатае шчасце». (12+).
**16.50, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**17.50, 22.40** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.00** Фантастыка «Якія спыняюць час». (12+).
**0.00** Серыял «Карабель». (16+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**1.50** Серыял «Метад Лаўровай». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.45** Навіны культуры.
**6.35** «Легенды сусветнага кіно». Моніка Віці.
**7.05** «Пешшу...» Масква Высоцкага.
**7.35, 20.05** «Правілы жыцця».
**8.10, 22.20** «Мемарандум Парвуса». Серыял.
**9.10** «Палацы ўзарваць і адыходзіць...»
**9.40, 19.45** «Галоўная роля».
**10.15, 17.45** «Назіральнік».
**11.10, 0.00** ХХ стагоддзе. «Уладзімір Высоцкі. Маналог». 1980 год.
**12.20** Рэпартажы з будучыні. «Біянічныя палёты». Дак. фільм.
**13.00** «Абсалютны слых».
**13.40** «Акіяны Сонечнай сістэмы». Дак. фільм.
**14.30, 23.15** «Адлюстраваны час». Дак. серыял.
**15.10, 1.50** Да юбілею Юрыя Башмета. Г. Канчэлі. «Сцікс».
**15.50, 2.30** «Яго Галгофа. Мікалай Вавілаў». Дак. фільм.
**16.20** «Мая любоў — Расія!» «Усё пра нарты».
**16.50** «Лінія жыцця». Нона Грышаева.
**18.45** «Віктар Шклоўскі і Раман Якабсон. Жыццё як раман». Дак. фільм.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** Прыступкі цывілізацыі. «Цуды надвор'я нашага Сусвету. Іншапланетная метэаралогія». Дак. фільм.
**21.40** «Больш, чым каханне». Альберт Эйнштэйн і Маргарыта Канёнкава.
**1.05** «Bauhaus на Урале». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Закон аб СМІ». 2006 год (16+).
**7.00, 8.40, 9.40, 11.45, 13.50, 15.40, 17.00, 21.40, 23.00, 1.05, 2.45, 3.40** Музычная настальгія (12+).
**7.40** Фільм-спектакль «Абрабаванне ў поўнач». 1978 год (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Нараджаныя ў СССР» (12+).
**11.00, 5.00** «Песня-87» (12+).
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**13.00** «Дэфіцыт на Мазаева». Тэлеспектакль 1979 год (12+).
**14.35** «Час пік» з Андрэем Разбашам (12+).
**17.30** Маст. фільм «Зігзаг» (16+).
**18.00** Маст. фільм «Адам жэніцца з Евай» (12+).
**20.10** «Канцэрт Тота Кутуньё». 1985 год (12+).
**23.40** Маст. фільм «Удача» (16+).
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Міжнародная панарама». 2005 год (18+).
**1.40** Маст. фільм «Абяцанне шчасця» (16+).

### EuroSport 1

**3.00, 6.00, 8.00, 11.30, 14.30, 16.00, 18.30, 21.00, 1.50** Тэніс. Australian Open.
**5.30, 11.15** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс»-экстра.
**14.00, 2.30** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс».
**15.30** «Дух парусная спорту».
**23.00** Веласпорт (трэк). «Шэсць дзён Берліна».

### Кінакамедыя

КИНОКОМЕДИЯ

**1.10** Меладрама «Закахацца ў нявесту брата». (16+).
**2.55** Камедыя «Махляры». (16+).
**4.45** Баявік «Нацыянальная бяспека». (12+).
**6.25** Камедыя «Украдзі маю жонку». (16+).
**8.15** Камедыя «Вясельны перапалох». (16+).
**10.15** Прыгоды «Сардэчна запрашаем у джунглі». (12+).
**12.00** Камедыя «Робін Гуд: мужчыны ў трыко». (12+).
**14.00** Камедыя «Беласнежка: помста гномаў». (12+).
**15.55** Камедыя «Прасцячка». (16+).
**17.55** Камедыя «Піўная ліга». (16+).
**19.30** Камедыя «Доля анёлаў». (12+).
**21.30** Камедыя «Гігантык». (16+).
**23.20** Камедыя «Навіны з планеты Марс». (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.25** «Доктар І...» (16+).
**8.55, 19.00, 2.25** «Кузей. Гюней». Серыял (16+).
**10.35, .00** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.10, 18.00** «Сакрэты экстрасэнсаў» (16+).
**13.00, 16.55** «Варажбітка» (12+).
**14.00** «Паралельны свет» (12+).
**14.55** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.30** «Простыя складанасці» (12+).
**16.05** «Натуральны адбор» (12+).
**20.45** «Вераніка не хоча паміраць». Серыял (16+).
**21.40** «Нераскрытыя тайны» (12+).
**22.35** «90-я» (16+).
**23.20** «Нябёсы, якія абрынуліся». Серыял (16+).
**0.05** «Дзень Незалежнасці». Фантастыка (16+).
**5.35** «Гісторыі выратавання» (16+).

### ТБ1000

TV 1000

**6.10, 15.15** Малышка на мільён (16+).
**8.45** Дракула (16+).
**11.15** Дзённік пакаёўкі (16+).
**13.15** Эван Усёмагутны (12+).
**17.50** Дывергент-3: за сцяной (16+).
**20.10** Далёка-далёка (12+).
**22.50** Новая эра Z (16+).
**1.00** Цёмная даліна (18+).
**3.00** Спадар Ніхто (16+).
**5.15** Троя (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Пятніца (16+).
**8.05** Пацалунак скрозь сцяну (16+).
**9.50** Прыкідваючыся ахвярай (16+).
**11.50** Трое ў лодцы, не лічачы сабакі. (12+).
**14.25** Хатабыч (16+).
**16.20, 4.20** Парфумерка. 3—4-я серыі (12+).
**18.20** Дзень радыё (16+).
**20.20** Высоцкі. Дзякуй, што жывы (16+).
**22.50** Чалавек у футарале, чалавек у паліто і чалавек у фраку (12+).
**0.45** Дамавік (16+).
**2.45** Востраў шанцавання.

### National Geographic

**6.00, 7.55** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.05** Займальная навука. (12+).
**8.15, 12.05, 17.30, 20.40** Аўта-SOS. (12+).
**9.00** Шаша праз пекла. (16+).
**9.45** Дзікі тунец. (12+).
**10.30** Мегазаводы. (12+).
**11.20** Шаша праз пекла. (16+).
**12.50** Прарыў. (12+).
**13.40** Гульні розуму. (12+).
**15.15, 2.05, 5.10** Сакрэтныя матэрыялы Юрскага перыяду. (12+).
**16.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха. (16+).
**16.45, 18.20, 19.50, 22.15, 0.35, 3.35** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**19.05** Пачатак. (16+).
**23.00** Ліхтугі за мяжой. (16+).
**23.45** Тайныя гісторыі. (16+).
**2.50** Неверагодныя машыны. (12+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 0.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 11.00, 15.00, 21.00, 6.20** Як гэта ўстроена? (12+).
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Паляўнічыя на склады. (16+).
**14.00, 7.10** Выжыць любой цаной. (16+).
**18.00** Металаломшчыкі. (16+).
**19.00, 5.30** Хуткія і гучныя. (16+).
**20.00, 0.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**2.00** Аляска: апошні рубеж. (16+).
**2.55** Салдаты няўдачы. (16+).

НОВЫЯ ПРАВІЛЫ

Як першы сартавальны завод зрабіў пераварот у свядомасці людзей

# УСЁ ДА КУЧЫ? ГЭТА МІНУЛАЕ СТАГОДДЗЕ

**Больш чым паўгода гродзенцы жывуць па новых правілах. Пасля таго як у горадзе ліквідавалі смеццеправоды, жыхары носяць смецце ў кантэйнеры на спецыяльных пляцоўках. А тут іх трэба яшчэ і сартаваць. І ўсё ж прыхільнікаў гэтай ідэі становіцца больш, заўважаюць работнікі Гродзенскага завода па ўтылізацыі і сартаванні адходаў. Калі напачатку гэты працэс быў незаўважны, дык зараз каля 20 працэнтаў смецця трапляе на завод ужо адсартаваным.**



## ПЕРШЫ Ў РЭГІЁНЕ

На заводзе для адсартаваных адходаў ёсць асобны адсек. Сюды і трапляе смецце са спецыяльных кантэйнераў на стадыі збору. Першыя месяцы работы тут было амаль пуста, заўважае майстар участка Уладзімір Казімірчык. Адсек загружаўся марудна. Зараз можна ўбачыць даволі прыстойную горку пластыку. Праўда, і ў гэтыя кантэйнеры часам скідваюць што папала. І ўсё-такі свядомы падыход відавочны. Гродзенцы пачынаюць сартаваць адходы «па фракцыях», як кажуць на заводзе. Уладзімір Казімірчык згаджаецца, што гэта працэс больш марудны, бо лягчэй усё згрузіць у адзін пакет, чым сартаваць паасобку — паперу, пластык, шкло... Але прагрэсіўных гараджан становіцца ўсё больш.

А пачалося ўсё дзякуючы будаўніцтву першага ў рэгіёне завода па ўтылізацыі і сарціроўцы адходаў, які размясціўся на тэрыторыі гарадскога палігона. Літаральна на сотні метраў высіцца горы цвёрдых бытавых адходаў, створаныя ўсяго за 13 гадоў. Кажуць, што тут больш за 2 млн тон смецця — практычна выбраны ўвесь рэсурс звалкі. Завод павінен у значнай ступені зняць нагрузку з палігона, забіраючы са смецця другасную сыравіну.

— Галоўная мэта, каб на палігон не траплялі другасныя матэрыяльныя рэсурсы, — адзначае **дырэктар завода Вячаслаў АНДРЫЕЎСКІ.** — А попыт на іх ёсць. Шкло ідзе на Гродзенскі шклозавод, палімеры — ажно на некалькі прадпрыемстваў у розных кутках рэспублікі, папера — на слонімскі завод «Альберцін». Алюмініевыя банкі — на «Другчармет». Пры гэтым мы атрымліваем і даход. Кожны рэсурс мае свой кошт: 50 рублёў каштуе плёнка, 640 — пэтбутэлька — за тону. Перапрацаваныя адходы зноў прыгодныя для выкарыстання.

## РАЗВЯЛІ ПА ФРАКЦЫЯХ

Шчыра кажучы, столькі смецця ў адным памяшканні не даводзілася бачыць ніколі. Сапраўдны Манблан. Сюды выгружаюць усе адходы, якія паступаюць з горада. У дзень смеццявозы прывозяць 230—260 тон. Раней уся гэта гара адразу трапляла на палігон, зараз з яе будуць «выцягваць» карысныя для вытворчасці рэчы.

Канчатковы «прадукт» займае некалькі вялікіх памяшканняў. Другасная сыравіна — пластык, папера і іншае — пабывалі пад прэсам і чакаюць вывазу. Памяшканне паступова пусцее, але новыя горы смецця робяць гэты працэс бесперапынным...

Жалезная «рука» экскаватара раз-пораз загружае смецце ў барабан, дзе адходы часткова сартуюцца: пакеты рвуцца, дробныя фракцыі падаюць кудысьці ўніз і затым вывозяцца на палігон, а іншыя рэчы трапляюць на лініі сарціроўкі. На першай лініі ідзе адбор паперы і шкла.



Заўважаю цэлы пагрузчык навагодніх ёлак. Іх даволі многа трапляе на завод. Ёлкі — з ліку буйнагабарытных адходаў, таму крышацца на дранку, як, напрыклад, мэбля, драўляныя вокны, дзвееры і іншая сталярка. Мой «экскурсавод» Уладзімір Казімірчык адзначае, што зімой вязуць з горада ёлкі, а летам і восенню — яблыкі. Калі ёлкі можна спаліць у кацельнай, дык яблыкам — прамая дарога на палігон. Хаця ёсць паблізу кансервавыя заводы.

А яшчэ тут дробняць старыя шпалы. Некалькі гадоў яны звозяцца сюды з прадпрыемства «Гродна Азот», дзе адбываецца іх замена. Трэскі спальваць нельга, бо яны прамочаныя мазутам, таму пойдуць для перасыпкі дарогі на палігоне. Глядзячы на гару шчэпак, можна ўявіць, колькі старых шпал сюды завезлі.

## ПЛІТКА СА СМЕЦЦЯ

Як аказалася, на заводзе не толькі сартуюць смецце, але і самі яго перапрацоўваюць. Гэта палімерныя адходы нізкай якасці, такія як хрумсткія пакеты, упакоўкі ад тартоў і іншае. Гэтую сыравіну вытворцы не купляюць, таму на заводзе паралельна з сарціроўкай пачалі асвойваць выпуск тратуарнай пліткі. Набылі лінію па вытворчасці палімерна-пясчаных вырабаў. Працэс, па сутнасці, не складаны. Пластык дробніцца да стану трухі і змешваецца з рачным пяском. Сумесь награваецца да 220 градусаў, а затым ідзе пад прэс. Па словах дырэктара, такая плітка вельмі трывалая, і, што важна, не слізкая зімой ці ў дождж, бо вада хутка сцякае. Да таго ж яна і таннейшая за звычайную. Пробная партыя разышлася па сваіх патрэбах. У якасці эксперымента з гэтай пліткі зрабілі невялікую пляцоўку — нават ад шматтонных грузавікоў яна не пашкодзілася.

Інтарэс да новай прадукцыі праяўляюць як камунальныя службы, так і прыватныя асобы. Магчыма, плітку будуць выкарыстоўваць для ўкладкі на кантэйнерных пляцоўках. Тых самых, куды гродзенцы носяць смецце. Дарэчы, падчас «смеццевай» кампаніі ў Гродне літаральна за некалькі месяцаў з'явілася больш за 850 новых пляцовак — амаль у тры разы больш, чым было.

Што датычыцца новых вырабаў з перапрацаванага смецця, то гэта можа быць не толькі плітка. Мяркуецца выпускаць іншыя віды: бардзюры, экапаркоўку, ліўневыя рашоткі, каналізацыйныя люкі. Розных формаў тут больш за сотню. Цяпер засталося прайсці сертыфікацыю на выпуск новых вырабаў і наладзіць бесперабойны цыкл. Тады яшчэ дзясяткі тон непрыдатнага смецця пойдуць у справу.

## У ТУРНЭ ПА ЗАВОДЗЕ

На заводзе спрыяльна ставяцца да наведвальнікаў. Больш за тое — ім тут рады і нават ініцыіруюць уключэнне прадпрыемства ў турыстычны маршрут. І такая ідэя атрымала водгук. Супрацоўнікі турыстычнай фірмы з Мінска збіраюцца прапанаваць гэты аб'ект для наведвання і прадставіць на турыстычнай выставе. А ўразіць тут ёсць чым. Асабліва калі падысці да падножжа смеццевых гор. Майстар Уладзімір Казімірчык заўважае, што цяпер, пасля свят, адходаў паступае амаль на трэць больш. Каб справіцца з ачысткай пляцовак, у Гродзенскай спецаўтагаспадарцы на гэты час павялічылі колькасць брыгад. Але і ў звычайныя дні сюды прыбывае каля 100 машын-смеццявозаў.

**Асабліва папулярны маршрут на завод у школьнікаў. А нядаўна тут пабывалі нават выхаванцы дзіцячага садка. Прывучаць да правільнай сарціроўкі варта з малых гадоў, лічыць Вячаслаў Андрыеўскі. Многія еўрапейскія краіны ішлі да гэтай справы дзесяцігоддзі.**

Пакуль што на гродзенскі завод трапляе 20 % адсартаваных адходаў. І ўсё ж за няпоўны год зроблены значны крок у сістэме раздзельнага збору смецця. Такі падыход важны, кажа дырэктар завода, бо правільна адсартаваная папера менш псуецца, больш аб'ём даходзіць да перапрацоўкі. Адпаведна, гэта дазволіць захаваць першасныя рэсурсы, тыя ж дрэвы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

МЕРКАВАННІ

# КОШТ СМЕЦЦЯ

## Асобны збор і ўтылізацыя адходаў: што павінен ведаць і рабіць кожны з нас?

**З такім актуальным пытаннем мы звярнуліся як да профільных арганізацый, так і да звычайных людзей, неабыякавых да навакольнага асяроддзя і прыроды.**

**Галоўны спецыяліст па рабоце з насельніцтвам дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Ніна КУЛЬБЕДА:**

— Першае: трэба зрабіць так, каб у двары ўсталявалі кантэйнеры для асобнага збору адходаў. Калі ў вашым двары не ўстаноўлены кантэйнеры для адходаў паперы, шкла, пластыку, а жыхары выказваюць гатоўнасць збіраць усё гэта асобна, калі ласка, звярніцеся з просьбай усталяваць кантэйнеры ў арганізацыю, якая вывозіць адходы, або ў раённы выканаўчы камітэт (у Мінску — у адміністрацыю раёна).

Навошта сартаваць, скажаце вы, калі ўсё роўна прыязджае смеццявоз і загружае ў адзін кузаў адходы з розных кантэйнераў? Асобныя кантэйнеры для паперы, пластыку, шкла павінны абслугоўвацца асобна: кожны ў свой час па асобным графіку спецыяльна выдзеленым для гэтага смеццявозам. Менавіта да такога стану спраў мы імкнёмся.

Што на практыцы? Пакуль далёка не ўсе жыхары краіны падтрымліваюць асобны збор адходаў. Таму змесціва кантэйнераў для паперы, пластыку, шкла моцна забруджана розным смеццем, перш за ўсё — харчовымі адходамі. З гэтай прычыны адходы з кантэйнераў для асобнага збору нельга наўпрост адпраўляць для выкарыстання на заводы. Важна ведаць, што і пры сумесным вывазе адходы з кантэйнераў для асобнага збору ніколі не вывозяць на звалку! Іх заўсёды вязуць на дадатковае сартаванне, пасля чаго — на перапрацоўчыя прадпрыемствы.

Куды выкідаць тэтрапакі? У Мінску адходы ўпакоўкі тыпу тэтрапак можна выкідаць у спецыяльныя секцыі-«заплечнікі», якімі абсталяваныя асобныя ярка-зялёныя кантэйнеры «Белгіпс-Эка» для збору макулатуры. Куды выкідаць металічную ўпакоўку? Яе здавайце ў прыёмныя пункты, якія вядуць нарыхтоўку лому чорных і каляровых металаў. Калі карыстацца паслугамі прыёмных пунктаў нязручна, мы рэкамендуем выкідваць металічную ўпакоўку ў кантэйнер для паасобнага збору адходаў з пластыку. Куды выкідаць пластыкавыя латкі ад яек? Пры цяперашняй разнастайнасці ўпакоўкі нават спецыялісту бывае цяжка вызначыць, з якога матэрыялу яна зроблена. Таму мы заклікаем у кантэйнеры для адходаў пластыку выкідваць упакоўкі, якія візуальна складаюцца ў асноўным з гэтага матэрыялу.

**Вядучы спецыяліст аддзела па развіцці ТДА «Экалогія горада» Вольга ЖДАНОВІЧ:**

— Мы павінны адказна ставіцца да асобнага збору адходаў, уважліва сачыць за тым, што і куды мы выкідваем, а таксама павінны ўсвядоміць, што раскладанне адходаў на смеццевых звалках — вельмі працяглы працэс, які наносіць велізарную шкоду экалогіі. Напрыклад, экалагічна чысты матэрыял папера раскладаецца на працягу дзесяці гадоў, а кансервавая бляшанка — да дзевяноста гадоў.

Штогод на сметніках назапашваецца вялікая колькасць пластмасы і бытавой сінтэтыкі. Ці ведаеце вы, што на сённяшні дзень выяўлена звыш пяці трыльёнаў часцінак пластыку агульнай вагой амаль у 270 тысяч тон у водах Сусветнага акіяна?

Спальваючы змешанае смецце, мы толькі нязначна памяншаем яго аб'ём, але ў той жа час па тэрыторыі населенага пункта распыляецца таксічны дым, а таксама выпрацоўваецца атрутны попел і адходы газаачысткі, якія пасля пахавання забруджваюць грунтавыя воды. Асабліва небяспечнае спальванне пластыкавых адходаў, у працэсе якога вылучаюцца дыяксіны, уздзеянне якіх у 67 000 разоў мацнейшае за цыянід. Дарэчы, дыяксіны здольныя назапашвацца як у целе чалавека, так і ў навакольным асяроддзі.

**Прараб Вячаслаў ЛАШМАНАЎ, г. Мінск:**

— Я збіраю адходы асобна ўжо чатыры гады, пачаў з пластыку: бутэлькі з-пад малака, а таксама ад хімічных сродкаў, латкі ад яек. З цягам часу стала зразумела, што гэтага мала. Аднойчы ў метро я ўбачыў сацыяльную рэкламу, дзе была пазначана пэўная колькасць макулатуры, якая дапамажа выратаваць адно дрэва. І гэта мяне ўразіла.

У нас дома збіраецца шмат паперы, бо ў дачкі і жонкі работа звязана менавіта з дакументамі. На лецішчы мы выкарыстоўвалі выключна газеты, каб распальваць печку, а выкарыстаную паперу фармату А4 выкідалі ў сметніцу. І тады я задумаўся: чаму б не збіраць стосамі гэтыя аркушы паперы? За першыя месяцы, як мы пачалі гэта рабіць, назбіралася пяць велізарных пакетаў. З таго часу прайшло паўгода, але была праблема, куды яе аддаваць, бо вазіць у пункты збору далёка і часу на гэта не было. Жонка забірала гэтыя пакеты сабе ў машыну, потым адвозіла на работу, дзе яе збіралі, каб здаць на макулатуру. Раней побач з домам быў спецыяльны кантэйнер, але ён прадуваўся і быў без накрыўкі. Папера, якая там заставалася, размакала ад дажджу і снегу.

Нядаўна замест гэтага бака з'явіўся зручны металічны бокс. Цяпер мы кожны тыдзень, калі разбіраем адходы, адносім усе туды.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

# «МАЯ «ПРЫВІЛЕЯ» — ДАПАМАГАЦЬ»

## Тэлефон Чаславы Лагун даступны ўвесь час

**Чаславу Лагун — дэпутата Івянецкага пасялковага Савета — муж і дзеці жартам называюць віртуальнай жонкай і бабуляй. Але ў кожным жарце, як кажуць, ёсць часцінка праўды. Часлава Мар'янаўна для жыхароў пасёлка лепшы дарадчык. Здараецца і так, што цэлы дзень у яе доме не змаўкае тэлефон. «Мой нумар увесь час даступны», — кажа яна. Хтосьці хоча даведацца, як палепшыць свае жыллёвыя ўмовы, атрымаць ільготны крэдыт. Іншы цікавіцца, як стварыць кааператыў і правесці газ. Часлава Мар'янаўна кожнаму дасць параду, кансультацыю: якія дакументы для гэтага патрэбны, куды звяртацца.**



Акрамя грамадскіх абавязкаў, у яе шмат хатніх клопатаў. Раней сям'я трымала фермерскую гаспадарку, але два гады таму закрыла справу. Дзеці ў свой час дапамагалі ўпраўляцца ў полі, даглядаць жывёлу. У Чаславы Мар'янаўны з мужам чатыры дачкі і двое сыноў. Выраслі дружнымі, працавітымі, атрымалі адукацыю, пабудавалі жыллё, стварылі сем'і. У бабулі з дзядулем падрастаюць дзевяць унукаў. Але яны ўпэўнены, што іх з цягам часу прыбавіцца.

Канешне, нялёгка быць узорнай маці, жонкай, бабуляй, гаспадыняй ды яшчэ і дэпутатам. Але Часлава Мар'янаўна прызвычаілася: у яе ўсё жыццё бягом.

Пачынала яна сваю кар'еру з простай афіцыянткі ў рэстаране, затым закончыла Баранавіцкі тэхналагічны тэхнікум. Працавала на адказных пасадах: дырэктарам гандлёвага цэнтра, начальнікам службы забеспячэння, участка сельскагаспадарчага прадпрыемства «Івянецкая крыніца». І на пенсіі не сядзіць склаўшы рукі: пайшла санітаркай у Ракаўскі псіханеўралагічны дом-інтэрнат.

Слухаем гэтую жвавую мілавідную жанчыну і разумеем, якімі якасцямі павінен валодаць сапраўдны дэпутат: уменнем суперажываць людзям, разумець іх праблемы. Часлава Мар'янаўна ніколі не пакіне чалавека сам-насам са сваімі бедамі. У яе сям'і прынялі і даглядалі свячку — родную цётку. Жанчына пражыла 101 год, хоць апошнія гады дзе не паднімалася з ложка.

Да гэтага часу ў Івянцы помняць, колькі намаганняў прыклала народны абраннік, каб дапамагчы хлопцу, які застаўся сіратой. Туліўся ён у маленькай, нібыта хляўчук, бацькоўскай хаце, не прыдатнай для пражывання. Часлава Мар'янаўна дапамагла юнаку аформіць дакументы і ўзяць крэдыт на рамонт. Сама знайшла будаўнікоў, паклікала на падмогу суседзяў. Усёй талакой уладкавалі дом, расшырылі, уцяплілі... Дэпутат можа звярнуцца да любога кіраўніка арганізацыі, прадпрыемства ў Івянцы ці Валожыне. І, як сцвярджае, заўсёды знаходзіць падтрымку і паразуменне. Да яе ідуць з просьбамі нават з суседніх вёсак, хоць гэта ўжо іншая выбарчая акруга. Часлава, як прызналася, не можа нікому адмовіць, бо «гэта ж усе нашы людзі, землякі». Дэпутат дапамагла стварыць не адзін «газавы» кааператыў і правесці газ на вуліцы Івянца. Нядаўна падпісалі акты здачы газаправода ў вёсках Старынкі і Замасцяны. «А цяпер захацелі быць з «блакітным» палівам і жыхары вёсак Суднікі і Волма, — кажа Часлава Мар'янаўна, — зараз думаем, як гэтыя населеныя пункты лепш спалучыць у адзіны праект».

> **Тэрэса ЛІПНІЦКАЯ, старшыня Івянецкага пасялковага Савета дэпутатаў:**
> — Мабыць, у Івянцы і ў найбліжэйшых населеных пунктах няма ніводнага чалавека, які б не ведаў Чаславу Мар'янаўну. У яе вялікая дружная сям'я, цудоўныя дзеці, унукі. Ні адно мерапрыемства ў гарадскім пасёлку не праходзіць без удзелу дэпутата. Яна не прапускае ніводнай сесіі, заўсёды падымае праблемныя пытанні. Не тое што ставіць камусьці задачы, а знаходзіць нейкія магчымасці іх рашыць, выказвае свае прапановы. Такіх бы актывістаў больш — і можна было б горы звярнуць.

— Часлава Мар'янаўна, у вас як у дэпутата ёсць нейкія прывілеі? — пацікавілася ў яе.

— Ніякіх. Іх не было ніколі — ні раней, ні цяпер. Гэта грамадская нагрузка. Адзіная льгота — «прыстрашыць» каго з начальнікаў, калі той не хоча разумець праблему: я ж дэпутат, мяне людзі выбралі!.. Так што мая прывілея — ім служыць, працаваць, дапамагаць, — канстатуе Часлава Лагун.

Вядома, ёсць пытанні, якія патрабуюць калегіяльнага рашэння. У прыватнасці, калі толькі пачалі даваць ільготныя крэдыты для будаўніцтва, было складана іх аформіць. Дэпутат раілася са старшынёй пасялковага Савета Тэрэсай Ліпніцкай, калегамі, раённымі інстанцыямі. А затым Часлава Мар'янаўна ўзяла ў выканкаме спісы тых, хто стаіць на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў, і аб'ехала ўсіх, кожнаму расказала, куды трэба звяртацца, якія дакументы прадаставіць... За апошнія гады 20 маладых сем'яў пабудавалі свае дамы.

Праўда, мая суразмоўніца прызналася, што здароўя ёй дэпутацкія справы не прыбавілі. Даводзіцца браць на сябе людскія праблемы, непрыемнасці, а значыць, і адмоўную энергетыку. Ды і шмат сіл часам трацілася на тое, каб давесці да чалавека сваю думку, каб ён правільна цябе зразумеў. Бо, чаго граху таіць, бываюць наведвальнікі, якія прыводзілі толькі прэтэнзіі выказваць і патрабаваць. Асабліва гэта ўласціва людзям старэйшага пакалення, якія нарадзіліся, выраслі і жылі ў былым Савецкім Саюзе. Яны прывыклі да таго, што за іх усё рабіла дзяржава, і не хочуць жыць інакш.

— А ці можна было б абысціся без дэпутатаў мясцовых Саветаў? — задаю Чаславе Мар'янаўне «правакацыйнае» пытанне.

Яна лічыць, што адназначна нельга. Выканкам жа не можа ахапіць усіх і кожнага. «Еду ці іду па вуліцах горада і адразу прыкмячаю, на што варта звярнуць увагу. Зазірну да старшыні і скажу, што, на мой погляд, трэба зрабіць. Такая грамадская структура, як дэпутацкі корпус, неабходная. У Івянцы па акругах — 15 пасялковых дэпутатаў. Ёсць медыкі, гаспадарнікі, усе іх ведаюць, давяраюць ім. Пра гэта сведчыць яўка на нашых выбарчых участках — менш за 80 % не бывае», — кажа Часлава Мар'янаўна.

А які, на яе думку, павінен быць дэпутат?

— Мне падабаюцца сучасныя маладыя людзі: яны цяпер адукаваныя, прагрэсіўныя, валодаюць тэхналогіямі, магчыма, больш за нас бачаць і прадбачаць. Таму з грамадскімі абавязкамі справяцца, было б толькі жаданне. У нас таксама ёсць маладыя актыўныя дэпутаты. А наогул, павінен быць баланс, спалучэнне вопыту і маладосці. І, вядома, цярплівасць, каб выслухаць чалавека і пачуць.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

### З Закона «Аб статусе дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў»

**Справаздачы дэпутата Савета перад выбаршчыкамі.**

Дэпутат Савета адказны перад выбаршчыкамі і ім падсправаздачны. Ён абавязаны перыядычна, але не радзей як два разы на год рабіць справаздачу перад выбаршчыкамі аб сваёй дзейнасці і ходзе выканання перадвыбарнай праграмы, аб працы Савета і яго органаў, у склад якіх ён выбраны або ўваходзіць па службе.

Справаздача дэпутата Савета можа быць заслухана таксама па пісьмовым патрабаванні групы выбаршчыкаў колькасцю, устаноўленай рэгламентам Савета.

Сход, на якім заслухоўваецца справаздача дэпутата Савета, можа прыняць рашэнне, якое змяшчае прапановы і заўвагі дэпутату Савета, якія даводзяцца да ведама грамадзян праз сродкі масавай інфармацыі або іншым шляхам.

### З Закона «Аб статусе дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў»

**Формы дзейнасці дэпутата Савета ў выбарчай акрузе:**

— разгляд зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб, асабісты прыём грамадзян дэпутатам Савета;
— правядзенне дэпутатам сустрэч з грамадзянамі;
— удзел дэпутата ва ўстаноўленым парадку ў працы камісій па грамадскім абмеркаванні ў галіне архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці;
— справаздачы дэпутата Савета перад выбаршчыкамі.

Дзейнасць дэпутата Савета ў выбарчай акрузе можа ажыццяўляцца таксама ў іншых формах.

### З Закона «Аб статусе дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў»

**Разгляд зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб, асабісты прыём дэпутатам Савета.**

Дэпутат Савета:
— разглядае атрыманыя ім звароты грамадзян і юрыдычных асоб, прымае меры для іх поўнага, аб'ектыўнага, усебаковага і своечасовага разгляду;
— рэгулярна, але не радзей за адзін раз у месяц, ажыццяўляе асабісты прыём;
— бярэ ўдзел у ажыццяўленні кантролю за выкананнем рашэнняў, прынятых па зваротах грамадзян і юрыдычных асоб;
— вывучае прычыны, якія выклікалі зварот грамадзян і юрыдычных асоб, і накіроўвае прапановы, у тым ліку аб іх ліквідацыі.

**Проведение вторых повторных торгов по продаже имущества ИЧПУП «Нордальфа-Бел»**

| № лота | Наименование лота | Начальная цена, руб. (без НДС) | Сумма задатка, руб. | Шаг торгов 5 %, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Кран подъемный прицепной коленчато-телескопический PAUS PTK 31 | 81 362,40 | 8136,24 | 4068,12 |
| 2 | Коленчатый прицепной подъемник PAUS GT 18A | 39 876,20 | 3987,62 | 1993,81 |
| 3 | Коленчатый прицепной подъемник PAUS GT 18A | 39 876,20 | 3987,62 | 1993,81 |
| 4 | Профилегибочный станок SCOTTS-DALE модель 6453 50 | 74 227,30 | 7422,73 | 3711,37 |
| 5 | Пневмоукладчик «Тайфун» | 6 812,40 | 681,24 | 340,62 |
| 6 | Агрегат для вымешивания краски | 3 028,90 | 302,89 | 151,45 |

Цена указана без НДС.

Местонахождение лотов: **Логойский р-н, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 38.**

Торги в электронной форме (далее – торги) будут проведены на электронной торговой площадке WWW.TORGI24.BY:

Начало – **8 февраля 2018 г., в 9.00**.

Окончание – **8 февраля 2018 г., в 17.00.**

**Письменная заявка на участие в торгах и копия документа, свидетельствующего об оплате задатка, подается по 05.02.2018 г. на адрес электронной почты организатора торгов: torgi24@tut.by**

Задаток на участие по каждому лоту составляет 10% от его начальной цены и должен быть перечислен по **05.02.2018 г.** на расчетный счет организатора торгов – ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Корженевского, 14, оф. 404, УНП 191514793, р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код (BIC) UNBSBY2X, назначение платежа: задаток по лоту (наименование лота и его номер) для участия в электронных торгах **08.02.2018 г.**

Организатор торгов: **ООО «Расантехторг»,** тел.+375 (29) 670-30-84.

Продавец: **ИЧПУП «Нордальфа-Бел»,** в лице управляющего ООО «Бизнес-Уэй», тел. +375 (29) 165-33-65.

Лицо, ответственное за хранение имущества: **ООО «Расантехторг»,** тел. +375 (29) 670-30-84.

Ознакомиться с лотами можно в будние дни с 09.00 до 17.00 по месту нахождения лота, предварительно согласовав время прибытия.

Правила и порядок проведения торгов, оформление участия в электронных торгах указаны на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве **www.bankrot.gov.by** и на сайте **WWW.TORGI24.BY**

# РАЗАМ МОЖНА БОЛЬШ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Аб'яднанне дэпутатаў адбылося, ёсць нейкі рух, вывучэнне, абмен і тыражаванне вопыту, — сведчыць **Аксана АГАРОДНІКАВА, старшыня Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў.**

Магілёўскія дэпутаты спецыяльна ездзілі да гродзенскіх калег, каб пераняць іх вопыт, падзяліцца сваімі напрацоўкамі. У склад кіравання магілёўскай арганізацыі ўваходзяць старшыні гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў.

— Пасля мерапрыемстваў, калі мы збіраемся разам, абавязкова праходзяць рабочыя нарады нашай асацыяцыі, — кажа Аксана Агароднікава. — Такая форма існавання надала нам самастойнасці, у нас з'явіліся свае сродкі. Яны невялікія, але ж мы атрымалі магчымасць заахвочваць, дапамагаць. Сёлета вось змаглі зрабіць прыемнае дзецям, якія маюць асаблівую патрэбу ва ўвазе. Кожны раён атрымаў сертыфікат для якой-небудзь адной установы. Сумы вагаліся ад 170 да 350 рублёў — прапарцыянальна тым узносам, якія былі ўнесены дэпутатамі.

На думку Аксаны Агароднікавай, ідэя са стварэннем асацыяцыі сябе апраўдала.

— Гэта пілотны праект, але яго важнасць даказваць не трэба, — салідарны з ёй **Сяргей ІВАНОЎ, старшыня Магілёўскага гарсавета дэпутатаў.** — Асацыяцыя стваралася для эфектыўнага ажыццяўлення дэпутатамі сваіх паўнамоцтваў, аказання дапамогі ў рашэнні пытанняў мясцовага значэння, як таго і патрабуе закон аб мясцовым кіраванні і самакіраванні. Фінансавы фонд можна папаўняць за кошт бязвыплатнай спонсарскай дапамогі, але ў нас ёсць пакуль фарміруецца дзякуючы ўзносам. Летась мы аказалі дапамогу магілёўскаму Дому дзіцяці, набылі развіццёвае абсталяванне для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. На пачатку 2017 года прыйшлі да высновы, што ўзнос 5 рублёў у год — вельмі сціплая сума, і агульным сходам вырашылі ўносіць па 1 базавай велічыні. У выніку атрымалі на канец мінулага года важкую суму, якую падзялілі прапарцыянальна зробленым узносам. Мы, напрыклад, на свае 330 рублёў набылі аргтэхніку для абласнога кадэцкага вучылішча.

Клічаўскія дэпутаты сваю дапамогу адрасавалі раённаму дзіцячаму сацыяльнаму прытулку.

— Мы прыйшлі да высновы, што гэта арганізацыя больш за ўсё мае патрэбу ў падтрымцы, — кажа **Уладзімір КНІГА, старшыня Клічаўскага раённага Савета дэпутатаў.** — Што датычыцца асацыяцыі, то яна нас яшчэ больш згуртавала. Але гэта толькі пачатак шляху.



Выхаванцы Краснапольскага Цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі атрымалі ў падарунак ад дэпутатаў вельмі карысны для іх трэнажор.

— Асацыяцыя — добрая рэч, — салідарны з ім **і Аляксандр ЕМЯЛЬЯНАЎ, старшыня Бабруйскага раённага Савета дэпутатаў.** — У нас з'явілася права юрыдычнай асобы, грошы, магчымасць аказаць дапамогу, падтрымаць актыўных.

## А самі адчулі?

Увогуле, асацыяцыя стваралася для таго, каб кансалідаваць намаганні, накіраваныя на эканамічнае развіццё рэгіёнаў, павышэнне іх самастойнасці, для фарміравання адказнасці і ініцыятыўнасці мясцовых органаў улады. Ці адчулі гэта самі дэпутаты?

— Калі разглядаць асацыяцыю ў рамках абагульнення нейкага вопыту, можна казаць, што яна падштурхнула нас да пошуку новых ідэй, — кажа старшыня Краснапольскага раённага Савета дэпутатаў Анжаліка Гоман. — Сёння дэпутаты Краснапольскага раёна шмат увагі ўдзяляюць праектнай дзейнасці. На гэтым тыдні не без нашага ўдзелу адкрылася школьная бізнес-кампанія «Хатняя эканоміка. Асновы прадпрымальніцтва» на базе Палужскага дзіцячага сада — сярэдняй школы, быў праведзены семінар. Крыху раней у рамках праекта «Мясцовая майстэрня экалагічных ініцыятыў для развіцця мікрарэгіёнаў» былі рэалізаваны ініцыятывы «Горская скарбніца» і «Палужскі край».

Пазалетась, дзякуючы сумесным намаганням краснапольскіх дэпутатаў з органамі выканаўчай улады, у раёне адкрылася некамерцыйная арганізацыя — мясцовы фонд развіцця «Старт-Усход». Яго прызначэнне — садзейнічаць устойліваму сацыяльна-эканамічнаму развіццю раёна і дапамагаць мясцовым супольнасцям у распрацоўцы і рэалізацыі эканамічных, экалагічных і сацыяльных ініцыятыў. А сёлета ў Краснаполлі асацыяцыя дэпутатаў разам з аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Краснапольскага райвыканкама прэзентавала два мясцовыя праекты — фестываль «Тэатральныя вечарыны» і «Развіццё ганчарнага майстэрства для пазнавальнасці тэрыторыі Краснапольскага раёна». Гэтыя ініцыятывы перамаглі ў конкурсе праектаў «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь» і былі рэалізаваны Праграмай развіцця ААН за сродкі Еўрапейскага саюза.

## Гатовы выйсці на новы ўзровень

Так лічаць дэпутаты Магілёўскай вобласці.

— Я ўзяў бы як прыклад для пераймання вопыт гродзенскіх калег, — кажа старшыня Магілёўскага гарсавета дэпутатаў Сяргей Іваноў. — Яны вельмі актыўна прыцягваюць спонсараў і ўдзельнічаюць у фінансаванні сур'ёзных праектаў. Напрыклад, пры ўдзеле дэпутатаў там створаны цікавы аб'ект накшталт міні-лініі Сталіна — добраўпарадкавана тэрыторыя, зроблены траншэі, доты, агнявыя кропкі, сабрана ваенная тэхніка. Усё гэта выглядае вельмі сур'ёзна. Зрабіць нешта адчувальнае можна толькі тады, калі справа цікавая ўсім, калі кожны адчуе ад яе нейкую карысць.

— Яшчэ калі стваралася наша асацыяцыя, размова ішла пра магчымасць стаць фінансава незалежнымі, пра найбольш эфектыўныя спосабы ўкладання гэтых грошай, — дадае старшыня Клічаўскага райсавета Уладзімір Кніга. — На жаль, у нас не атрымалася прыцягнуць спонсарскія сродкі, а для рэалізацыі сур'ёзных праектаў арганізацыя павінна быць забяспечаная. Нам не хапае рэкламы, мы павінны часцей расказваць пра свае магчымасці, пра тыя справы, што былі зроблены. Толькі так можна выйсці на новы ўзровень і стаць больш магутнымі.

— Мы зрабілі першы і вельмі адказны крок, — кажа старшыня абласной асацыяцыі Аксана Агароднікава. — Гэта дало нам магчымасць сёння падтрымліваць сацыяльна важныя мерапрыемствы, рабіць метадычныя распрацоўкі, перадаваць вопыт іншым раёнам. Буйных праектаў у нас пакуль няма, але ўсяму свой час. Пасля выбараў будзе аднаўлены склад асацыяцыі, магчыма, з'явяцца нейкія новыя метады работы і арганізацыя стане больш уплывовай.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# Населеныя пункты з ільготамі

## Вызначаны месцы, дзе дзейнічае спецыяльны рэжым падаткаабкладання на працягу пяці гадоў

**З першых дзён года можна скарыстацца падатковымі льготамі, прадугледжанымі Указам кіраўніка дзяржавы № 345 «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання», паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па горадзе Мінску.**

Такім чынам, з 1 студзеня 2018 года па 31 снежня 2022 года гэтым указам прадугледжана магчымасць устанаўлення на асобных тэрыторыях спецыяльнага рэжыму падаткаабкладання ў сферы гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання з выплатай падатку на прыбытак для прадпрыемстваў у памеры 6 % і адзінага падатку для індывідуальных прадпрымальнікаў у памеры адной базавай велічыні, а таксама іншых спрошчаных умоў ажыццяўлення гэтых відаў дзейнасці. Акрамя таго, прадугледжваецца вызваленне суб'ектаў гаспадарання ад падатку на дадатковую вартасць, падатку на нерухомасць, зямельнага падатку і арэнднай платы за зямельныя ўчасткі, што знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці.

У адпаведнасці з нормамі ўказа абласнымі Саветамі дэпутатаў прыняты рашэнні аб зацвярджэнні пералікаў населеных пунктаў і тэрыторый за населенымі пунктамі, якія адносяцца да тэрыторыі сельскай мясцовасці і малых гарадскіх паселішчаў. **Пералік населеных пунктаў, на якія распаўсюджваецца дзеянне ўказа, размешчаны на сайце Міністэрства антыманапольнага рэгулявання гандлю Беларусі: www.mart.gov.by ў раздзеле «Навіны».**

Між іншым спецыялісты гарадской інспекцыі паведамляюць, што дзеянне ўказа не распаўсюджваецца:

— на дробны гандаль аўтамабільным палівам (дызельным палівам, аўтамабільным бензінам, газам, які выкарыстоўваецца ў якасці аўтамабільнага паліва), механічнымі транспартнымі сродкамі, самаходнымі машынамі, прычэпамі (паўпрычэпамі), ювелірнымі і іншымі бытавымі вырабамі з каштоўных металаў і каштоўных камянёў;

— на аказанне бытавых паслуг па тэхнічнаму абслугоўванні і рамонце аўтатранспартных сродкаў.

З падатковымі льготамі, вызначанымі ўказам, больш падрабязна можна азнаёміцца на сайце Міністэрства па падатках і зборах: www.nalog.gov.by ў раздзеле «Растлумачэнні».

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


**«Ликвидатор УП «Брестская мебельная фабрика» – ООО «Центр правовых услуг» проводит третий повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества унитарного предприятия «Брестская мебельная фабрика», стоимость которого уменьшена на 50 %**

**Третий повторный аукцион**

| № лота | Наименование | Ед. изм. | Кол-во | Начальная стоимость предмета торгов без НДС, бел. руб. | Ставка НДС, % | Сумма НДС, бел. руб. | Цена предмета торгов с НДС, бел. руб. | Сумма шага аукциона в размере 5 %, бел. руб. | Размер задатка за участие в аукционе 10 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером **100/С-78153**, площадью 342,6 кв. м, наименование – установка мокрых фильтров, назначение – здание неустановленного назначения, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029346 площадью 0,1094 га по адресу: г. Брест, ул. Краснознаменная, 4Б. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель – земельные участки, находящиеся:<br>в водоохранной зоне водного объекта, код 4,1, площадь 0,1094 га;<br>в охранной зоне сетей и сооружений водоснабжения, код 13,4, площадь 0,0613 га;<br>в охранной зоне сетей и сооружений канализации, код 13,5, площадь 0,0418 га;<br>в охранной зоне сетей и сооружений теплоснабжения, код 13,6, площадь 0,0306 га | шт. | 1 | 21758,48 | 20 | 4351,70 | 26110,17 | 1305,51 | 2611,02 |
| 2 | Капитальное строение с инвентарным номером **100/С-78155**, площадью 331,9 кв. м, наименование – ангар, назначение – здание неустановленного назначения, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029348 площадью 0,1030 га по адресу: г. Брест, ул. Краснознаменная, 6Г.<br>Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель – земельные участки, находящиеся:<br>в водоохранной зоне водного объекта, код 4,1, площадь 0,1030 га;<br>в охранной зоне линий электропередачи, код 13,2, площадь 0,0114 га;<br>в охранной зоне сетей и сооружений водоснабжения, код 13,4, площадь 0,0302 га;<br>в охранной зоне сетей и сооружений теплоснабжения, код 13,6, площадь 0,0188 га | шт. | 1 | 21125,41 | 20 | 4225,08 | 25350,49 | 1267,52 | 2535,05 |
| | **Итого:** | | **2** | **42883,89** | | **8576,78** | **51460,66** | **2573,03** | **5146,07** |

**Третий повторный аукцион состоится 31 января 2018 года в 10.00 по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203**.
Предыдущие объявления о проведении аукционов опубликованы в газете «Звязда» № 197 за 12.10.2017, № 224 за 21.11.2017, № 235 за 06.12.2017

Заявления на участие в аукционе с приложением копий свидетельств о государственной регистрации, доверенностей выданных представителю (для юридических лиц и ИП) или копий паспортов (для физических лиц), заверенных банком документов, подтверждающих внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет УП «Брестская мебельная фабрика», принимаются с момента опубликования настоящего извещения по **30.01.2018 года** до 16.30 по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203.

Шаг аукциона равен пяти процентам от начальной цены имущества. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10 (десяти) дней с даты проведения торгов. Победитель аукциона обязан оплатить предмет торгов в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее пятнадцати банковских дней с момента заключения договора. Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением торгов в части оплаты объявления о проведении торгов и оценки предмета торгов в течение 5 дней с даты проведения торгов.

Размер задатка для участия в аукционе составляет 10 % от начальной цены имущества и перечисляется на расчетный счет УП «Брестская мебельная фабрика» BY72BLBB30120200274176001003 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Брестской области г. Брест, ул. Советская, 50 МФО BLBBBY2X, УНН 200274176 в срок до **30.01.2018 года**.

Победителем аукциона признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за лот.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Результаты по проведению торгов оформляются протоколами.

Сведения об организаторе торгов: ООО «Центр правовых услуг», адрес: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203, контактный телефон 8 0162 33-93-88.

Сведения о продавце: Унитарное производственное предприятие «Брестская мебельная фабрика», юридический адрес: *г. Брест, ул. Краснознаменная, 2,* контактный телефон 8 0162 33-93-88.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения при продаже имущества должника на аукционе – в любое время, но не позднее чем за три дней до наступления даты его проведения.

Иную информацию о порядке и условиях проведения торгов, ознакомлении с предметом торгов можно получить в рабочие дни с 9.00 до 16.30 по адресу: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203, тел./факс 8 0162 33-93-88».

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

## Прызванне — дапамагаць

***На пачатку студзеня адзначылі свае прафесійнае свята сацыяльныя работнікі***

Карэспандэнт **газеты «Добрушскі край»** праехалася разам з сацыяльным работнікам Алесяй Самусік па адрасах, дзе яе чакаюць падапечныя. Пенсіянерка Тамара Музыкіна амаль 40 гадоў працавала выхавальнікам-медсястрой у дзіцячым садзе. Зараз ёй ужо 81 год. Два апошнія яна карыстаецца дапамогай сацработніка. «Алеся і прыбярэ, і прадукты, лекі прынясе, пагаворыць і выслухае», — расказвае пенсіянерка.

Сама ж Алеся калісьці працавала прадаўцом, але пасля дэкрэтнага адпачынку вырашыла змяніць абстаноўку і на сёння мае амаль дзесяцігадовы стаж сацработніка. У тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Добрушскага раёна такіх спецыялістаў 49. У 48 з іх — свой участак. А калі патрабуецца выканаць цяжкую фізічную працу, на дапамогу прыходзіць работнік аддзялення тэрміновага сацыяльнага абслугоўвання. Ён і дроў наколе, і плот паправіць. На надомным абслугоўванні ў раёне знаходзіцца больш за 400 чалавек. І для некаторых прадстаўнікі сацслужбы, мабыць, — адзіная сувязь са знешнім светам.

## Калядная прыгажосць

***Падвялі вынікі конкурсу рукадзелля***

Да 14 студзеня ў Рэспубліканскім цэнтры экалогіі і краязнаўства ў сталіцы праходзіць выстава «Лёд. Кветкі. Фантазія». Туды трапілі фларыстычныя работы з усіх куткоў Беларусі. На вочным этапе адначаснага... найменнага конкурсу два дыпломы заваявалі выкладчыкі і выхаванцы Эколага-біялагічнага цэнтра дзяцей і моладзі Мастоўскага раёна, паведамляе **газета «Зара над Нёманам»**. Яшчэ адну ўзнагароду мастаўчане ўзялі па выніках завочнай намінацыі.

У журы ўвайшлі такія знакамітыя фларысты, як чэмпіёнка Беларусі Лора Белабровік і майстар міжнароднага класа Мікалай Даніловіч. Лепшых фларыстаў абіралі ў намінацыях «Падаў белы снег» і «На мяжы зімы». Першая для вучняў, другая — для педагогаў.

Анастасія Стэмплеўская, вучаніца 9-га класа Правамастоўскай сярэдняй школы і выхаванка студыі «Флора-арт», не толькі атрымала дыплом першай ступені, але і была запрошана на нацыянальны адборачны этап міжнароднага конкурсу WordSkills. Яе выкладчыца Наталля Бортнік на конкурс выставіла інтэр'ерную кампазіцыю: калядны вянок з выкарыстаннем гаршковых раслін, дэкаратыўных элементаў ручной работы з прыродных матэрыялаў. Каркас выраблены з лямцу і вязаных элементаў. Яе работа атрымала дыплом другой ступені.

## Без пажараў

***Ратавальнікі папярэджваюць аб небяспецы***

У Уздзенскім раёне правялі прафілактычную работу па папярэджванні пажараў і гібелі людзей. Падчас абходу работнікі службы ратавання асаблівую ўвагу ўдзялілі домаўладанням, дзе паляць печы, выхоўваюць малых дзяцей, дзе жывуць людзі сталага ўзросту. **Газета «Чырвоная Зорка»** Уздзенскага раёна расказала, на што трэба звярнуць увагу, каб не здарылася бяды.

«Навучыць кожнага земляка правілам пажарнай бяспекі ў побыце — наша галоўная задача. Але ёсць і задачы спадарожныя: матываваць кожнага шанаваць сваё жыццё і жыццё блізкіх, падтрымліваць пажаравабяспечны стан кватэры або дома пастаянна, а не, устараніўшы выяўленыя намі магчымыя прычыны пажараў, чакаць наступнага візіту ратавальнікаў. Да таго ж мы рэгулярна абнаўляем тэмы прафілактычных гутарак дома — у залежнасці ад сезона», — тлумачыць **начальнік інспекцыі нагляду і прафілактыкі Уздзенскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Сяргей КАРАВАЦКІ.**

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

ЧЫСТАЕ ЖЫЦЦЁ

# ЗАВАРВАЦЬ! НЕЛЬГА ПАКІНУЦЬ

**Чаму смеццеправод са зручнага абсталявання ператварыўся ў шкодны атрыбут?**



**Штогод адходы становяцца ўсё больш «мудрагелістыя» і небяспечныя па сваім складзе. Калі яшчэ паўстагоддзя таму дастаткова было вывезці іх на палігон, то цяпер жыццёва неабходна перапрацоўваць, каб зменшыць рызыку іх шкоды для асяроддзя. Раздзельны збор смецця ў большасці краін свету стаў стратэгічнай задачай, а вось смеццеправоды ў дамах — пэўным абмежаваннем на гэтым шляху.**

### НЕ ТРАПЛЯЛА НА ВОЧЫ — СТАЛА ЛЕЗЦІ Ў НОС

Першыя адзінкавыя смеццеправоды з'явіліся ў СССР яшчэ ў 30-я гады мінулага стагоддзя, а масава ўкараніліся ў жылёвы фонд у 60-я, падчас будаўніцтва шматпавярховікаў тыпавых серый. Смеццеправод тады стаў адным з асноўных атрыбутаў інжынернага абсталявання дома.

Першапачаткова гэтае санітарнае збудаванне мела шмат плюсоў. Гэта было зручна і для жыхароў шматкватэрных дамоў, якія выкідвалі смецце, што называецца, за тры крокі ад кватэры, і для архітэктараў і планіроўшчыкаў, якім не трэба з'яўлялася праектаваць спецыяльныя пляцоўкі для збору смецця. Смецце — праблема, якая суправаджае чалавека ўсё жыццё, — была «схавана» ўнутры жылога дома і не трапляла на вочы чалавеку.

— Напачатку свайго з'яўлення смеццеправоды сталі цывільным прагрэсіўным рашэннем для абыходжання з адходамі. Галоўнай задачай на той момант было сабраць усё смецце і бяспечна для чалавека вывезці яго з жылля, — расказала **Наталля ГРЫНЦЭВІЧ, дырэктар ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».** — Тады практычна ўсе напоі разліваліся ў шкляную тару, якая была шматабаротнай і ў смецце трапляла ў невялікай колькасці. Людзі збіралі адходы ад гатавання ежы ў асобныя ёмістасці — бачкі памерам літраў на 30 — і ачысткі не забруджвалі смеццеправод. Гэтыя бачкі стаялі спачатку па пляцоўках у пад'ездах паміж паверхамі, пасля іх вынеслі на вуліцу. Ну і, зразумела, самога смецця было значна менш, не існавала столькі пластыкавай упакоўкі, не карысталіся ПЭТ-бутэлькамі.

З канца 80-х сітуацыя са смеццеправодамі пачала мяняцца. Асабліва рэзка гэта стала заўважна на працягу апошніх 15 гадоў. На смеццеправоды лягла большая нагрузка, чым яны маглі вытрымаць. Сюды стала трапляць арганіка, што адразу прывяло да бруду і непрыемнага паху, якія палезлі ў вочы і нос. У некаторых дамах праз гэта з'явіліся прусакі ды пацукі. Гукі, калі бутэлькі ляцелі праз дзевяць паверхаў уніз, таксама не дадавалі камфорту. А чысціць смеццеправоды часцей, з улікам павялічанага аб'ёму смецця і яго складу, не было магчымасці ды і не надта дапамагала. Ствол смеццеправода ўнутры часта забіваўся вялікімі пакетамі са смеццем... Усё гэта значна ўскладняла жыццё ў дамах, дзе знаходзіліся смеццеправоды.

### СПАКОЙНА, ГРАМАДЗЯНЕ!

Шэраг назапашаных праблем трэба было вырашаць. Гадоў пяць—шэсць таму на дзяржаўным узроўні было вырашана максімальна закрыць смеццеправоды, што знаходзяцца ў жылёвым фондзе. Летась гэта пачынанне планавалася цалкам завяршыць. Аднак на практыцы прыйшлося сутыкнуцца з некаторымі пытаннямі. Ці то не хапала такой колькасці кантэйнераў для смецця, ці то немагчыма было знайсці месцы пад пляцоўкі, ці то самі жыхары абураліся, што робіцца замах на іх зручныя ўмовы жыцця.

— Адразу пазбавіцца ад усіх смеццеправодаў немагчыма. Перш за ўсё, праз стэрэатыпы паводзін чалавека. Яму яшчэ трэба прывыкнуць да думкі, што лепш не са смеццевым вядром у пад'езд выходзіць, а з пакетамі — на вуліцу. Яшчэ адзін момант — забудова жылых кварталаў, якія раней праектаваліся без разліку на стварэнне пляцовак для збору смецця каля дамоў. Трэба яшчэ пастарацца адшукаць месца для такой пляцоўкі, якое адпавядала б санітарным нормам, — адзначыла дырэктар. — Падыход да тэмы смеццеправодаў спакойны. Ніхто не разглядае гэтую ідэю як нейкую кампанію. Галоўная мэта — пераканаць людзей змяніць стэрэатыпную схему паводзін і заахвоціць карыстацца пляцоўкамі каля дома, а не смеццеправодамі.

> Плануючы чарговую кансервацыю, эксплуатуючыя арганізацыі перш за ўсё абследуюць тэрыторыю на магчымасць стварэння пляцовак для кантэйнераў па-за межамі дома. Калі зрабіць гэта можна — арганізуюць сход і тлумачаць жыхарам, што мяркуецца зрабіць.

Большая частка жылля цяпер прыватызаваная, у тым ліку і смеццеправоды, якія з'яўляюцца агульнай маёмасцю жыхароў. Каб заварыць гэтае абсталяванне, патрэбна згода паловы ўласнікаў. Калі жыхары не аб'ядналы ў таварыства ўласнікаў, то рашэнне прымае ўпаўнаважаная юрыдычная асоба, якая курыруе домам. Смеццеправоды, якія праходзяць не праз пад'езд, а праз кухні ці санвузлы кватэр, таксама з'яўляюцца агульнай маёмасцю ўласнікаў, а не прыватнай уласнасцю, бо яны знаходзяцца па-за межамі кватэрных сцен. І падыход да закрыцця гэтага санітарнага абсталявання такі ж, як і да звычайных смеццеправодаў.

Усе пляцоўкі для кантэйнераў, дарэчы, робяцца за кошт арганізацыі, што адказвае за абыходжанне з адходамі.

— Арганізаваць пляцоўкі для кантэйнераў са смеццем можна не ўсюды. Забудова ў горадзе часта настолькі шчыльная, што, часам, немагчыма знайсці месца, якое адпавядала б і санітарным нормам для размяшчэння кантэйнераў для змешаных адходаў, і да таго ж было зручным для людзей і смеццявозаў, — падкрэсліў **Анатоль ШАГУН, начальнік упраўлення па каардынацыі дзейнасці ў сферы абыходжання з другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».** — Летась пачаўся эксперымент па ўкараненні падземных кантэйнераў у Магілёве і Пінску. Адзінкавыя пілотныя праекты зроблены ў Брэсце і Мінску. Такія прылады працей усталяваць, бо санітарныя патрабаванні не такія жорсткія. Да таго ж падземны кантэйнер памерам пяць метраў кубічных займае месца ўглыбіню, што больш зручна, чым пяць звычайных кантэйнераў на пляцоўцы. Калі пабачым станоўчы вынік, то будзем і такі варыянт укараняць.

### СТАРЫЯ — КАНСЕРВУЮЦЬ, НОВЫЯ — БУДУЮЦЬ

Калі людзі адмаўляюцца ад заварвання смеццеправодаў у дамах, гэта падстава для далейшых размоў і тлумачэнняў. У дапамогу спецыялістам дзейнічае таксама палітыка тарыфнага рэгулявання жыллёва-камунальных паслуг з дыферэнцыяцыяй кошту іх у залежнасці ад якасці і колькасці.

Летась у сталіцы анансавалі, што за абыходжанне са смеццем у дамах са смеццеправодамі і без іх будуць браць розную плату.

> Каб не проста закансерваваць смеццеправод, заварыўшы доступ да ўнутранасці трубы, а цалкам дэманціраваць гэтае абсталяванне, спатрэбяцца дадатковыя грошы. Таму здзяйсняемы варыянт — заварваць — цяпер найбольш аптымальны для эксплуатуючых арганізацый.

— Хоць, напэўна, лепш усё-такі ад іх канчаткова пазбавіцца, бо час ідзе, а смеццеправод сам па сабе старэе. Да таго ж, так ці інакш маюцца праблемы з яго абслугоўваннем, — мяркуе Анатоль Шагун. — Чысцячы смеццеправод, мы не вырашаем праблему непрыемнага паху і бруду, бо кожны дзень абсталяванне не памыеш. Хутчэй за ўсё такія работы па дэмантажы калі і будуць праводзіцца, то толькі падчас капрамонту.

Пакуль у краіне пазбаўляюцца ад старых смеццеправодаў, новыя дамы, якія будуюцца, працягваюць імі аснашчацца. Асабліва калі такое рашэнне прымаецца на сходзе ўласнікаў, якія не гатовы абысціся без гэтага атрыбуту жыцця.

Дзе-нідзе ў новабудоўлях самі ўласнікі кансервуюць смеццеправоды на некалькі гадоў, каб туды не выкідвалі будаўнічае смецце і не псавалі абсталяванне. А ўжо пасля таго, як навасёлы «нарамантуюцца», пачынаюць карыстацца гэтым санітарным прыстасаваннем.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 18 студзеня 2018 года.**